# Жыццё і смерць апошняга польскага караля



kamunikat.org

KAMUNKAT.org

# ЖЫЦЦЁ І СМЕРЦЬ АПОШНЯГА ПОЛЬСКАГА КАРАЛЯ.

Час спыніць нельга,
але памяць захаваць можна.

## 1. ПРАЛОГ

Ужо некалькі гадоў таму былі гатовы старонкі рукапісу аб Воўчыне, Станіславе Панятоўскім, воўчынскіх збудаваннях, аднак усе не рашаўся на публікацыю іх. Нібыта чагосьці чакаў, і дачакаўся. Атрымаў новыя матэрыялы, а ў іх - новыя факты, і не толькі яны, а і цэлы “букет” круглых (і не толькі) дат, звязаных з імем апошняга польскага караля. Велізарнае жаданне адсеяць выдумку і данесці да чытача праўду падштурхнулі мяне ізноў узяцца за пяро.

Магчыма, у некага ўзнікне пытанне: чаму рашыў напісаць пра апошняга польскага караля, а не, скажам, пра Івана Грознага ці Пятра І. Адказ просты: яны не мелі дачынення да нашай зямлі, а Станіслаў Антоні Панятоўскі (гербу “Цёлэк”) - меў, бо нарадзіўся на Камянеччыне. І зноў жа дапытлівыя чытачы гатовы “злавіць” мяне на памылцы: “Не Антоній, а Аўгуст!”. Але прашу набрацца цярпення – тлумачэнне будзе крыху пазней. Пакуль што аперырую першым імем.

Сучаснікі Станіслава Панятоўскага (ды і тыя, хто піша аб ім сёння) даюць яму палярныя ацэнкі. З аднаго боку ён – чалавек, які не меў цвёрдай каралеўскай рукі і каралеўскіх якасцяў, быў слабавольным пестуном, непаслядоўным і нерашучым, і таму стаў марыянеткай у руках разбэшчанай расійскай імператрыцы Кацярыны 2 (гэта цяжка абвергнуць).

З другога боку ен – рэфарматар, мецэнат. Прыхільнікі перыяду яго праўлення (31 год) назвалі той час парою ўваскрашэння навук.

Гісторыя сведчыць, што за недальнабачныя дзеянні многія асобы з ліку ўладароў расплачваліся галавою. Станіслаў Панятоўскі расплаціўся сваей краінай, сваей Айчынай, аддаў і дазволіў разарваць яе на часткі двум набіраючым сілу імперскім драпежнікам – Расіі і Прусіі. Частка дасталася Аўстрыі. І ўсе гэта крывадушна было названа раздзелам. Цікавы і той факт, што ўжо тады між расійскай імператрыцай Кацярынай ІІ і прускім каралем Фрыдрыхам ІІ быў заключаны дагавор з даданым да яго тайным пратаколам аб рашэнні сваіх інтарэсаў у Польшчы ваеннай сілай (тое ж паўтарылася шмат гадоў пазней з пактам Рыбентроп – Молатаў). Але не Кацярынаю ІІ здзейснены раздзел Польшчы. Яшчэ Петр І праводзіў падрыхтоўку да раздзела Польшчы і захопу Украіны.

Большасць палякаў вінавацілі свайго апошняга караля ў страце дзяржаўнасці, і на многія гады на яго імя была накладзена “каінава пячаць” здрадніка, “забойцы” суверэнітэту краіны.

Хто ведае, магчыма, калі б ен не адрокся ў Гродне ад прастола, ад свайго каралеўскага тытулу, то набыў бы ў вачах сваіх суайчыннікаў цярновы вянок караля - пакутніка. А гэта ўжо зусім іншая справа. Мучанікаў усюды і ва ўсе часы паважалі. Але шляхі Гасподнія невядомыя!

Аб Станіславе Панятоўскім “сыне, каралю” пісалі добра і кепска, дапускалі неабгрунтаваныя памылкі, выказвалі гістарычныя недарэчнасці. На гэтую тэму

напісана шмат: толькі бібліяграфія аб ім за апошнія гады налічвае два дзесяткі пазіцый. У больш ранніх выданнях тон аб ім востры, асуджаючы, цяпер - больш мяккі.

Не абышоў Станіслава Панятоўскага ўвагай і перыядычны друк, у тым ліку беларускі, (пасля 1988 года), з пэўнай афарбоўкай і настальгіяй.

Аднак вернемся да храналагічнай паслядоўнасці падзей. Вось яны: 266 гадоў з дня нараджэння апошняга польскага караля (17 студзення 1732 г.), 200 гадоў з дня смерці (12 лютага 1798 года), 60 гадоў з дня пакладання труны караля ў Воўчынскі касцёл (14-15 ліпеня 1938 г.), 100 гадоў з дня апублікавання ў часопісе "Вандровец" малюнка ўязной брамы даўняга Воўчынскага палаца, у якой, мабыць, відаць постаць таго самага яўрэя Брамса, які выкупіў цудоўны воўчынскі парк і да пня высек рэдкія дрэвы і прадаў іх (1898 г.), 90 гадоў з дня публікавання здымка будынка, дзе нарадзіўся Станіслаў Панятоўскі (1908г.).

Паколькі рашэннем Каардынацыйнага Савета па гістарычнай спадчыне пры Камянецкім райвыканкаме ў 1996 годзе яго імя павінна было быць унесена ў галерэю вядомых людзей Камянеччыны (на жаль, такая галэрэя да гэтай пары так і не створана), узнікае неабходнасць больш падрабязна пазнаёміць грамадскасць раёна не толькі са Станіславам Панятоўскім. І калі такая галерэя з'явіцца, то нельга абмінуць увагай велічную постаць Валынскага князя Уладзіміра – Іаана Васількавіча, заснавальніка Камянца, аднаго з найбольш адукаваных людзей свайго часу, які меў багатую бібліятэку, перапісваў кнігі, ілюстрыраваў іх, разам з жонкай Вольгай Раманаўнай перапісаў "Кормчу", распісваў фрэскамі храмы, будаваў манастыры, цэрквы, гарады (у тым ліку і Камянец), неразбураемы стоўп, царкву Благавешчання Прасвятой Багародзіцы і атрымаў прозвішча (мянушкі) "Філосаф", "Благаверны", "Набожны". Не пабудуй ен Камянец – не гаварылі б сёння і пра Камянеччыну.

Добрую справу зрабіла рэдакцыя газеты "Навіны Камянеччыны", апублікаваўшы часткамі некалькі раздзелаў з рукапісу кнігі.

## 2. ВОЎЧЫН – РАДЗІМА КАРАЛЯ

Вескі, мястэчкі, гарады, як і людзі, нараджаюцца, дасягаюць росквіту, сталасці, паміраюць. Людзі паміраюць беспаваротна, вескі, мястэчкі, гарады могуць адраджацца.

У Вялікім княстве Літоўскім, у Польшчы і Расіі прамежкавыя між вескай і горадам населеныя пункты называліся мястэчкамі. У савецкі час гэтае паняцце знікла. А, між тым, у нашым раене было пяць мястэчак: Воўчын, Вярховічы, Расна, Высока-Літоўск, Камянец-Літоўск. Два апошнія, дэградавалі ад гарадоў да мястэчак, а затым ізноў падняліся да гарадоў. Тры першыя ў сваю чаргу апусціліся да ўзроўню весак.

Усе здаралася і здараецца ў гісторыі: вескі растуць і становяцца гарадамі, а гарады змяншаюцца і становяцца звычайнымі вескамі. Асабліва трагічны лес весак. На фоне дэмаграфічнага працэсу знікаюць цэлыя вескі Напрыклад, на Камянеччыне за апошнія 100 гадоў перастала існаваць 175 весак. Людзі старэюць, паміраюць, а з імі іх родныя паселішчы. Калі нараджальнасць роўная нулю, змена пакаленняў не адбываецца.

На заходнім ускрайку Камянеччыны, там, дзе зараз цячэ страшэнна абмялеўшая, а некалі паўнаводная і судаходная рака Пульва, за 30 км на паўночны захад ад Брэста раскінулася веска (раней мястэчка) Воўчын. Яго геаграфічныя каардынаты знаходзяцца на $52^0\ 17'$ паўночнай шырыні і $41^0\ 27'$ усходняй даўжыні. Размешчана яна сярод пладародных палеў, густатраўных лугоў, зяленых лясоў, непадалек ад магутнай воднай артэрыі – Заходняга Буга, што мела выхад да Балтыйскага мора праз Віслу.

Месца гэта, выбранае ў даўнія часы нібыта Божай воляй, зацішнае і спакойнае, займала цэнтральны пункт паміж Польшчай і Вялікім княствам Літоўскім. На працягу стагоддзяў яно з’яўлялася месцам прыцягнення і пражывання многіх выдатных людзей абодвух народаў. Воўчын быў значным культурным цэнтрам, і, між іншым, месцам нараджэння апошняга польскага караля.

Міналі гады і стагоддзі, а разам з імі – росквіт і слава Воўчына. Цяпер гэта звычайная веска на беларуска-польскай мяжы.

Самыя апошнія сведчанні А.Т. Федарука гавораць аб тым, што першыя пісьмовыя ўспаміны пра Воўчын адносяцца не да XVI, а да XV ст. Першым уладальнікам яго быў Іван Аляксандравіч Солтан, падскарбій каралеўскі, маршалак ВКЛ, намеснік Слонімскі, Навагрудскі, Бельскі. Па наказу караля і Вялікага князя Літоўскага Казіміра ён у 1468 годзе зрабіў падарожжа ў Італію, у 1469 годзе – у Англію, здзейсніў паломніцтва ў Іерусалім. Памер у 1494 г. У 1516 г. Воўчын атрымаў у спадчыну сын – Солтан Аляксандр Іванавіч. У 1554 г. Воўчын перайшоў яго сыну Івану Аляксандравічу, які ў тым жа годзе ў сваім фальварку Пужыцы збудаваў праваслаўную царкву Спаса-Прэабражэнскую. Ад яго Воўчын перайшоў да сына Яраслава, старасты Астрынскага, які быў вядомы сваей набожнасцю. У 1586 годзе Яраслаў Солтан разам са сваей жонкай Марыяй пабудаваў драўляную праваслаўную царкву св. Мікалая і Георгія і запісаў ей немалы грашовы фонд.

Новым уладальнікам Воўчына стаў паплечнік Льва Сапегі на пачатку XVIIст., ваявода смаленскі, воін і дыпламат Аляксандр Гасеўскі, католік. На яго рахунку нямала дабрачынных спраў: ен пабудаваў іезуіцкія калегіі ў Смаленску, Віцебску, Данабургу, жаночы манастыр брыгідак у Брэсце, незадоўга да сваей смерці ўзвеў у Воўчыне драўляны касцел, які асвяціў у 1639 годзе віленскі епіскап Аўраам Война. У тым жа годзе ен перадаў воўчынскія маенткі сынам: старэйшаму, Кшыштафу, дыпламату, каралеўскаму паслу ў Францыі – Стары Воўчын і фальварк Грамяча; малодшаму сыну Вінцэнту - Аляксандру, жанатаму з Магдалінаю (з Канапацкіх), генералу артылерыі, будучаму падскарбію ВКЛ, польнаму гетману – Новы Воўчын і фальварк Сегеняўшчызна. Аднак праз чатыры гады бяздзетны Кшыштаф памер. Стары Воўчын і Грамяча перайшлі да Вінцэнта-Аляксандра. Яго бурная ваенная і палітычная дзейнасць закончылася гібеллю ад рук загаворшчыкаў. Усе воўчынскія ўладанні Вінцэнта Аляксандра Гасеўскага перайшлі ў спадчыну яго старэйшай дачцэ Тэрэзе. Яна, жанчына велізарнай жыццевай энергіі, двойчы выходзіла замуж – спачатку за віленскага кашталяна, польнага гетмана Юзэфа Балтазара Слушку, а пасля яго смерці (1702 г.) стала пад вянец з ваяводам віленскім, гетманам ВКЛ Казімірам Янам Сапегам. У абодвух

выпадках сваім мужам, у якасці прыданага, аддала воўчынскія маенткі. Другі шлюб быў нядоўгім - у 1708 г. яна памерла. Перад смерцю склала завяшчанне, якім справядліва раздзяліла сваё багацце паміж сваякамі першага і другога мужоў, падначаленымі і слугамі, а таксама завяшчала касцелу св. Казіміра ў Вільні 50 тысяч злотых і 80 тысяч на будаўніцтва шпіталя. Сямейныя скарбніцы-палац у Варшаве і бацькоўскую залатую булаву польнага гетмана, а таксама Воўчын – запісала Казіміру Яну Сапегу. Будучы найбагацейшым чалавекам у Літве, ен не надаваў Воўчыну якога- кольвек значэння.

Тым не менш, зрабіўшы ацэнку воўчынскіх уладанняў (кошт іх пацягнуў на 352 тысячы польскіх злотых, што па тым часе было велізарнай сумай), Казімір Ян Сапега выдзеліў 30 тысяч на будаўніцтва палаца (гэта яшчэ не той палац, які будзем пазней захапляцца). На аднаўленне разбураных падчас шведскіх войнаў пабудоў, а таксама на дапамогу сялянам навакольных вёсак. У 1710 годзе ён прадаў Воўчын канюшаму літоўскаму, фельдмаршалу саксонскаму, міністру караля польскага Аўгуста II Якубу Хенрыку Флемінгу, жанатаму з Ізабэлаю Сапяжанкаю. Аднак і чарговы гаспадар у Воўчыне доўга не затрымаўся, ды і не пакінуў пасля сябе нічога адметнага (у адрозненне ад Яна Ежэго Флемінга з Тэрэспаля), аб чым будзе расказана пазней. Якуб Хенрык Флемінг у 1720 годзе прадаў Воўчын Казіміру Чартарыскаму, хоць з другіх крыніц вынікае, што гэта адбылося ў сярэдзіне 20-х гадоў XVIII ст.

Закончылася два стагоддзі панавання Солтанаў, Гасеўскіх, Слушак, Сапегаў, Флемінгаў. Сляды іх дзейнасці на гэтай зямлі, нават сабраныя разам, нязначныя. Аднак з гэтага часу пачынаецца цудоўнае стагоддзе росквіту Воўчына, як культурнага, так і палітычнага цэнтра часоў Чартарыскіх і Панятоўскіх, моцна звязаных сваяцкімі адносінамі. У тым жа годзе, калі Казімір Чартарыскі выкупіў Воўчын, яго дачка Канстанцыя абвянчалася са Станіславам Панятоўскім, 44-гадовым генералам. Яна была другой жонкай. Першая жонка Станіслава -Тэрэза Война - Ясенецкая. Мабыць, з гэтага роду паходзіў знакаміты хірург, які быў архіепіскапам, Лука Война-Ясенецкі.

Казімір Чартарыскі выйшаў са старадаўняга княжацкага рускага роду. Прыхільнікі альтэрнатыўных поглядаў бачаць роданачальнікам іх роду Гедыміна. Хутчэй за ўсе, гэта толькі жадаемае меркаванне.

Абапіраючыся на пісьмовыя крыніцы, заснавальнікам роду варта прызнаць рускага (пазней назавем – украінскага ) князя Васілія з Чартарыйскіх, што на Валыні. Часовы параметр – сярэдзіна XIV ст. Ад назвы паселішча, дзе была яго рэзідэнцыя, прозвішча-Чартарыйскія. Як сведчыць паданне, назва паселішча ўзнікла так: непадалеку цякла рэчка, правы бераг якой часта падмывала вадой. А людзі казалі: «Чорт рые». Адсюль – Чартарыйск. Пасля Х1У ст. прозвішча князеў змянілася на Чартарыскіх. Ад самага пачатку род быў праваслаўным і рускім. Пазней яго нашчадкі перайшлі на каталіцтва і паланізаваліся. Род Чартарыскіх меў чатыры галіны – лагойскую, чартарыйскую, кляванскую і карэцкую. Сын Васілія Аляксандр атрымаў у сярэдзіне XV ст. каралеўскі прывілей на валоданне Камянцом. А ўжо сын Аляксандра Сямен у 1505 г. стаў Камянецкім намеснікам. У 1509 г. ен жа атрымаў прывілей і на Белавежу. Намесніцтва Сямена доўжылася да 1518 г.

Мяркуецца, што на пачатку XVII ст. Чартарыскія, з пакуль што нязведанай галіны, сталі ўладальнікамі маентка ў Рэчыцы (пазней Пацееўскай) каля Камянца-Літоўскага, пабудавалі там замак.

Але вернемся да Воўчына. Тут асела кляванская галіна роду.

Князь Казімір Чартарыскі, віленскі кашталян, віцэ-канцлер Вялікага княства Літоўскага, што ажаніўся з дачкою падскарбія кароннага, паэта Морштына-Ізабэлаю, якая выхоўвалася ў Францыі, разам з жонкаю імкнуўся надаць Воўчыну вялікасвецкі бляск. Ен прымаў у сябе прыхільнікаў Ляшчынскага і Аўгуста II, з якімі веў перамовы аб унутраным стане Польшчы. Казімір так умела і спрытна лавіраваў між імі, што выклікаў здзіўленне і захапленне ў сваіх праціўнікаў. Ен заўжды прымаў пазіцыю больш моцнага. Пры ім палітычнае і свецкае жыцце на воўчынскім двары літаральна кіпела: тут праходзілі палітычныя нарады, цудоўныя прыемы, што маглі доўжыцца не адзін тыдзень. Усе, што адбывалася ў воўчынскіх салонах, у рэшце рэшт было накіравана на стварэнне слаўнай партыі Чартарыскіх-Панятоўскіх, якая насіла назву «Фамілія». Казімір не забываў разбудоўваць і ўпрыгожваць сваю рэзідэнцыю. Напэўна, у гэты час была пабудавана і бібліятэка-архіў, дзе і нарадзіўся апошні польскі кароль.

## 3. ПАНЯТОЎСКІ - БАЦЬКА І НАРАДЖЭННЕ МАЛОДШАГА СЫНА

На воўчынскім небасхіле з'явіўся новы ўладар – прадстаўнік вядомага польскага роду герба “Целэк”, кашталян кракаўскі, ваявода мазавецкі, падскарбій Вялікага княства Літоўскага Станіслаў Панятоўскі. За плячыма гэтага чалавека – удзел у шматлікіх бітвах з Расіяй і Даніяй поруч са шведскім каралём. Вылучаючыся адчайнай храбрасцю, ён двойчы выратаваў жыццё Карлу XII. Праявіў сябе адмысловым палітыкам еўрапеўскага кшталту. Яго поспехі ў воінскай справе і палітыцы былі такімі, што знайшлі адлюстраванне ў творах самога Вальтэра. Сапраўднае прозвішча – Франсуа Ароўэ.

Калі Панятоўскі ажаніўся з адзінаю дачкою папярэдняга ўладальніка Воўчына Казіміра Чартарыскага – Канстанцыяй, атрамаў за ею ў пасаг мястэчка. Пакінуўшы ваенныя і палітычныя справы, надзейна асеў у правінцыйнай цішы, аддаўшыся радасцям бацькі шматлікага сямейства, у якім было чатыры хлопчыкі і дзве дзяўчынкі. Быў ен моцным гаспадаром. Калі пасяліўся ў Воўчыне, адразу ж абмераў 18 фальваркаў. Да іх прыкупіў яшчэ некалькі ад збяднелых суседзяў – князёў Шуйскіх (не надта вядомых нашчадкаў маскоўскага цара Васілія Шуйскага), якія ў той час былі праваслаўнымі. Таму Станіслаў Панятоўскі зрабіў прыгожы жэст у бок Шуйскіх: пабудаваў у Шчытніках (былым фальварку Шуйскіх) драўляную царкву, да якой была прыпісана царква ў Ракавіцы. У скляпеннях гэтай царквы і ў Церабуні знайшлі вечны спачын астанкі князёў Шуйскіх.

Як паведаміў жабінкаўскі краявед Анатоль Бензярук у часопісе «Беларуская мінуўшчына», у вёсцы Чыжэўшчына (былыя Крупчыцы) ім знойдзена магіла з надпісам на польскай мове: «Віталіс Шуйскі. Памёр 1 чэрвеня 1849 г., гадоў 56». Мабыць, гэта ўжо наступная галінка ад шчытнікаўскіх і церабуньскіх князёў Шуйскіх, але паланізаваных.

Пратапластай рода Панятоўскіх быў Марцін Мацієўскі (герба «Целэк»). Ен у другой палове ХУ ст. жаніўся на дачцэ Шымка Катажыне з Панятовы пад Люблінам, дзе і пасяліўся. Адсюль прозвішча— Панятоўскі. Панятоўскія звярнулі на сябе ўвагу, калі Францішак, дзед караля, служыў эканомам у Гераніма Аўгуста Любамірскага. Сваім сынам Юзэфу і Станіславу (бацьку караля) даў мажлівасць атрымаць добрую адукацыю за граніцай.

Развіваючы гаспадарчую дзейнасць, Станіслаў Панятоўскі пабудаваў сем вадзяных млыноў на бліжняй Пульве і дальняй Лясной. Маючы паўтара дзесяткі камяг, шкутоў, дубасаў (рачныя судны) пераплаўляў збожжа са сваіх маёнткаў па Пульве, З.Бугу, Вісле- у Гданьск на продаж. Разводзіў статкі пародзістай рагатай жывелы і коней. Попыт на іх быў вялікі. Ці не ад воўчынскай конегадоўлі XVIII ст. бярэ пачатак у XIX ст конезавод арабскіх скакуноў у Янаве Падляскім (цяпер тэрыторыя Польшчы), што непадалёк ад Воўчына. Даўнімі часамі павеяла і ад пісьма жыхара Воўчына Міхаіла Панько, у якім ён расказаў, што ў даваенны час яго бацька і другія аднавяскоўцы займаліся вырошчваннем кавалерыйскіх коней. У наш час гэты занятак канчаткова згас.

Станіслаў Панятоўскі, чалавек адукаваны і светскі, правеў рэформу ў сваіх маентках. Прагматык, ен разумеў, што вытворчасць працы будзе вышэйшай, калі селянін менш змучаны работай. Таму адмяніў так званыя гвалты, зменшыў колькасць дзен, якія даводзілася працаваць на пана.

Бацька будучага караля, у якога сямейныя і гаспадарчыя справы ладзіліся, не мог не накіраваць сваю бурную дзейнасць на будаўніцтва новага (цаглянага) касцела замест ранейшага (драўлянага). Як вядома, першы драўляны касцел пабудаваны Аляксандрам Гасеўскім і асвечаны ў 1639 г. Вуглавы камень новага касцела быў закладзены арцыбіскупам (архіепіскапам) брэсцкім Уладзіславам Сутkоўскім 18 ліпеня 1729 г. Праект склаў і веў назіранне за будаўнічымі работамі італьянскі архітэктар Вінцэнты Рахецці.

Касцел рос не па днях, а па гадзінах. Ужо ў 1733 г. людзі ўбачылі цуд архітэктуры з большага пабудаваным. Узведзены ў стылі барока і ў форме ратонды з купалам, ен быў падобны да рымскага касцела Санта Марыя Мадджорэ. Невялікі і ўтульны будынак меў ідэальныя прапорцыі, адмыслова спланаваны ў сярэдзіне. Звонку яго дэкарыравалі сіметрычна размешчаныя карынфскія пілястры і вялікія, прыгожа аздобленыя, вокны. Над імі былі размешчаны авальныя вокны, багата ўпрыгожаныя. Плоскі дах з гонты хаваўся за паўкруглымі атыкамі, на якіх стаялі вазы, выразаныя з дрэва. Падлога ў сярэдзіне мармуровая. Касцел меў тры асвечаныя алтары: галоўны - у імя св. Тройцы, бакавыя- у імя Наведзення Найсвяцейшай Марыі Панны і святога Станіслава. Бліжэй да ўваходу знаходзілася памяшканне, якое вяло да сямейных крыптаў. Злева- балкон з балюстрадай, дзе сядзелі воўчынскія ўладары падчас богаслужэння.

Толькі ў 1743 г. касцел асвечаны арцыбіскупам Францішкам Кабельскім.

Пры Станіславе Панятоўскім дзверы воўчынскай рэзідэнцыі былі шырока адчынены для гасцей (звычай, заведзены цесцем Казімірам Чартарыскім). З блізкіх і далекіх ваколіц з’язджаліся сюды магнаты і шляхта, яго сваякі і знаемыя.

Бывалі тут многія, але асаблівы шарм гэтым шматдзенным свецкім сходам надавалі Радзівілы з Нясвіжа, Сапегі з Кодня, Бутрымовічы, Эйсмонты, Білевічы… Было там не толькі шмат вытанчаных страў і пітва, але вяліся і палітычныя дыспуты, абмяркоўваліся меры па выратаванню краіны, якая прыкметна слабела. Гаспадар, вядомы палітык, заўжды быў у цэнтры ўвагі і выносіў на абмеркаванне свае рэфарматарскія погляды. З імі ён выступаў у перыядычным друку, выдаваў брашуры. Станіслаў Панятоўскі прапанаваў наступнае:

1) колькаснае павялічэнне арміі;
2) удасканаленне фінансавай адміністрацыі;
3) правядзенне падатковай рэформы;
4) пад’ём прамысловасці і ўнутранага гандлю;
5) вяртанне мяшчанству даўніх праваў;
6) абмежаванне «Liberum veto» аб згубнасці якога сведчаць лічбы: у 1652-1764 гг. з 80 сеймаў было сарвана 44;
7) прадстаўленне свабоды веравызнання.

Як убачым пазней, перадавыя погляды бацькі знайшлі адлюстраванне ў рэформах сына-караля.

У 1732 г. лёс узнагародзіў сям’ю ваяводы мазавецкага чацвёртым сынам. Пагалоска сведчыць, што ў марозны дзень 17 студзеня, адразу пасля нараджэння нашчадка, заблукаў у Воўчын астролаг і прадказаў, што хлопчык стане каралём. У той жа дзень дзіця было ахрышчана, і далі яму імя Станіслаў Аўгуст. Аднак у кнізе метрык воўчынскага касцёла запісалі інакш…

## 4. ЛЁС МЕТРЫКІ І ВОЎЧЫНСКАЯ ШКОЛА

Самым каштоўным дакументам, які сведчыць аб былой велічы Воўчына і які захаваўся да нашых дзён, з’яўляецца невялікіх памераў, аздобленая бронзай «Кніга метрык касцёла воўчынскага ад 1653 года». У XVIII ст. яна поўніцца іменамі і тытуламі вядомых магнацкіх сем’яў Рэчы Паспалітай. Аднак найвялікшы інтарэс выклікаюць два запісы. Зроблены яны на латыні, перакладзены на польскую мову, аўтарам гэтых радкоў – на рускую, а на беларускую мову пераклала Галіна Новік...

Хрысцілі будучага караля ў драўляным касцёле св Тройцы, пабудаваным яшчэ Аляксандрам Гасеўскім, а капітальна адрамантаваным (прынамсі, так мяркуецца) Казімірам Чартырыскім.

У метрыцы пад нумарам 191 зроблены першы запіс: “Лета Божага 1732 студзень, дня семнаццатага Святлейшы, Дастойнейшы пан Станіслаў у Воўчыне і Радванічах граф Панятоўскі, ваявода Мазавецкі, галоўны рэгіментарый войск каралеўскіх атрымаў ад законнай сваёй жонкі Канстанцыі сына Станіслава Антонія, у дзесяці гадзін перад абедам народжанага, якога ў той жа дзень я, Война Станіслаў Костка Класовіч, святой тэалогіі доктар і абодвух праў, куратар воўчынскі, упаўнаважаны апостальскі Публічны Натарыус, ад святой крыніцы ахрысціў, адклаўшы на час другія абрады”.

“Другія абрады” адбыліся месяцам пазней, і ў кнізе пад №194 з’явіўся другі запіс: “Лета Божага 1732, у лютым, дня шаснаццатага, Святлейшы, Дастойнейшы

і Прыстойнейшы Пан Анджэй Залускі, епіскап Полацкі. Здзейсніў абрад хрышчэння Станіслава Антонія, сына Святлейшага, Дастойнейшага Пана Станіслава Панятоўскага, ваяводы Мазавецкага, галоўнага рэгіментарыя войскаў каралеўскіх і Святлейшай Канстанцыі, законнай жонкі, дня семнаццатага студзеня, прыватна хрышчанага. Падчас абрадаў асістыравалі Святлейшы князь Аўгуст Аляксандр Чартарыскі, ваявода рускі са Святлейшай княгіняй Марыяй, жонкай сваёю".

Вось і атрымалі адказ на пытанне: чаму Станіслаў Антоній? Як бачым, пры хрышчэнні нованароджанага Панятоўскага назвалі Станіславам Аўгустам, а ў спешцы запісалі " Станіслаў Антоній".

Лёс метрыкі быў складаным. Пасля 1876 г. яе касцёльныя акты перавезлі ў Высокае і змясцілі ў капліцы св. Барбары разам з дакументамі, іконамі, карцінамі і іншай маёмасцю закрытых касцёлаў. Усё гэта ляжала ў касцёле да той пары, пакуль у 1887 г. вялікі аматар гісторыі і літаратуры Ян Равіч-Вітаноўскі, які вёў пошук, не наткнуўся на кнігу метрык. Яе арыгінал апублікаваў у штотыднёвіку "Клосы". Толькі ў 1918 г. кніга метрык і другія акты вяртаюцца ў Воўчын пад апеку ксяндза Антонія Чышэвіча. Гэты рэдкага сумлення чалавек наладзіў у 1937 г. збор ахвяраванняў на рэстаўрацыйны рамонт Воўчынскага касцёла, дзеля чаго звярнуўся да людзей добрай волі з заклікам, у якім былі такія словы: "Хай кожны дасць хоць нямнога – толькі як можна хутчэй". Гэта Чышэвіч прыняў труну апошняга польскага караля з Ленінграда і захоўваў яе да 1945 г., пакуль яго не дэпартавалі ў Польшчу. Думкі Чышэвіча засяроджваліся на тым, як захаваць метрыкі і воўчынскія акты. І ён змог зберагчы іх падчас дэпартацыі. Вось што паведаміў у 1997 г. "Магазін гістарычны" польскага тэлебачання ваяводстваў. Ксендз Чышэвіч, гэты светлы чалавек, перад смерцю наканаваў сваёй служанцы перадаць "Кнігу мертык Воўчынскага касцела" ў надзейныя рукі. Яго завяшчанне было выканана: бясцэнны дакумент перададзены ў архіў дыяцэзіі ( епархіі) ў Драгічыне на Бузе пад клапатлівую апеку ксяндза, прафесара Яўгеніўша Бароўскага.

Есць людзі, якія ствараюць, сеюць дабро, праменяцца духоўнасцю, а есць і тыя, хто разбурае, нясе зло, стварае вакол сябе вакуум, палае д'ябальствам. Да першых адносіцца Антоній Чышэвіч. І такіх, як ен, - легіен, хоць і не ўсіх мы ведаем. Яны не толькі духоўныя настаўнікі, але і асветнікі. Узяць хоць бы ксяндза Ігнацыя Верабея з Камянца, краязнаўцы, гісторыка ( яму належыць больш як тысяча пазіцый архіўных матэрыялаў): святароў а. Емяльяна Ганыткевіча з Вяліка-Ельні, які займаў актыўную жыццевую пазіцыю; а. Сергія Дзюкава, юрыста, кандыдата права, з Высокага; а. Плакіда Янкоўскага з Вайской, не пазбаўленага дару пісьменніка, паэта, перакладчыка; а. Пятра Елінецкага з Дзмітравіч (адкрыў ашчадную касу, дзе можна было ўзяць пазыку з мэтай садзеяння прыхажанам у развіцці сельскай гаспадаркі, быў арганізатарам народных спеваў); а. Аляксандра Будзіловіча, этнографа (ен збіраў песенны фальклор у Камянецкім раене); а. Льва Паеўскага з Камянца, які аддаваў шмат часу археалогіі, гісторыі, краязнаўству.

Нараджэнне Станіслава Панятоўскага і прадказанне яму каралеўскага тытулу падштурхнула сям'ю Панятоўскіх, і найперш яго маці, - жанчыну, не пазбаўленую амбіцый, стварыць у Воўчыне ў сваім маентку школу.

Так, школу! Праўда, не ў такім разуменні, калі есць спецыяльны будынак – есць школа, няма будынка – няма школы. Але школу ствараюць настаўнікі, якія вучацца самі і вучаць дзяцей.

Канстанцыя Панятоўская, якая несумненна была высокаадукаваная, сама выкладала ў сваей школе. На жаль, імены другіх настаўнікаў дакладна не вядомыя, але яны былі. І гаворка пра іх пойдзе ў раздзеле "Суквецце выдатных людзей". Вучнямі былі чатыры яе сыны, дзве дачкі, а таксама некалькі юнакоў з прыязных сем'яў, у тым ліку Антоній Тызенгаўз. У пералік вывучаемых прадметаў уваходзілі літаратура, матэматыка, прыродазнаўства ў шырокім разуменні, музыка, замежныя мовы, танцы, спевы. Аб якасці навучання ў школе сведчаць вынікі: старэйшы сын Казімір стаў каронным падкаморыем, Андрэй-аўстрыйскім генералам, затым фельдмаршалам, князем "Свяшчэннай Рымскай Імперыі", Міхал-біскупам, арцыбіскупам гнезенскім, кардыналам Польшчы, Тызенгаўз – рэфарматарам, аб ім варта расказаць больш.

Антоній Тызенгаўз – сябар юнацтва будучага караля. Разам выхоўваліся ў Воўчыне. З Воўчынскай школы ен выйшаў перапоўнены думкамі аб тым, як палепшыць, рэфармаваць эканоміку сваей краіны. Працягваў адукацыю.Маючы падтрымку Станіслава Аўгуста (караля), Тызенгаўз з яшчэ большай упэўненасцю марыў ператварыць Рэч Паспалітую ў квітнеючы край. Месцам ажыццяўлення сваіх рэформ ен выбраў Гродна. У склад Гродзенскай эканоміі ўваходзілі 13 гарадоў і мястэчак, 20 фальваркаў – усяго 40 тысяч чалавек. Ен дабіўся і атрымаў у Галандыі крэдыт – 9 мільенаў злотых пад залог маенткаў. Пачалося будаўніцтва прадпрыемстваў, жылля, культурных аб'ектаў. За 15 гадоў-паўсотні збудаванняў рознага прызначэння: пабудавана жылле для рабочых, магазіны, склады, адкрыты тэатр, капэла. Заснавана 17 мануфактур-металургічных, гарматных, карэтных, шаўковых, палатняных, суконных,васкавых, панчошных, залататкацкіх. Яны прыносілі мільенныя прыбыткі. Аднак у казну паступала толькі 300 тыс. злотых. Дзе астатнія грошы? Яны зніклі ў непамерных кішэнях чыноўніцтва. Тызенгаўз пайшоў на радыкальны крок - ен звольніў адразу ўсіх чыноўнікаў і набраў новых. Але гэта не дапамагло - тыя пачалі красці яшчэ больш і былі значна хітрэйшыя. А звольненыя сталі ворагамі Тызенгаўза і шкодзілі, як маглі. Ен і яго эканомія сталі банкротамі. Тады рэфарматар звярнуўся да караля, але той адвярнуўся ад яго. Звярнуўся ў сейм, але і сейм ухіліўся ад якой-кольвек дапамогі. Яго выгналі з Гродна. Апошнія пяць гадоў Тызенгаўз хварэў, апынуўся ў адзіноце і галечы. Памер у 1785 годзе. Да канца 80-х гадоў XVIII ст. створаныя ім мануфактуры закрылі.

Такі ен–лес рэфарматара. Не шкадуючы сябе дзеля другіх, ен сам апынуўся ў бядзе. Тызенгаўз пахаваны ў Жалудку на Гродзеншчыне, у касцеле. Аднак касцела таго ўжо няма… Тым не менш яго ідэі атрымалі развіцце ў Літве ў рамках Расійскай імперыі. Не забылі аб ім і ў сучасным Гродне, дзе есць вуліца Тызенгаўза, на якой размешчаны Нацыянальны архіў Беларусі.

# 5. РОСКВІТ ВОЎЧЫНА

Адбылася чарговая змена ўладальнікаў Воўчына. Князь Міхал Фрэдрык Чартарыскі, канцлер Вялікага княства Літоўскага, міністр і выдатны палітык, купіў у свайго швагра Станіслава Панятоўскага (бацькі) воўчынскія маёнткі. Згодна з аднымі сведчаннямі, адбылося гэта ў 1738г., з другімі – у 1744г. Больш праўдзівай здаецца першая дата, бо новы ўладальнік працягваў дабудоўваць і ўпрыгожваць касцёл Святой Тройцы, і па яго просьбе ён асвечаны ў 1743г.

Новы ўладальнік, швагер Станіслава Панятоўскага, князь Міхал Чартарыскі, працягваў упрыгожваць воўчынскі каталіцкі храм. Гэта пры ім была выканана лепка ў выглядзе раслінных, фігурных і арнаментных дэкарацый. Удасканальваючы прапорцыі, паднялі дах, гонту замянілі бляхай. Для будынка паставілі невялікія печачкі. Касцёл увянчала чатырохбаковая вежачка, пад шаломам якой змясцілі ўнушальных памераў гадзіннік з чатырма вялікімі шчыткамі, накіраванымі на чатыры бакі свету. Кожныя чвэрць і паўгадзіны ён адбіваў нізкімі тонамі, а кожную гадзіну- высокімі. Драўляныя вазы на атыках замянілі чатырма скульптурамі евангелістаў: Матфея, Марка, Іаана, Лукі. Касцёл меў два ўваходы: з боку адзінай небрукаванай дарогі, што ішла праз Воўчын, і з боку палаца Чартарыскіх.

Станіслаў Панятоўскі быў добрым гаспадаром, аднак Міхал Чартарыскі аказаўся яшчэ лепшы. Ен часта і ахвотна жыў у Воўчыне. Для вяльможнага жыцця вырашыў стварыць вялікасвецкую рэзідэнцыю. Працягваючы дабудоўваць касцёл Святой Тройцы, пачаў будаўніцтва прыгожага ліственічнага палаца з 36-і пакояў і двух цагляных флігеляў з 56-і пакояў. Гэта было збудаванне ў стылі барока, увенчанае атыкай, дэкарыраванае скульптурамі. Фасад меў шырокія вокны, упрыгожаны быў рызалітамі і пілястрамі, а высока пад дахам знаходзіліся круглыя ваконцы, ці люкарны.

Каб збудаваць новую рэзідэнцыю, Міхал Чартарыскі зносіць тую, што пабудаваў Казімір Сапега і ўдасканальвалі Казімір Чартарыскі і Станіслаў Панятоўскі.

Ужо даўно няма той рэзідэнцыі, якую пабудаваў Міхал Чартарыскі, але дзякуючы таму, што П.Вантроба ў 1994г. у Парыжскай нацыянальнай бібліятэцы змог знайсці пяць малюнкаў архітэктара П'ера Рыко де Тыррегайле, сярод якіх аказаўся план Воўчынскай рэзідэнцыі, мы можам уявіць, як яна выглядала.

Палац будаваўся буквай П і займаў прыўзнятую частку сядзібы, якая была агароджана. З абодвух бакоў да палаца прымыкалі размешчаныя асіметрычна гаспадарчыя службы, уладкаваныя ў форме карэ. З паўночнага боку размяшчалася кухня, вазоўня, карэтныя, пральня, кузня, майстэрні, вальеры, кітайскі кабінет, канюшні. Да палаца прымыкаў парк. Ён быў вельмі складаным вынаходніцтвам паркавага мастацтва, закладзеным па праекту архітэктара Яна Давіда Кнакфуса. У аснову яго закладзены вялікі канал са складанай сістэмай гідратэхнічых збудаванняў. Вада паступала ў яго па адным канале і адводзілася ў Пульву. Вядомы даследчык магнацкіх сядзіб Берасцейшчыны А.Т.Федарук, які даследаваў іх у натуры, у тым ліку і Воўчынскую сядзібу, сведчыць: Вялікі канал добра выражаны ў цэнтральнай часцы. Яго працягласць 500м., шырыня 10м. Ен уключаў тры круглыя вадаемы і чатыры фантаны. З усходняга боку канал завяршаўся

скульптурнай групай Нептуна і гротам. На беразе новага русла ракі Катэркі размяшчаўся павільен, ад якога захаваліся руіны фундамента (34х10 м). Вялікі канал быў часткай складанай воднай сістэмы (яго стварыў П’ер Рыко де Тыррэгайле), якая ўключала Пульву, Катэрку, ручай, штучныя вадаемы, каналы, пратокі, дамбы, масткі.

Кампазіцыя, створаная зяленым салонам на тэрасе Катэркі, ад якога разыходзіліся восем алей у выглядзе праменняў. Зараз гэта тэрыторыя стала выганам. Заўважальныя ліпавыя алеі, якія ў выглядзе васьмі дарожак выражалі адзін з версальскіх матываў. Парк за Катэркай пераходзіў у звярынец. Вялікі звярынец размяшчаўся з паўднёвага боку Вялікага канала. У гэтай жа частцы знаходзіўся зялены тэатр, меўся агарод. Утрыманне парку каштавала каля 3500 злотых у год. Да палаца прымыкала цяплічная гаспадарка і аранжарэя. Будаўніцтва ішло з шырокім размахам. Гэта пацвярджаюць эканамічныя рэестры. Так, планіроўка зямлі пад будаўніцтва палаца, аранжарэі і парка абышлася ў 18 тысяч злотых; роспіс фрэскамі ўнутраных памяшканняў і чатырох альтанак каштаваў 58 тысяч. На будаўніцтва толькі аранжарэі зрасходавана 120 тысяч цаглін.40-гектарны парк, акрамя каналаў, меў штучныя каскады. Вялікі канал быў выкладзены дубовымі дылямі. Гаспадары і госці прагульваліся ў частцы парка ля палаца. Яны шпацыравалі ўздоўж старажытных шпалер і праспектаў. Па парку вольна бегаў невялікі статак высакародных аленяў.

Пакоі палаца князя былі аббіты габеленамі і чырвоным адамашкам, з пазалочанымі краямі. Падлога выкладзена з рэдкіх парод дрэва, разная мэбля з бронзавымі элементамі прывезена з Францыі, на сценах – карціны выдатных мастакоў, пераважна італьянскай школы.

Двухпавярховы цагляны будынак бібліятэкі, што пабудаваны яшчэ пры Казіміры Чартарыскім і ў якім нарадзіўся Станіслаў Аўгуст, стаяў бліжэй да цаглянага касцёла. У бібліятэцы было некалькі тысяч кніг, а таксама дакументы валынскага архіва (з Клевані) - старажытныя акты Валынскага ваяводства. Тыя дакументы Казімір Чартарыскі прывёз з Клевані. Невядомы фотаздымак 1908 года прадстаўляў ужо моцна падношаны будынак бібліятэкі. Як сведчыў адзін з воўчынскіх старажылаў у 1963г., а таксама Вінцэнты Арцішэўскі, бібліятэка і архіваў існавалі яшчэ да 1939 г. Куды зніклі кнігі і акты Валынскага архіва, пакуль не ўдалося высветліць. Часта ўжываю слова “пакуль”. Гэта значыць, што факты ўсё яшчэ не вядомыя, але аўтар гэтых радкоў у пошуку. Калі мне пашчасціць знайсці іх, абавязкова раскажу. А, можа, гэта зробіць нехта другі, таксама захоплены пошукам.

Нягледзячы на ідылію вясковага жыцця, гаспадар не мог не паклапаціцца аб умацаванні сваей разідэнцыі ад ворагаў, таму што ў мінулым маемасць спусташалася падчас шведскіх войнаў як у гаспадароў, так і ў сялян. Таму рэзідэнцыя была ўмацавана па ўсіх правілах фартыфікацыйнага майстэрства. Пабудавалі арсенал, устанавілі гарматы, якія ў другой палове XYIII ст. выконвалі больш дэкарацыйную ролю. Вядома, што барскія канфедэраты, праходзячы побач у 1769г, зазірнулі ў Воўчын і забралі з сабою сем гармат і боепрыпасы…

Міхал Чартарыскі завеў маршала двара, сакратара, падчашага, канюшага, рэзідэнтаў, дворню, службу. Меў і артыстаў для свайго тэатра, у XVIII ст. у

Воўчыне быў першы і апошні тэатр на Камянеччыне. Яго трупа папаўнялася запрошаным з Францыі артыстамі і выпускнікамі акцерска-балетнай школы Гераніма Радзівіла з Белай Падляскі. Гаспадар раскошнага двара, як і яго папярэднікі, запрашаў да сябе знакамітых блізкіх і далекіх суседзяў. Яны былі розныя як па адукацыі, так і па выхаванні. Прадстаўнікамі «еўрапейскага» тыпу былі Чартарыскія і Панятоўскія, «сармацкага» - некаторыя з Радзівілаў і іншыя. Сярод іх вылучаўся Караль Станіслаў («Пане каханку»), які, як сведчыць Караль Збышэўскі, прымаючы гасцей, прапанаваў кожнаму на сняданак у 11 гадзін «падаць сухой каўбасы, паўміскі зразаў з кашай, два каплуны, запіваў чатырма бутэлькамі венгерскага і ўсе». Абед пачынаўся апоўдні. «Моўчкі з'ядалі на пачатку міску баршчу, затым міску рабрынак з гарохам, балейку капусты з кавалкам мяса…» І падчас гэтага абжорства Караль Радзівіл штомінуты верашчаў: «Пане каханку, нічога не каштуеце, не п'яце… На здрове!» Таму і назвалі яго «Пане каханку». Абед доўжыўся гадзін шэсць, затым крыху адпачывалі, вячэралі, нарэшце танцавалі.

Цікава, што Караль Станіслаў, маючы тытулы мечніка і ваяводы віленскага, не ўмеў дасканала чытаць і пісаць. У Воўчыне прыем гасцей быў супрацьлеглым вышэй апісанаму. Большая ўвага надавалася страве духоўнай: слухалі паэтаў, музыку, удзельнічалі ў тэатральных спектаклях, танцавалі, ладзілі спаборніцтвы – тут было дзе праводзіць іх. Госці пераапраналіся ў адпаведнасці з відам адпачынку.Варта адзначыць, што навакольныя магнаты ахвотна збіраліся ў Воўчыне.

Адной з прычын вялікасвецкага збору была цырымонія заручын і вяселля дочак "Фаміліі". Па традыцыі яны прызначаліся на 19 лістапада, у гонар дня Анела старэйшыны роду, жонкі Казіміра Чартарыскага – Ізабэлы. У 1748г. Ізабэла Панятоўская, сястра будучага караля, выйшла замуж за вялікага гетмана кароннага Яна Клеменса Браніцкага, апошняга прадстаўніка старажытнага роду Браніцкіх. Разам з ею выходзіла замуж за ваяводу падляскага Міхалу Сапегу яе стрыечная сястра, дачка гаспадароў, Аляксандра Чартарыская. Гэта арыгінальная жанчына, застаўшыся ўдавою, праз трынаццаць гадоў тут жа ў Воўчыне (таксама 19 лістапада), у касцеле св.Тройцы, у другі раз стала пад вянец – з ваяводам Віленскім, Вялікім гетманам літоўскім, Міхалам Казімірам Агіньскім (не блытаць яго з Міхалам Клеафасам Агіньскім, аўтарам вядомага "Паланэза").

"Маладыя" асталяваліся ў Седльцэ – спадчыннай рэзідэнцыі Аляксандры. Яна, жанчына неўраўнаважаная, вылучалася незвычайнай фізічнай сілай, любіла павесяліцца.Магла проста так, ад няма чаго рабіць, падчас абеду згарнуць у трубку срэбраны сподак. Яе муж, невысокага расточку, пабойваўся яе. Аднойчы, распаліўшыся, схапіла яго за пояс, выставіла з акна другога паверха і так трымала да таго часу, пакуль не прызнаў ен, што жонка мае рацыю. Вось такімі рознымі былі гэтыя магнаты.

А Міхал Казімір Агіньскі аддаліўся ад граху далей – у сваю рэзідэнцыю ў Слоніме, дзе меў палац на 100 пакояў, велізарны двор, музычны тэатр з капэлаю, танцоўшчыкамі, друкарню, у якой выдаваў свае вершы і кнігі.

Згадаю, што ў той дзень, 19 лістапада 1761г., адначасова з парай Аляксандра Чартарыская – Міхал Казімір Агіньскі, вянчалася Ізабэла Флемінжанка і Адам Казімір Чартарыскі.

Князь Міхал Чартарыскі меў у сваім двары ў Воўчыне буйных аванцюрных рубак, якіх празвалі "ваўкамі". Яны выконвалі функцыі асабістай аховы князя і, як цапер назвалі б, спецназа, для сцвярджэння палітычнай волі яго на выбарах, сейміках, сейме каронным.

Разбудоўваючы сваю рэзідэнцыю, Міхал Чартарыскі не забываў пра Воўчын і свае маенткі. Там па-ранейшаму вырошчвалі таварнае збожжа, разводзілі пародзістую жывелу, захоўвалі гандлевыя сувязі з Гданьскам. Воўчын разросся да прыстойнага мястэчка. У 1771 годзе пабудавана ратуша, каменныя гандлевыя рады (у той час у Камянцы-Літоўскім былі драўляныя). А паколькі ў Воўчыне была ратуша, дык, магчыма, меў ен і Магдэбургскае права. Сюды наплывала яўрэйскае насельніцтва, дробныя гандляры, рамеснікі, краўцы. Яны мелі сінагогу і сваю школу. У 1893 г. у мястэчку пражывала 804 чалавекі, большасць з іх яўрэі. Было 102 дамы, з іх 5 мураваных, працавалі 14 склепаў. У 1939г. у Воўчыне пражываў 491 хрысціянін, з іх 373 католікі, 396 яўрэяў. У 1942 годзе фашысты расстралялі яўрэяў на паўночна-заходняй ускраіне вескі.Там зараз стаіць помнік.

У мястэчку праводзілася па тры кірмашы штогод - 30 студзеня, 23 красавіка, 24 чэрвеня. Пасля смерці князя Міхала (1775 г.) пры яго нашчадках, з 1792 па 1830 г., у Воўчыне паспяхова працавала мануфактура Мельбаўнера, якая выраблялa адмысловае сукно. Акрамя касцела і царквы стаяў Васіліянскі манастыр (слядоў яго не засталася). У 1791 г. на злучэнні дарог з Высокага і Нямірава пабудавана капліца (захавалася да нашых дзен). Усе, створанае ў Воўчыне, было зроблена ўмелымі рукамі і светлым розумам: хтосьці будаваў, упрыгожваў пабудаванае скульптурамі, ствараў парк, пісаў карціны, партрэты, распісваў фрэскамі альтанкі, дарыў гаспадарам і гасцям асалоду вершаў і музыкі, даваў тэатральныя прадстаўленні. Аб іх наступны апавед.

## 6. СУКВЕЦЦЕ ВЫДАТНЫХ ЛЮДЗЕЙ У ВОЎЧЫНЕ

Воўчын XVIII ст. быў адметным цэнтрам усяго таго, што прынята называць культурай. Аднак ен быў не адзіным. Наўкол яго, як і па ўсім Пабужжы, раскінуліся радавыя маенткі магнатаў. Большасць з іх парадніліся, але кожны меў сваю адметнасць. Уладальнікі маенткаў перабудоўвалі, добраўпарадкоўвалі, упрыгожвалі іх, нібыта спаборнічаючы, чый двор атрымаецца лепшым. Але ў той двор укладалі свой талент і людзі ад культуры.

Магнаты прыкладалі ўсе намаганні, каб самыя славутыя з французскіх, італьянскіх, нямецкіх архітэктараў стваралі шэдэўры з каменю, дрэва, цэглы ў іх дварах.

Касцел, рэшткі якога бычым сення ў Воўчыне, пректаваў і назіраў за будаўніцтвам паланізаваны італьянец, варшаўскі архітэктар Вінцэнты Рахеці. Будаўніцтва касцёла, пачатае пры Станіславе Панятоўскім, і працягвалася і пры Міхале Чартарыскім, які даверыўся таленту маладога архітэктара (таксама з паланізаванай італьянскай сям'і) – Якуба Фонтаны. Яго ва ўсіх справах акружалі не меней таленавітыя майстры: Юзэф ля Пэн-штукатур, Богуміл Плерш-мастак,

Міхал Далінгер – стваральнік балюстрад і лесвіц, Ян Хрысціян Рэдлер – скульптар. Гэта Рэдлер стварыў каменныя скульптуры евангелістаў, што былі ўстаноўлены на даху касцела: Нептуна са світай для парку, другія скульптуры. Тут працавалі сотні безыменных будаўнікоў з Воўчына і навакольных фальваркаў. Але дзякуючы А.Т. Федаруку, мы цяпер ведаем, што садоўнікам у парку быў Рыхтэр (у 1777г.), яму дапамагалі мясцовыя сяляне Аляксей, Ануфрый, Селіван і Мірон, прозвішчы якіх не дайшлі да нас.

Як ужо сказана вышэй, парк заклаў Ян Давід Кнакфус (такую ж справу ён выканаў у Радзыне Падляскім для Патоцкага і ў Беластоку – для Браніцкага), водную сістэму праектаваў і будаваў П’ер Рыко дэ Тыррэгайле. Воўчынскі палац і другія збудаванні праектавалі і выконвалі нагляд за будаўніцтвам Крэйц, Даніэль Яўх, Матэуш, Даніэль Поппельман.

Міхал Чартарыскі збіраў у сваёй рэзідэнцыі мастакоў, іканапісцаў, партрэтыстаў, пейзажыстаў і даваў творчыя даручэнні.

Іконы касцёла св. Тройцы ў Воўчыне належаць вядомаму іканапісцу Францішку Смуглевічу. Карцінамі на рэлігійныя тэмы ўпрыгожыў храм другі іканапісец – Шымон Чэховіч. Пакоі палаца Чартарыскіх упрыгожвалі карціны італьянскіх мастакоў. Партрэты Станіслава Панятоўскага (бацькі). Аўгуста II, Карла XII, Аўгуста III, Канстанцыі Панятоўскай з малым Стасем на фоне карты, пэўна, пісаў славуты партрэтыст з Гданьска Якуб Вэсэль. Сын аднаго з прыбліжаных Чартарыскіх–Зыгмунд Фогль – быў заўважаны і стаў архітэктарам і “кабінетным” мастаком караля, па даручэнні якога ездзіў па краіне і выконваў акварэльныя віды архітэктурных аб’ектаў. З гэтай мэтай наведаў ён і Воўчын. З Францыі прыехаў у рэзідэнцыю Чартарыскіх і пастаянна знаходзіўся тут мастак Ян П’ер Норблін дэ ля Гоўрдайн, які нямала зрабіў для польскай графікі. На яго карцінах і малюнках – славутасці воўчынскага наваколля. Гэта ў Норбліна стажыраваўся мастак першай паловы XIX ст. Аляксандр Арлоўскі, «адкрыты» Аляксандрай Агіньскай, дачкою князя Міхала.

У Воўчыне працягвала працаваць школа, створаная Канстанцыяй Панятоўскай. Урокі жывапісу і рысунку там выкладаў Ян П’ер Норблін, танцаў-маэстра Даўвіні з парыжскай оперы, музыкі- таленавіты Патонар. Ен жа дарыў асалоду гасцям ігрою на арфе. Акрамя таго, у Воўчынскім тэатры Даўвіні быў балетмайстрам, а Патонар-дырыжорам аркестра і канцэртмайстрам…

Перад гасцямі Чартарыскіх часта выступаў са сваімі вершамі паэт Францішак Дыянізы Князьнін. Ен хаця і нарадзіўся ў 1850 г. на Віцебшчыне, але большую частку жыцця правеў у Воўчыне, пры двары Чартарыскіх. Быў пачынальнікам польскага сентыменталізму. Пісаў вершы, оды, гімны, п’есы, оперы. Збіраў фальклор у ваколіцах Воўчына. Напісаў лібрэта оперы «Цыганы» (музыку- Міхал Агінскі), якую паставіў у воўчынскім тэатры Патонар. Памер у 1807 г. і пахаваны, па некаторых сведчаннях, у Воўчыне. Можа, нехта знойдзе некалі яго магілу.

Наведваліся ў Воўчын паэты і пісьменнікі таго часу: Карпіньскі, Крапіньскі, Ігнацы Быкоўскі. Асабістым сакратаром князя Міхала Чартарыскага ў Воўчыне быў выхаванец корпуса кадэтаў Юліян Урсын Нямцэвіч, які «вылецеў» з радавога

гнязда, што знаходзілася ў недалекіх Клейніках. Менавіта ў рэзідэнцыі Чартарыскіх ен пачынаў кар'еру пісьменніка і гісторыяграфа.

Крыху пазней, падчас панавання ў рэзідэнцыі Адама Казіміра Чартарыскага, славутай воўчынскай бібліятэкай загадваў адмысловы матэматык Сімон Льюільер. Па даручэнні Камісіі Адукацыі Народовэй ен падрыхтаваў першыя падручнікі на польскай мове па арыфметыцы, алгебры, геаметрыі.

Гэта былі цудоўныя людзі, якія працавалі на нашай, камянецкай, зямлі.

Аднак мы ведаем пра іх вельмі мала. Апроч таго, есць сярод нас і такія, хто мае памяць выбраную. А яна павінна быць усеабдымнай. Праз 200 гадоў пасля Льюільера тут, у Воўчыне, жыў і працаваў адмысловы настаўнік, фізік, светлай памяці Анатолій Дзмітрыевіч Юрчык. Колькі людзей памятаюць яго? Хто гэтую памяць павінен захоўваць? Канечне, настаўнікі, і перадаваць яе сваім вучням, а тыя-сваім. Кіраўнікі асветы таксама «хварэюць» беспамяцтвам. Няхай да кожнага дойдуць словы заўпакойнай малітвы: «Вечная памяць!»

## 7. АКРУЖЭННЕ ЧАРТАРЫСКІХ

Воўчын быў не адзіным месцам пасялення заможных людзей.Такія магнацкія «гнезды» раскінуліся па ўсей Рэчы Паспалітай і Літве. Кожны з магнатаў меў па некалькі рэзідэнцый. Мы засяродзім увагу на тых, якія размясціліся ў раене Высокага-Камянца і на сярэднім Пабужжы. Вось аб гэтых «гнездах» і іх уладальніках, сярод якіх можна заўважыць прадстаўнікоў родаў Панятоўскіх, Чартарыскіх і парадненых з імі,пойдзе далейшы аповед.

ТЭРЭСПАЛЬ. Крыніцы сцвярджаюць, што на месцы сучаснага гарадка (у наш час вядомага пагранічным пераходам) у 1512 г. у межах Берасцейскага войтаўства знаходзілася веска Блоткув, былая ўласнасць Івана Сапегі, якая з 1533г. знаходзілася ў распараджэнні Івана Гроностая (Горнастая). У 1591 г. ен аддае сваю ўласнасць вялікаму канцлеру Літоўскаму Льву Сапегу. Наступным уладальнікам стаў Хрызастам Драгастыньскі, вялікі маршал Літоўскі, які ў сваю чаргу падараваў гэты маентак Зыгмунту III Вазе. Уладальнікі мяняліся да той пары, пакуль гэта мясцовасць не дасталася віленскаму кашталяну Юзэфу Слушцы. Вось ен і назваў у гонар сваей жонкі Тэрэзы з дому Гасеўскіх веску Блоткув Тэрэспалем, каралеўскім прывілеем падняўшы яе да рангу горада. Паколькі тут праходзіў берасцейскі тракт і знаходзілася пераправа цераз Заходні Буг, горад рос, стаў на шлях развіцця гандлю і рамяства. Аднак найбольшага росквіту Тэрэспаль дасягнуў пры Яне Ежы Флемінгу, дваюрадным браце Якуба Хэнрыка Флемінга. Ен парадніўся з Міхалам Фрэдэрыкам Чартарыскім, уладальнікам Воўчына. Стаўшы кіраўніком усіх зямель паўднева-заходняй часткі Берасцейскага ваяводства, Ян Ежы Флемінг праявіў сябе дбайным гаспадаром: расчышчаў пушчы, асушаў балоты, на расчышчаных ад лесу землях сеяў пшаніцу, якая давала добры ўраджай, будаваў рачныя судны, сплаўляў лес. Наладзіў гандаль прадуктамі сваей гаспадарчай дзейнасці з Еўропай, выкарыстоўваючы для гэтага водны шлях па Бугу. Як успамінае Юльян Урсын Нямцэвіч: «Флемінг паказаў берасцейцам прыклад стараннага і добрага гаспадарання. Ен першы ўвеў на гэтых землях спосаб рыцця рвоў для асушэння балот, раскарчоўвання зямель, якія параслі хмызняком.

У сярэдзіне XVIIIст. ен прыступіў да грунтоўнай мадэрнізацыі Тэрэспаля. На развалінах рэзідэнцыі Зыгмунда III сярод паркавых дрэў будуе аднапавярховы палац, а побач, запрасіўшы нямецкіх каланістаў, горад. Паселішча ў тыя часы выглядала незвычайна: усе пабудовы цагляныя, з чырвонымі чарапічнымі дахамі; рынак акружаны прыгожымі дамамі. Пасярэдзіне—ратуша з гадзіннікам, гандлевыя крамы, крыху ў баку – касцел і дамініканскі манастыр. У Тэрэспалі знаходзілася кіраўніцтва маенткамі, школа, рамесныя майстэрні, аптэка.

Паспяховая і разумная гаспадарчая дзейнасць зрабіла Флемінга надзвычай багатым. Ен бярэ шлюб з Антанінай Чартарыскай. Ад гэтага шлюбу нарадзілася дачка Ізабэла. Выхоўвалася яна ў дзеда і бабулі Чартарыскіх, час ад часу наведвала бацькоў у Тэрэспалі, куды прыязджаў і сам князь Міхал.

Шлюбам Ізабэлы Флемінг (мела тады 15 гадоў) з генералам Падольскай зямлі Адамам Казімірам Чартарыскія мелі на мэце памножыць свае скарбы, што ставіла б сям'ю Чартарыскіх у лік першых фінансавых магнатаў Рэчы Паспалітай і рабіла б больш моцнымі іх манархічныя пазіцыі.

Ян Ежы Флемінг, будучы чалавекам іншага менталітэту, клапаціўся аб паляпшэнні гаспадарчай дзейнасці і не прыдаваў значэння таму, што яе трэба абараняць з дапамогай ваеннай сілы ад «сарматаў». Такім «сарматам» быў ужо ўпамінаны Караль Станіслаў Радзівіл. «Пане каханку», які знаходзячыся ў кагорце заўзятых праціўнікаў Чартарыскіх, помсціў іх прыхільнікам. У 1764г. ен спаліў Тэрэспаль, разрабаваў палац. Павялічылі рабаванне ў 1769г. барскія канфедэраты. Гаспадаранне Флемінга закончылася яго смерцю ў 1771г. Што тычыцца Тэрэспаля, то яшчэ ў 1784г. праходзілі ўрачыстасці з выпадку знаходжання ў Брэсце караля Станіслава Аўгуста. Пасля гэтага росквіт Тэрэспаля закончыўся. Маенткі Флемінга перайшлі ў спадчыну да дачкі – Ізабэлы Чартарыскай.

КОДЭНЬ. З некаторых крыніц вядома, што ен заснаваны ў канцы XV ст. братамі Рушчыцамі. Кодэнь выкупіў ад братоў Іван Сопега (па мянушцы «Івашка») і паклаў пачатак кодэньскай галіне Сопегаў. Паколькі прадстаўнікі гэтага роду сустракаюцца ў гісторыі Камянецкага краю, то будзе правільным расказаць «откуда есть пошел» гэты род.

Да канца XIX ст.было такое меркаване, што Сопегі па мужчынскай лініі паходзяць ад Гедыміна. Гэта сцверджанне адхіліла грунтоўнае даследаванне «Сапегі-матэрыялы гісторыка-генеалагічныя і маемасныя» ў далейшым названыя «Матэрыяламі», выдадзеныя ў 1890-1894гг. коштам сям'і.

Установлена, што Сопегі не належаць да даўніх літоўска-рускіх родаў княжацкіх, не маюць ніякіх сувязяў з Гедымінам. Хоць гэта быў і не княжацкі род, але старажытны і багаты, які прыйшоў у Літву са Смаленскай зямлі. У 40-х гадах XV ст. у крыніцах выступае нейкі Сямен Сопега, сакратар Казіміра Ягелончыка. Сын Сямена, Богдан Сопега, таксама займае пост сакратара ў 1471 г. Ад Богдана пайшла Чарэйская галіна. Гэта былі, як і Чартарыскія, а таксама некаторыя другія, праваслаўныя, руськія людзі. Неўзабаве Сопега трансфарміруецца ў Сапегу і так застаецца назаўседы.

Іван дабіўся таго, што ездзіў асабістым амбасадарам каралеў польскіх, князеў ВКЛ у Маскву і Рым. За паспяховае выкананне дыпламатычных даручэнняў быў узнагароджаны ў1506г. зямельнымі надзеламі і тытулам каралеўскага сакратара.

У 1511г. Зыгмунт Стары дае яму прывілей: «Дазваляем Яну Сапеге (ўжо не Сопега – Г.М.), маршалу і найвышэйшаму сакратару нашаму, замак пастaвіць у Кодні і горад заснаваць; надаем яму права нямецкае, чы магдэбургскае, адхіляючы супярэчлівыя яму правы і звычаі руськія, а таксама ўсякія іншыя». Атрымаўшы гэты прывілей, ен неадкладна ўзяўся за ўладжванне горада і будаўніцтва замка. Гэта Іван Сапега пачаў будаўніцтва вялікага рачнога порта на З. Бугу, якое заканчвалі яго нашчадкі. Дабіўшыся прызнання на дзяржаўным узроўні, многае зрабіўшы па ўпарадкаванні падараваных зямель, ен адкрыў шырокі шлях у жыцці нашчадкам роду. Памер ваяводай падляскім. Сын Івана Павал, спадчыннік кодэньскіх маенткаў, узвеў пры замку цагляную царкву св. Духа ў гатычным стылі (1530-1540гг). Паспяхова прадаўжаючы гаспадарчую дзейнасць, (не горш за бацьку), адкрыў клады жалезнай руды балотнай, а таксама вапны, і веў іх прамысловую здабычу. Пражыў Павал доўгае, поўнае супярэчлівасцяў жыцце. Як ваявода наваградскі, паставіў свой подпіс пад актам Люблінскай уніі ў 1569 г. Памер ва ўзросце 98 гадоў.

Сын Паўла Мікалай, выхаваны ў праваслаўі, перавез у кодэньскую царкву св.Духа прах сваіх продкаў – дзеда Івана з царквы ў Боцьках і бацькі Паўла з царквы ў Вільні. Аднак пад уплывам сваей жонкі княгіні Вішнявецкай перайшоў на каталіцызм. З гэтага моманту род Сапегаў стаў каталіцкім і паланійным. Мікалай памер у 1559 г. у пасадзе ваяводы Віцебскага.

Сын Мікалая – Мікалай (1581-1644 гг.) – быў ужо заўзятым каталікам. Тым не менш праяўляў далёка ідучую талерантнасць другіх веравызнанняў. Так ён на Кадэньскую царкву св.Духа даваў дзесяціну са сваіх маёнткаў Кадэньскага ключа. Адначасна, будучы фанатычным каталікам, у 1629 г. даручыў цэхаваму майстру люблінскіх муляраў Яну Кангерле будаўніцтва каталіцкага касцёла ў Кодэні, падобнага рымскай базыліцы св. Пятра. Будаўнічыя працы ішлі жвава. Тым часам Сапега накіроўваецца ў Рым, дзе знаёміцца з рэлігійным жыццём, атрымлівае аўдыенцыю ў папы Урбана XVIII ст. Знаходжанне Мікалая ў Рыме звязана з адной вельмі скандальнай гісторыяй. Перад ад'ездам ён наведаў прыватную панскую капліцу і ўбачыў там ікону Мадоны з Гвадэлупы (Іспанія). Ікона зрабіла велізарнае ўражанне, якое павялічыла легенда аб тым, што яна напісана св. Аўгустынам у XI ст., а за ўзор узята скульптура Мадоны, выкананая рукамі св. Лукі Евангеліста. Гэта змахнула сон з яго вачэй. Мікалай Сапега здзяйсняе святатацкі ўчынак – з дапамогай слугі крадзе ікону і тайна вязе яе ў Кодэнь. Адбыўся небывалы скандал. Цягнуўся ён доўга, але ікона засталася ў Кодэні. У 1636 г. Кангерле закончыў будаўніцтва касцёла св. Ганны. У ім змясцілі ікону Мадонны з Гвадэлупы, якую сталі называць цудатворнай іконай Кодэньскай Божай Маці. У новы касцёл Мікалай перавёз з царквы св. Духа прах сваіх продкаў, у тым ліку роданачальніка кодэньскай галіны – Івана. У хваробах закончыў Мікалай свой жыццёвы шлях і пахаваны ў пабудаваным ім касцёле.

З той жа кодэньскай галіны Павел Францішак Сапега (1656-1715) выбраў шлях воіна. У юнацкім узросце прымаў удзел у войнах з туркамі і за баявыя заслугі атрымаў чын палкоўніка. І тут нітачка з Кодэня працягнулася да Высока-Літоўска. Лічыцца, што Павел, прывёўшы з сабою з вайны палонных турак, з іх дапамогай узвёў у 1678-80 гг. Высокаўскі замак. Адмовіўшыся ад ваеннай

кар'еры, прысвяціў сябе служэнню Богу. У 29 гадоў прыняў пасвячэнне, стаўшы ксяндзом-пробашчам кодэньскім, канонікам віленскім, варшаўскім, схаластыкам сандамірскім. У 1704 г. кароль Аўгуст ІІ прызначае яго вярхоўным сакратаром ВКЛ. Епіскапам Жмудскім ён становіцца ў 1713 г.

Дзеля праўды трэба сказаць, што Высокаўскаму замку Сапегаў папярэднічаў іншы, больш сціплы, які служыў абаронным мэтам падчас маскоўска-польскай вайны. А замак Сапегі згарэў у 1748 г.

На кароткі час Высокае пераходзіць да Ябланоўскіх. Затым сюды зноў вяртаюцца Сапегі. Ваявода Полацкі, гетман и канцлер ВКЛ Аляксандр Міхал Сапега ў месцы развілкі дарог на Такары і Воўчын будуе манастыр боніфратараў са шпіталем на 20 хворых. У цэнтры ўзводзіцца невялікі касцёл (яго цяпер няма) з надпісам на франтоне: "Да ратавання бліжніх гэту хрысціянскую абавязковасць выканаў: Аляксандр князь Сапега, канцлер ВКЛ, 1785 г.". Сын Аляксандра Фрацішак, жанаты на Палагеі, дачцэ графа Шчэнснага Патоцкага, адступіў Высока-Літоўск жонцы. Затым Палагея выходзіць замуж за Паўла Сапегу, сына ваяводы смаленскага Мікалая, і будуе той, што захаваўся да нашых дзён, палац (1815 г.), пашырае славуты высокаўскі парк. Высока –Літоўскае стала апошняй рэзідэнцыяй Сапегаў у Літве і перайшло да Патоцкіх. Уладальніцай Высокага-Літоўскага становіцца ўнучка Паўла Марыя Патоцкая (1865г), вядомая поспехамі ў насенняводстве, адзначаная неаднаразова медалямі на сусветных выстаўках.

Можна было б ізноў вярнуцца ў Кодэнь, але застанемся на некаторы час у Высокім-Літоўскім, каб успомніць аб святынях, цесна звязаных з Сапегамі.

У 1603г. за кошты крайчага ВКЛ Андрэя Войны пабудаваны цагляны касцёл св. Тройцы. Ён некалькі разоў рамантаваўся ўладальнікамі Высока–Літоўска: ваяводай падляскім Міхалам Сапегам у 1735г., Аляксандрам Сапегам у 1781г. Сцены касцёла ўпрыгожвалі партрэты, выкананыя прафесійным пэндзлем будаўніка касцёла Андрэя Войны, біскупаў (епіскапаў) берасцейскіх Паўла Валуцкага, Францішка Кабельскага і Фелікса Турскага. Акрамя іх на сценах стаялі карціны першакласных мастакоў (як польскіх, так і іншаземных), перададзеных з галерэі палаца Сапег. Акрамя вядомай капліцы св. Барбары ў Высокім –Літоўскім былі яшчэ дзве: адна Ісуса распятага, другая – Непарочнага Зачацця Прасвятой Дзевы Марыі. Першая капліца ў 1845г. перароблена ў гатычным стылі, з рознакаляровымі вокнамі, з алтаром і чыгуннымі кратамі. Яна, па сутнасці, стала пахавальнай капліцай Сапегаў, аб чым сведчаць вывешаныя на кратах гербы. Мармуровы помнік з залатымі літарамі на ім сведчыць, што тут пахавана ў 1768г. сэрца Міхала (князя Сапегі).

Касцел св. Тройцы ў Высокім ў бязбожныя часы быў прыведзены ў непрыстойны стан. У ім спачатку зрабілі склад, потым спартыўную залу прафесійнага вучылішча. Куды падзеліся каштоўныя карціны, партрэты, іконы, касцельныя каштоўнасці? На гэта пытанне змаглі б адказаць прыклаўшыя рукі да святатацтва: дырэктар сельскага прафесійнага вучылішча Бугаеў і кіраўнік гаспадаркі Вечтомаў (гэта адбывалася ў пачатку 60-х гадоў ХХ ст.), але яны ў Высокім ўжо не пражываюць, а можа ўжо і памерлі. Усё тое, што было ў касцёле, або разрабавалі, або выкінулі на сметнік. Некалі ў аднаго чалавека ў хаце ўбачыў ікону Чанстахоўскай Божай Маці. Гаспадар сказаў, што знайшоў яе на сметніку.

Вернемся зноў у Кодэнь, дзе законным спадчынікам быў дваюрадны брат Паўла Францішка Ян Фрэдэрык Сапега (1680-1751 гг.). Яго папярэднікі не займаліся гаспадарчай дзейнасцю, і Яну Фрэдэрыку спатрэбілася больш за дзесяць гадоў, каб падняць эканоміку сваіх маенткаў. Адначасова ен займаецца пісьменніцкай працай –піша гістарычныя і мастацкія творы, вершы на лацінскай і польскай мовах, робіць пераклады з французскай. Зацікаўленасць яго літаратурай была вынікам фундаментальнай адукацыі, атрыманай у навучальных установах Брэста, Любліна, Варшавы, затым Германіі, Англіі,Францыі, Галандыі. Ян Фрэдэрык стварае цудоўную бібліятэку (кодэньскую). У1733 г. яна налічвала 1130 тамоў, сярод якіх была значная колькасць эльзевіраў (ад прозвішча сям'і галандскіх друкароў і кнігавыдаўцоў XVI-XVII ст.ст.-Эльзевіер). Увесь кнігазбор упрыгожвалі экслібрысы ўладальніка, выкананыя вядомым (таксама галандцкім) граверам і ілюстратарам Янам Мыліусам. Пасля Кодэньская бібліятэка, павялічаная да 4 тысяч тамоў, была перададзена адным з нашчадкаў Яна Фрэдэрыка Варшаўскаму Таварыству Прыяцеляў Навук.

І яшчэ адным у памяці цяпер жывучых слаўны Ян Фрэдэрык. Гэта па яго ініцыятыве ў Кодэні была створана партрэтная галерэя – генеалогія рода Сапегаў, размешчаная ў адной з капліц касцела св.Ганны. Невядомыя мастакі напісалі маслам на палатне ў натуральную велічыню 76 партрэтаў да пояса людзей роду Сапегаў ад іх пратапласта Івана да канца XVIII ст. з даволі доўгімі суправаджальнымі надпісамі на лацінскай мове.

У другой палове XIX ст. Юзэф Лоскі выканаў мініяцюрныя дублікаты ўсей Кодэньскай галерэі. Ен жа ў "Бібліятэцы Варшаўскай" у 1856 г. пісаў, што Ян Фрэдэрык "узвеў каля 1720 г. гэты помнік (гаворка ідзе аб галерэі – Г.М.) усяму свайму роду".

Калі касцел св. Ганны ў 1875 г. быў пераасвячаны ў царкву, то Сапегі генеалагічную партрэтную галерэю свайго роду вывезлі з Кодэня. Цяпер некаторыя з гэтых партрэтаў знаходзяцца ў запасніках музея ў Пярэмышлі.

Ян Фрэдэрык ужо ў маладыя гады ўвайшоў у палітыку – стаў старастам Берасцейскім. Гэта была, так бы мовіць, дробная палітыка, і ен больш увагі надаваў культуры і гаспадарчай дзейнасці ў сваіх маентках. Аднак ва ўзросце 55 гадоў пагружаецца ў высокую палітыку, стаўшы канцлерам ВКЛ. Больш бываў у Варшаве, пабудаваў там палац, адышоў ад гаспадарчых спраў, але, нягледзячы на дзяржаўную дзейнасць, працягваў займацца літаратурнай працай. Ян Фрэдэрык застаўся ў гісторыі чалавекам вялікай духоўнай культуры і значных дасягненняў у ей. Памер багатым, але бяздзетным. На яго багацце квапілася цэлая група нашчадкаў. У апошнія дні жыцця яны так яму надакучылі, што ен папросту ўцек з Кодэня ў Лысаводы. Знаходзячыся на Валыні, закончыў свой жыццевы шлях.

Яго галоўным спадчыннікам стаў дальні сваяк з кодэньскай галіны, ваяводзіч мсціслаўскі Ян Сапега (1732 – 1757). Гэты малады чалавек, палкоўнік каралеўскага рэгімента, часцей бываў за граніцай і ў Варшаве, чым у Кодэні. У 1756 годзе ен жэніцца з сястрою гетмана Францішка Ксаверыя Браніцкага Эльжбэтаю. Праз год Ян памірае. Перад смерцю прадае кодэньскія маенткі Яну Ежэму Флемінгу. Маладая жонка Яна Сапегі нядоўга гаравала, закруцілася пры каралеўскім двары і стала каханкай Станіслава Аўгуста. Час ляцеў. Узрост

аказаўся ворагам каралеўскай каханкі. Прыйшоў час падумаць пра свайго адзінага сына Казіміра. У 1775 годзе яна купляе для сына кодэньскія маенткі ад нашчадка Яна Ежэга Флемінга – Адама Чартарыскага. З гэтага моманту Эльжбэта часта бывае ў Кодэні. У 1800 годзе яна памірае. Хаваюць яе ў сямейным склепе ў тым жа Кодэні. Пасля смерці Эльжбэты Кодэньскі замак перастаў быць рэзідэнцыяй Сапегаў. У1869 годзе Кодэнь траціць гарадскія правы і, як Воўчын, становіцца звычайнай вескай.

У наш час ад замкавага комплексу захаваліся толькі царква святога Духа і касцел святой Ганны. Абедзве святыні аднесены да ўнікальных помнікаў архітэктуры першай групы.

У сярэдзіне гэтай царквы звяртае на сябе ўвагу надмагільная табліца роданачальніка кодэньскай галіны Сапегаў – Івана, а таксама ікона Хрыста Пантакратара (17 стагоддзе). Ікона напісана маслам на дошцы.

У касцеле святой Ганны знаходзіцца славутая ікона Кодэньскай Божай Маці.

ЯНУВ ПАДЛЯСКІ. Спачатку мясцовасць называлася Порхавам. У 1423 годзе Вітаўт падараваў біскупству Луцкаму. Пасля таго, як татары ў 1465 годзе спалілі Луцк, тамашні біскуп Ян Ласовіч пераехаў у Порхаў. У тым жа прывілеем Казіміра Ягелончыка веска стала горадам, якому Ласовіч даў новую назву ад свайго імені – Янув. У 1570 годзе ен налічваў 5 тысяч насельніцтва. Горад меў багатыя цэхі гарбарнікаў, шаўцоў, сталяроў. Шведская вайна, названая «швэдскім патопам», прывяла да разбурэння Янува. У 1714 – 1735 гадах тут быў пабудаваны касцел святой Тройцы і побач будынак духоўнай семінарыі; у канцы 18 стагоддзя – касцел Яна Хрысціцеля, адбудаваны замак. У 1818 – 1867 гадах і 1918 –1924 гадах Янув – рэзідэнцыя дыяцэзіі ( епархіі). Але,нягледзячы на гэта, горад не змог дасягнуць папярэдняга ўзроўню і значнасці.

Самым вядомым з луцкіх біскупаў быў Адам Нарушэвіч, выдатны паэт, пісьменнік, гісторык, які напісаў грунтоўную «Гісторыю народа польскага», фаварыт Станіслава Аўгуста. Перажыўшы падзенне Польшчы і ўпаўшы ў дэпрэсію, адышоў ад прытворнага жыцця і пасяліўся ў адзіноце ў Януве, у біскупскім палацы. Не дажыўшы два гады да смерці свайго заступніка – Станіслава Аўгуста – памер у 1796 і пахаваны ў крыпце Януўскага касцела св. Тройцы. Цяпер у касцеле знаходзіцца помнік Нарушэвічу з белага мармуру, выкананы ў 1861г. Тамашом Оскарам Сасноўскім. У тым жа касцеле можна ўбачыць дванаццаць васьмістаронніх палотнаў Францішка Смуглевіча, таго самага, які напісаў у Воўчыне іконы св. Тройцы, Благавешчання Прысвятой Багародзіцы, св. Станіслава, біскупа, а таксама эпітафію біскупу Кабельскаму (асвяціў у Воўчыне касцел св. Тройцы) з чорнага мармуру з яго партрэтам на меднай таблічцы.

У XVIII ст. у Януве існаваў рачны порт, якім у сваім гандлі сельскагаспадарчай прадукцыяй з Гданьскам карысталіся Патоцкія і Чартарыскія.

У рэшце рэшт нельга не расказаць і аб конным заводзе, які, відаць, быў працягам справы развядзення пародзістых коней Станіславам (бацькам) Панятоўскім у Воўчыне.

У 1817 г. з дазволу расійскага цара Аляксандра і ў фальварку Выгода каля Янува ствараецца першы на польскіх землях дзяржаўны конны завод. Першым

яго дырэктарам стаў вялікі канюшы каронны Аляксандр Патоцкі. Першых коней прывозілі з царскіх расійскіх заводаў. Потым сталі з'яўляцца коні англійскія, арабскія, дацкія, каўказскія, мекленбургскія, неапалітанскія, персідскія і турэцкія, але без сістэмнага падбору.

У 1822 г. у Януве з'яўляецца прыгожы конь чыстай арабскай пароды Альбаджанак. Яго прадаў вядомы авантурыст і глобтротэр, незвычайны коннік, аматар і знаток коней, легендарны эмір Вацлаў Ржэвускі па мянушцы Тадж уль-Фехр - герой "Фарыса" А Міцкевіча. У 1825 г. завод купіў у Англіі некалькі поўнакровак, сярод якіх Соркерэр. Патомства Альбаджанка і Соркерэра аказалася вельмі каштоўным.

"Пасля жанчын немажліва ўбачыць больш прыгожых стварэнняў" - так пісаў аб януўскіх конях Юльян Урсын Нямцэвіч.

Па праекце Хэнрыка Марконі будуюцца захаваўшыеся да нашага часу цагляныя канюшні – "галоўная" ў 1842 г. і "часавая" ў 1848 г.

Адразу пасля першай сусветнай вайны коней януўскага конезавода эвакуіравалі ў глыб Расіі, дзе яны прапалі ў агні расійскага бунту і грамадзянскай вайны.

Пасля 1920 г. развядзенне арабскіх коней прыйшлося пачынаць з нуля. Бацькам гэтай цяжкай справы быў фанат арабскага каняводства Анджэй Кжышталовіч. З ліквідаванага конезавода Дзедушыцкіх (у Езуполе) у Януве апынуліся кабыліцы чыстай крыві- Газэла, Млеха, Пампонія, Зулейма (бралі пачатак па простай жаночай лініі ад надзвычайных матак з рода Кухаілян, прывезеных з Аравіі ў 1845 г. Юліушам Дзедушыцкім). У 1931 г. у Аравіі куплены Кухаілян Хаіфі, сын якога Афір быў найлепшым жарабцом чыстай крыві. Ен у 1938 г. даў жыцце чатыром вядомым пазней "арабам"-Вітражу, Вялікаму Шлему, Віцязю, Вырвідубу.

Грымнула другая сусветная вайна, якая моцна патрасла януўскі конезавод, распарушыўшы яго племянны статак. Першыя два "арабы" вярнуліся ў родныя месцы толькі ў 1946 г. Вырвідуб застаўся ў Германіі, а Віцязь - у ЗША. Тым не менш, Вітраж і Вялікі Шлем дапамаглі ўзнавіць арабскае коневодства ў Януве Падляскім. Патомак астатняга ў трэцім пакаленні Артэмор, народжаны ў 1969 г. англаараб разам са сваім коннікам Янам Кавальчыкам на Алімпійскіх гульнях у Маскве ў 1980г. атрымаў залаты медаль.

Вартасць януўскага чыстапароднага арабскага каня дасягае значных сум, перавышаючых сотні тысяч даляраў. Януўскі конезавод уваходзіць паўнапраўным сябрам у створаную ў 1972г. у Сэвільі «Уорлд Арабіян Хорсе Арганізацыен».

Штогод, пачынаючы з 1975г., у Януве Падляскім сустракаюцца на летніх пленэрах мастакі і фатографы з усей Польшчы, каб яшчэ і яшчэ стварыць вобраз высокароднай жывёліны. Асаблівай схільнасцю да малявання на сваіх палотнах каня адрозніваецца вучань Войцаха Косака Уладыслаў Баравіцкі. Галерэю «Конь у мастацтве» можна паглядзець у музеі Бялай Падляскі.

РАДЗЫНЬ ПАДЛЯСКІ. Не ўдаючыся ў падрабязныя пошукі першага засялення гэтай мясцовасці, звернем увагу на адзін дакумент. У 1486 г. Казімір Ягелончык выдаў люблінскаму падкаморыю з Астрова Гроту прывілей на будаўніцтва на месцы паселішча Козі рынак горада Радзынь. Доўгі час паміж

арандатарамі горада і прылягаючых весак Барталамеем Казаноўскім і мяшчанамі адбываліся сутычкі. Прычынай раздору былі зямельныя палеткі. Пазней яны мелі месца паміж Казаноўскім і каралевай Бонай.

Усе спрэчкі скончыліся ў 1540г., калі ўладальнікам горада стаў вялікі падкаморый каронны Мікалай Мнішах – (у рускай транскрыпцыі гэта прозвішча чыталася і пісалася – Мнішек – Г.М). Мнішхі валодалі горадам больш за сто гадоў. Унучка Мікалая Марына праславілася ўдзелам у вядомай палітычнай авантуры: выйшла спачатку замуж за Дзмітрыя Самазванца і каранавалася на царыцу Маскоўскую, а пасля яго забойства ізноў выйшла замуж паўторна за Дзмітрыя Самазванца II. Чым гэта закончылася – агульнавядома.

Мнішкі ў 1641г. будуюць касцёл св. Тройцы. Будаўніцтва храма і яго ўпрыгожванне здзейсніў вядучы замойскі муляр Ян Вольф. У паўночнай капліцы касцёла знаходзіцца велічны саркафаг Мікалая і яго жонкі Сафіі Мнішхаў, выкананы з чырвонага мармуру з багатай звярынай і раслiннай арнаментацыяй, пэўна, архітэктарам і скульптарам: італьянцам Санці Гучы – прыдворным скульптарам Ганны Ягелонкі.

Наступным уладальнікам Радзыня ў 1741г. стаў Еўстахі Патоцкі каронны чэснік, генерал літоўскай артылерыі. Зрабіўшы бліскучую палітычную і ваенную кар'еру, ён на месцы балога палаца-замкавага комплексу пажадаў мець уражлівую рэзідэнцыю. З гэтай мэтай запрасіў для будаўніцтва барокавага палацавага комплексу славутага архітэктара Якуба Фантану з сябрамі: Юзэфа ля Пэна, Багуміла Плерша, Міхала Долінгера, Яна Хрысціяна Рэдлера, чые залатыя рукі былі прыкладзены да будаўніцтва касцёла. Палац атрымаўся велічны, дзівосна прыгожы, адным з лепшых палацаў у 18 стагоддзі. У палацавым коплексе меўся шэраг іншых пабудоў, сярод якіх аранжарэя з тэатральнай залай. Палац акружаў парк у французскім стылі з англійскай праменадай, возерам, каналам, якія будавалі тыя ж майстры сваей справай, што і ў Воўчыне: Ян Давід Кнакфус і П'ер Рыко дэ Тырэкайле.

Незадоўга перад смерцю Еўстахія Патоцкага ў 1768г., яго дачка Уршуля Цэцылія і мечнік літоўскі, князь Геранім Януш Сангушка на сваім вяселлі прымалі ў Радзыньскай рэзідэнцыі ўсіх асоб правячай кагорты таго часу ў Рэчы Паспалітай.

У канцы 18 ст. радзыньскімі маёнткамі ўладараць Сапегі. Александр Сапега лічыўся паклоннікам мастацтва і навук. Палацавым капельмейстарам пры ім быў нехта Ліпіньскі, у якога ў 1790г. нарадзіўся сын, пазнеў скрыпач і кампазітар еўрапейскага кшталту – Кароль Юзэф. Ён двойчы ўдзельнічаў у музыкальным турніры з маэстра Паганіні, спаборнічаючы з ім у віртуознасці. Атрымаў тытул: «Першы скрыпач імператара всея Русі пры двары каралеўскага – польскім». На працягу 20 гадоў быў канцэрт – майстрам опернага аркестра ў Дрэздэне.

З 1831г. ( больш як сто гадоў) радзыньскія маёнткі з'яўляліся ўласнасцю мазаўшанскіх нуворышаў Корвін-Шлюбоўскіх. Падчас першай сусветнай вайны палац быў значна пашкоджаны раскватараванымі ў ім войскамі. Адзін з Шлюбоўскіх – Браніслаў – у 1920г. бязвыплатна перадае палацавы комплекс дзяржаве. Ці то была ахвяра, ці халодны разлік?

МЕНДЗЫЖЭЦ ПАДЛЯСКІ. Уладыслаў Ягела ў 1390г. надзяляе Аўраама Хамца вёскамі Медзыжэц і Стоўпна. Хаця дакумент не захаваўся, вядома, што горад заснаваў у першай палове XVст. стараста берасцейскі Ян Насутовіч. У акце касцёла св. Мікалая з 1477г. Медзыжэц упамянуты як горад «з даўніх часоў пабудаваны». Пасля Хамцоў і Насутовічаў вышыкаваўся цэлы шэраг шырока вядомых уладальнікаў горада: Забжэзінскія, Сапегі, Збаражскія, Тэнчыньскія, Апаліньскія, Любамірскія, Сяняўскія, Дэнхофы, Чартарыскія, Патоцкія. Вось іх колькі было.

Мендзыжэц у адрозненне ад Радзыня і Седльцаў развіваўся раўнамерна і паслядоўна, без спадаў. Горад размяшчаўся пры стоку рэчак Паўднёвая Кшна, Паўночная Кшна, Пішчанка, на памежжы Кароны з Літвой пры ажыўленым гандлевым шляху з Лукава ў Брэст. Усё гэта прывяло да таго, што ў XVI ст. Мендзыжэц стаў багатым асяродкам палякаў, русінаў і прыбываўшых яўрэяў. Канечне, ваенныя здарэнні другой паловы XVII і XVIII стагоддзяў толькі прытармазілі, але не пазбавілі горад далейшага развіцця.

З 1731 па 1844гг. ён належыць паступова Аўгусту, Адаму і Канстанціну Чартырыскім. Яны прыклалі шмат сродкаў для таго, каб зрабіць горад найбольшым гарадскім цэнтрам Падлясся. Як ужо ўпаміналася, тут быў узведзены ў 1477г. касцёл св. Мікалая, вытрыманы ў класічным стылі. Спалены ў сярэдзіне XVIII ст., ён быў хутка адбудаваны Адамам Чартарыскім, які больш часу знаходзіўся ў Варшаве і Пулавах.

Уяўляе цікавасць ікона св. Мікалая, які дае пасаг тром дзяўчатам. Ікону, мабыць, пісаў той самы Францішак Смуглевіч, які пакінуў след і ў Воўчыне. Неардынарны мастак, іканапісец, адзін з раданачальнікаў гістарычнага жывапісу, ён шмат зрабіў для польскай школы мастацтва. З-пад абраза св. Мікалая вырысоўваецца партрэт сям`і Чартарыскіх. Адам – св. Мікалай у адзенні біскупа. Ізабэла апякунша, спадарожная жанчына, Марыя, Тэрэза, Сафія – тры дзяўчыны ў сукенках ампір.

Мендзыжэц вызначаўся сваімі вучонымі. Яны былі ксяндзамі. Ян Брожэк служыў у 1636-1647г. г. у касцеле св. Мікалая. Быў каштоўным польскім матэматыкам тых часоў, які ўвеў у школьныя падручнікі навінку- толькі што адкрытыя лагарыфмы. Пераехаў у Кракаў. Закончыў зямны шлях дырэктарам Кракаўскай Акадэміі. У канцы XVIII ст. тут служыў Гжэгаж Пірамовіч, сакратар Камісіі Народнай Адукацыі (Edukacji Narodowej)–флагман польскай адукацыі. Пахаваны ў Курове.У адной са сваіх прац ен прапаноўваў настаўнікам: «.Зрабіце добрымі метадамі, каб вучні любілі навукі і настаўніка, каб ім было мілай справай ісці ў школу». Адам Кукель быў чалавекам выдатна адукаваным у дакладных навуках: фізіка, матэматыка, картаграфія. Пачынаў сваю кар'еру ў часы Станіслава Аўгуста пры каралеўскім двары. На фасадзе касцёла св. Мікалая знаходзіцца сціплая таблічка, якая апавяшчае, што ў 1802-1831гг. пробашчам (настаяцелем) мендзыжэцкім быў Адам Кукель.

У 1828г. Юльян Урсын Нямцэвіч пісаў: «У маладосці часта наведваў Мендзыжэц. Быў там у мінулым прыгожы драўляны палац, у вялікай зале якога былі партрэты манахаў, славутых людзей, пачынаючы з канца XVII ст. Шкада,

што прапалі. Цяпер палац цагляны, у 1812 г. ворагам разрабаваны і разбураны чакае дапамогі.

У 1844 г. мендзыжэцкія маёнткі за мільён злотых купілі Аўгуст і Аляксандара Патоцкія. Пачалі ўзводзіць уласны палац і гаспадарчыя пабудовы паблізу рэзідэнцыі Чартарыскіх. Палац па праекту італьянскага архітэктара Францішка Марыі Ланці пабудаваны ў 1852 г. У 1918 г. спалены немцамі і ў давяршэнне разбураны падчас другой сусветнай вайны. Пасля вайны перабудаваны нанова.

ГРАМЯЧА. Першымі ўладальнікамі ў XVст. былі Іллінічы, атрымаўшыя Грамячу па даравальнаму запісу Вялікага князя Літоўскага: «Яцку Іллінічу ў Стародубе его отчина дедина да Грымячое з тыми людьми, што к тому слушаеть». У1612г. належыць Аляксандру Гасеўскаму. Потым належала розным уладальнікам, якія гаспадарылі ў Воўчыне. Вёска была фальваркам у Воўчынскім маёнтку, пакуль не перайшла да Віслоцкіх (1840г) Уласнасцю Адольфа Марціна Пузыны, сына Юзэфа, яна стала каля 1870г. Пузыны – княжацкі род, які вядзе сваю радаслоўную ад Рурыкавічаў, ад Васіля Глушчэнка, адной галіною якога стаў род Агіньскіх. У Метрыцы ВКЛ указваецца, што калі «вораг узяў Смаленск і іх маёнткі», тады кароль Зыгмунт І даў у 1516г. Івану Пузыне і яго сыну Васілю двор Носава ў Мельніцкім павеце. Пасля Адольфа Грамяча належала яго сыну Юзэфу Эдварду (1878 – 1949) (жанаты на Аляксандры Храпавіцкай), гісторыку, пісьменніку, паэту. Юзэф Эдвард вучыўся ў Фрыбурскім універсітэце, дзе атрымаў ступень доктара. Займаўся вывучэннем паходжання княжацкіх родаў, іх палітычнай кар'ерай у жыцці ВКЛ («Вялікае княства Літоўскае да Міндоўга»). Аўтар лірычных і сатырычных вершаў, паэм, гімнаў, паэтычных драм, аповесцяў, кнігі аб Марылі Радзевіч з Кобрыншчыны.

Пузыны пабудавалі ў Грамячы цагляны палацык (35х20). Ён аднапавярховы, дах чатырохскатны з люкарнамі. Парадны фасад упрыгожвае чатырохкалонны дарычаскі порцік з трохвугольным франтонам. Фасад мае багаты дэкор. Не менш прыгожы паркавы фасад будынка. Палацык стаіць у парку, непадалёку цячэ рака Пульва.

З гаспадарчых пабудоў захаваліся сыраварня (14х7), ляднік з камянёў (7х7), ад амбара (14х7), выкананага з колатых камянёў, засталіся толькі сцены, поўнасцю разбураны бровар.

Юзэф Эдвард прадаў зямлю каланістам у 1933г. і з’ехаў у Бераставіцу.

У палацыку да 1939г. была польская школа. Пасля вайны таксама была школа, але савецкая, потым быў піянерскі лагер. Пад апеку палацык бралі розныя арганізацыі. Цяпер пустуе. Што з ім будзе? Невядома. Можа стацца тое, што і з Троіцкім касцёлам.

БЯЛА ПАДЛЯСКА. Ляжыць над ракою Кшна. Цяпер гэта дарожны вузел. Насельніцтва 40 тысяч.

З нараджэннем горада – поўная няяснасць. Ёсць меркаванні, гіпотэзы. Калі верыць адной з іх, то заснавальнікам яго быў ваявода Троцкі Пётр Іванавіч Белы, рускі і праваслаўны. У той час Камянец-Літоўскі, як павет, знаходзіўся ў складзе Троцкага ваяводства.Гэта падзея адбылася ў сярэдзіне XV ст. Паселішча названа ў гонар заснавальніка – Белая. Пазней яно перайшло да Іллінічаў.

Згодна запісаў у старой земскай кнізе ад 2 мая 1569г., астатні з Іллінічаў Ежы Шчэнсновіч, ваявода Брэст – Літоўскі, падараваў маёнтак Белая Мікалаю Кжыжштафу, празванаму Сіроткай, заснавальніку галіны Радзвілаў у Нясвіжы. З таго часу наступныя 250 гадоў Радзівілы ўладарылі ў Белай. Яшчэ ў пачатку XIX ст. яе звалі Белая Княжацкая (ALBA Aukalis) або Радзівілаўскай.

Цэзар Карл V, жадаючы знайсці сабе ў Рэчы Паспалітай паплечнікаў, польскім і літоўкім панам шчодра раздаваў тытулы князеў і графаў. Такім чынам, Радзівіл Чорны, бацька Мікалая Сіроткі, атрымаў у 1547г. тытул князя (“princeps sakri Romani Imperi”). Тытул графа Радзівілы прысвоілі сабе самі.

Самы стары храм паходзіць з 1572 г. Ен узведзены падчас рэфармацыі як арыянскі збор. Радзівіл Сіротка, наняўшы Андрыса Муляра, павялічыў святыню і перадаў каталікам. Наступныя Радзівілы прыбудавалі дзве капліцы. Але першапачатковая пабудова страціла свой стыль.

Па даручэнні Аляксандра Людвіка Радзівіла, сына Сіроткі, у 1622 г. люблінскі муляр Павал Мурын запраектаваў і стаў ставіць магнацкую рэзідэнцыю ў Белай, на фундаментах старога замка Іллінічаў. Сядзібу новыя ўладальнікі ўзводзілі і разбудоўвалі праз усё XVII ст., але і ў наступным стагоддзі Радзівілы рэстаўрыравалі і ўпрыгожвалі свой замак, які сведчыў аб іх магутнасці.

Сярод будаўнікоў і дэкаратараў былі выключна польскія рамеснікі і мастакі: Стэфан Фларыян Пашкоўскі, Анджэй Юзэфат Езерніцкі, Якуб Корвін Паплаўскі, Марцін Вісьнеўскі, Цырыль Маляўскі, Аляксандр Навіцкі, Хэнрык Тыц, што сведчыла не столькі аб патрыятызме Радзівілаў, колькі аб мажлівасцях краявых муляраў і мастакоў XVII і XVIII стагоддзяў.

Замак Радзівілаў меў магутныя абаронныя збудаванні. Яны ў паўднёвым баку прылягалі да Бельскай пушчы, ператворанай у звярынец, у якім для ўцехі гаспадароў і гасцей гадавалі розную звярыну: зуброў, ласёў, мядзведзяў, рысёў, ваўкоў, аленяў, сарн, зайцоў, фазанаў. З паўночнага боку на шчыце вартавой вежы развявалася харугва з чорным радавым арлом, а вялікі гадзіннік вызвоньваў Радзівілам квадрансы і гадзіны.

Па грунтоўным рамонце рызідэнцыі Караль Станіслаў (аб ім мова была вышэй) і яго бацька Міхал Казімір Рыбенька ў 1761 годзе прымаў іх знакамітае таварыства: Чартарыскіх, Панятоўскіх, Любамірскіх, Сапегаў, Агіньскіх.

Сярод Радзівілаў, якія рабілі добрыя справы, быў такі Геранім Фларыян, па мянушцы Акрутны князь. Яго крэда было наступнае: «нашто мужыку навука, якую ён, хамскі чалавек, на добрую справу не ўжыве, няхай хам вучыцца таго ж рамясла, што і бацька.» Вытвараў такія штукі – ажно страх бярэ. Аднойчы, у лесе каля смалярні, ён сустрэў яўрэя, загадаў яму распрануцца, выкачаў у смале і пер’ях, загадаў залезці на дрэва і кукаваць, а затым застрэліў яго, як птушку. Германім Фларыян Радзівіл у сваім замку і маёнтках утрымліваў асабістую армію, у якой толькі пяхота налічвала 6 тысяч ваяроў. Сродкі на каралеўскую армію не хацеў плаціць. Ён гаварыў: «Маю войска лепшае няжэлі Рэч Паспалітая, сваімі ваярамі гатоў служыць Айчыне.» І разам з тым ён вучыўся за граніцай, бегла валодаў нямецкай мовай, заснаваў тэатр, капэлу, акцерска – балетную школу, а ў палацавай мастацкай галерэі меў 600 палотнаў.

Акрутны князь трымаў свае ахвяры ў падзямеллях, жорстка абыходзіўся з імі, любіў слухаць стогны вязняў і пры гэтым казаў, што гэта найлепшыя спевакі ў яго двары. Аказваецца, што найгоршы дэспат бывае такі, які злегку адукаваны.

Лепш адзначыліся продкі Гераніма Фларыяна. Яго бабка Катажына (з Сабескіх) была сястрой караля Яна III. Добрай і справядлівай. Яна ў памяць перамогі брата пад Венай (над туркамі) распрадзілася ў касцёле святой Ганны прымацаваць унізе крыжоў турэцкія паўмесяцы, якія сімвалізавалі перамогу хрысціянства над магаметанствам. У 1688 годзе яна пабудавала касцёл святога Антонія з кляштарам, якія запраектаваў архітэктар Аўгустын Лоччы.

Сын Катажыны, бацька Акрутнага князя Караль Станіслаў, па мянушцы Справядлівы, залажыў інстытут Паняў Міласэрнасці, або дзіцячы прытулак (1716г.), які ў 1884 г. быў ператвораны ў шпіталь Караля Барамеуша.

У другой палове XXII ст. Радзівілы ўзвялі касцел і кляштар базыліянскі, у будове якіх вызначыліся муляры і раменікі: Антоній Лінчэўскі, Антоній Набжыцкі, Францішак Цыбульскі, цясляр Гальда…

З пачаткам XIX ст. занядбаны замак атрымаў Дамінік Радзівіл, але неўзабаве ен памер ад ран, атрыманых у маскоўскай кампаніі 1812 г. Яго дачка Стэфанія выйшла замуж за князя Людвіка Вітгенштайна. Замак перастаў быць уласнасцю Радзівілаў.

Бяла ў сэнсе прагрэсу культуры і грамадзянскай думкі развівалася па-за Радзівіламі. Яны ў параўнанні з Чартарыскімі або Замойскімі, Радзівілы не мелі мецэнатаўскіх аспірацый у шырокім сэнсе гэтага слова, не ўдзельнічалі ў развіцці грамадзянскай думкі.

За выключэннем Катажыны з Сабескіх, якая не шкадавала сродкаў на адукацыю, Радзівілы абыякава ставіліся да мясцовай сярэдняй школы, адкрытай у 1628 г. коштам у 50 тысяч польскіх злотых тутэйшым пробашчам і канонікам Кжыштафам Вільскім-Цыбаровічам. Кошт школы склаў 50 тысяч польскіх злотых. Яе наведвалі дзеці ўбогай шляхты, мяшчанства, нават сялянаў. Школа выконвала важную ролю ў грамадстве. Ад 1633г. афіцыйна называлася калоніяй Кракаўскай Акадэміі, адкуль у Бялу накіроўваліся сродкі і настаўнікі. Была саюзнікам Ягелонскай «Alma Mater» у канфліктах з элітарнымі калегіямі іезуітаў.

Філія Кракаўскай Акадэміі мела невялікі курс навучальных дысцыплін, але яе навырост называлі Бяльскай Акадэміяй, а горад - «Атэнамі Падляссся». Праграма яе неўзабаве пашыралася. У часы «Адукацыі Нарадовэй» яна мела «вялікую рэпутацыю» і падпарадкоўвалася ад 1777 года Літоўскай школе ў Вільні. Пабудаваная Цыбаровічамі яшчэ ў XVII ст., яна стаіць да нашага часу. Школа выхавала шмат знакамітых людзей, пісьменнікаў: Францішак Вэнжык, Раман Зморскі, Юліян Барташэвіч, Юзэф Крашэўскі…

Розны ў яе быў статус. Да першай сусветнай вайны там знаходзіліся руская Бяльская настаўніцкая семінарыя. Дарэчы, яе скончылі мой тата, яго старэйшы брат Міхаіл, камянецкі святар і паэт Уладзімір Філосафаў. З 1919г. яна стала дзяржаўнай польскай гімназіяй імя Юзэфа Крашэўскага.

# 8. ЗАНЯПАД ВОЎЧЫНА

Пасля смерці Міхала Фрэдэрыка Чартарыскага ў 1775 г. пачынаецца няўхільны заняпад гаспадарчай дзейнасці ў навакольных фальварках і культурнага жыцця ў Воўчыне.

Яго новы нашчадак і ўладальнік, пляменнік Міхала Чартарыскага, валодаў велізарным багаццем, да якога дадаў значную колькасць рэзідэнцый, што дасталіся ў спадчыну ад дзядзькі. З імем Адама Казіміра звязана будаўніцтва цэркваў у Крынках (каля Воўчына) у 1767г. св. Мікалаеўскай і св. Прэабражэнскай у в. Хмелева, якая была прыпісана да Камянецкага благачыння ў 1774 г. Апошняя ў 1839г. капітальна адрамантавана.

Ён рэдка, звычайна летам, бываў у Воўчыне, а з часам, канчаткова асеў у Пулавах на Любліншчыне, у рэзідэнцыі, пабудаванай вядомым архітэктарам Хрысціянам Пятром Айгнэрам. На пераломе 70-х і 80-х гадоў XVIII ст. сюды не раз прыязджаў будучы міністр замежных спраў Расіі Адам Ежы Чартарыскі, памяць якога захавала добрыя ўспаміны аб Воўчыне.

Адам Ежы нарадзіўся ў Варшаве ў сям'і Казіміра. Бацька імкнуўся даць сынам (Адаму і Канстанціну) добрую адукацыю, запрасіў вядомых педагогаў Еўропы. Сыны працягвалі вучобу за мяжой. Адам як мае быць вывучыў дзяржаўнае заканадаўства.Удзел братоў у ваенных дзеяннях супраць Расіі ў 1792 г прымусіў іх эмігрыраваць у Англію. Пачалося паўстанне Касцюшкі, і Адам вырашыў вярнуцца на радзіму, але яго арыштавалі аўстрыйскія ўлады. Пасля правалу паўстання маенткі Чартарыскіх, як і другіх магнатаў, былі канфіскаваны. Аднак імператрыца Кацярына II паабяцала вярнуць іх, калі Адам і Канстанцін вернуцца з эміграцыі ў Пецярбург у якасці заложнікаў.

У Пецярбургу Адам зблізіўся з будучым імператарам Аляксандрам I. Гэта выклікала незадавальненне яго бацькі, Паўла I, і ён адправіў Адама паслом у Сардынію. Пасля смерці бацькі Аляксандр I вярнуў Адама Чартарыскага ў Пецярбург для работы ў «тайным камітэце», з якім імператар радзіўся наконт мяркуемых пераўтварэнняў. У1803г. Аляксандр I назначыў Адама Чартарыскага папячыцелем Віленскай вучэбнай акругі і памочнікам дзяржаўнага канцлера С. Варанцова. Цэнтр кіравання акругай знаходзіўся ў Віленскім універсітэце, дзейнасць якога дала магутны штуршок развіццю адукацыі ў Беларусі і часткі Украіны.

Праз год Адам Чартарыскі - міністр замежных спраў Рассіі, з 1805г.- член Дзяржаўнага Савета і сенатар. Гэта ён заключыў саюз Рассіі з Англіяй і Аўстрыяй, прывёў да думкі аб неабходнасці вайны з Напалеонам, распрацаваў план пераўтварэння Еўропы. Гэты план прадугледжваў аднаўленне Польска-Літоўскай дзяржавы згодна з дынастычнай уніяй з Расіяй у межах 1772 г.

Як бачым, і ў мінулым стагоддзі імкнуліся перабудаваць Еўропу, як і ў наш час. Толькі цяпер – з большым поспехам.

Пасля таго, як руская армія пацярпела паражэнне пад Аўстэрліцам, адносіны Аляксандра I да Адама Ежэго Чартарыскага сталі больш халоднымі. А пасля следства па справах вучэбнай акругі, падчас якога была ўстаноўлена ўзмоцненая паланізацыя моладзі, ён зусім страціў давер Аляксандра. У 1807г. ён пакідае пост міністра замежных спраў, але застаецца ў Пецярбургу, у 1810г. пераязджае ў

Вільню і ўладкоўваецца ў Віленскай вучэбнай акрузе. Падтрымлівае добрыя адносіны з імператарам. Аляксандр 1 яшчэ раз звярнуўся да яго па дапамогу падчас Венскага Кангрэсу ў 1814-1815гг. І гэта, бадай, была яго апошняя дзейнасць на расійскай палітычнай арэне. Пасля следства М. Навасільцава па справах акругі Адам Ежы падаў у адстаўку з паста папячыцеля акругі вучэбнай і накіраваўся ў сваю рэзідэнцыю ў Пулавах, дзе заняўся навукай і літаратурай. Ен усе свае свядомае жыцце збіраў рэдкія кнігі, рукапісы, папаўняў пулаўскую бібліятэку. Да 1824 г.яна налічвала 40 тысяч кніг і 2 тысячы рукапісаў. Адам Чартарыскі быў неўтаймаваным бібліяфілам: адшукваў старажытныя кнігі, акты ў манастырах, архівах; прыдбаў бібліятэку саксонскага пасла ў Пецярбургу; купіў у Стакгольмскай каралеўскай бібліятэцы і універсітэце г.Упсалы кнігі і рукапісы, што насілі прыкметы польскай тэматыкі.

Калі ў 1830г. пачалося паўстанне, яму прапанавалі пост прэзідэнта сената і кіраўніка Часовага ўрада Рэчы Паспалітай. Паўстанне не ўдалося, і Адам Чартарыскі са жніўня 1831г. апынуўся ў эміграцыі.У Парыжы ен стварыў цэнтр кансерватыўнай партыі эмігрантаў, якія бачылі ў ім будучага караля Польшчы.

У 1831 г. царскія ўлады перавезлі пулаўскую бібліятэку Чартарыскіх у Пецярбург. Мабыць, у гэты час быў канфіскаваны і замак, (ён належаў роду Чартарыскіх), у Рэчыцы Пацееўскай ля Камянца- Літоўскага. У 1838г. князь Адам стварае яшчэ адну бібліятэку эмігрантаў. Ён аўтар шэрагу твораў на польскай і французскай мовах: «Мемуары князя Адама Чартарыскага», «Жыццё Юльяна Урсына Нямцэвіча» (1860), патрыятычнай элегіі «Бард Польскі»(1840г) і інш.

Такім чынам, Воўчын стаў пасынкам для Адама Казіміра і Адама Ежага, сына Чартарыскіх, якія былі заняты вялікай палітыкай. Яны аддавалі перавагу Пулавам, а пазней сын - Парыжу.

Не спраўдзілася надзея бацькоў і на малодшага Канстанціна, у якім бачылі будучага гаспадара Воўчына. Той пераехаў у Вену, дзе акружыў сябе артыстамі, музыкантамі (кожны чацвер у яго іграў сам Ліст).А калі ўзніклі праблемы з фінансамі, ен у 1828г. прадаў Воўчын Караліне Пуслоўскай з Остык Нарбутаў. Аднак купленае не прыйшлося ей да спадобы і яна распарадзілася разабраць палац з ліственічнага дрэва і перавезці ў родны маентак Лявошкі (каля Пружан). Воўчынскія маенткі значна «пахудзелі». Павукі (Пужыцы), Паніква, Катэра і сам Воўчын перайшлі ва ўласнасць Браніслава і Канстанцыі Марачэўскіх. Што датычыць фальварка Грамяча, то ен апісаны вышэй у асобным падраздзеле. Толькі трэба дадаць, што палац афіцыйна належаў Пузынам да 1944г., у той час як зямля была прададзена ў даваенны перыяд.

Развязка ў Воўчыне адбылася ў канцы XIX ст. Дачка апошняга гаспадара воўчынскіх маенткаў Луцыяна Марачэўскага паставіла кропку: легкадумна ўлюбеная ў нейкага «галандранца», усе, што яшчэ заставалася ад Воўчына і яго багаццяў, прадала за бясцэнак яўрэю Брамсу. За парк Брамс заплаціў 1700 руб. і, як было згадана вышэй, высек яго і прадаў. Рэшткі фундамента палаца ацэнены ў 1000 руб., цэгла таксама была прададзена. Прададзены гаспадарчыя пабудовы. Неўзабаве знікла і ўязная брама. Засталіся да пары барокавы касцел і бібліятэка – архіў. Але і іх лес быў няпэўны.

Мінула слава Воўчына. Але чым далей ад тых часоў, тым усе больш гавораць аб Воўчыне, яго касцеле, рэзідэнцыі Панятоўскіх-Чартарыскіх, аб каралю, аб культурным жыцці ў воўчынскім двары… І будуць гаварыць яшчэ доўга.

## 9. ТРОІЦКІ КАСЦЁЛ

Царква, касцёл, кірха, збор, сінагога, мячэць – гэта месцы малітвы людзей розных канфесій. Іх адносіны да такога роду пабудоў суразмерны з уласнымі вераваннямі. Што ж тычыцца архітэктурнага рашэння гэтых месц, то найбольш удалыя рашэнні заўсёды захапляюць погляд чалавека незалежна ад канфесіянальнай прыналежнасці.

Стаўшы ўладальнікам Воўчына, каштэлян кракаўскі, ваявода мазавецкі, падскарбій ВКЛ. Станіслаў Целэк Панятоўскі ў 1729 г. пачаў будаўніцтва, а ў 1733 г. у асноўным завяршыў узвядзенне цаглянага касцёла св. Тройцы, Благавешчання Прасвятой Панны Марыі і св. Станіслава біскупа-мучаніка, заступніка Польшчы. Будаўніцтва вялі спецыяльна запрошаныя ваяводай італьянскія архітэктары. Яны пабудавалі вельмі прыгожы касцёл у стылі позняга барока, які меў выгляд ратонды з купалам і ў чымсьці напамінаў вядомы рымскі касцёл. Воўчынскі храм асвячаны біскупам берасцейска-луцкім Францішкам Кабельскім. Будынак меў форму васьмігранніка з шатровым дахам, над якім узвышаўся купал, а на ім – вежа-званіца з чатырма гадзіннікамі. Кожная грань фасада заканчвалася лучковым франтонам і статуяй евангеліста. Фасады акаймаваныя здвоенымі пілястрамі і ўпрыгожаны арнаментальнай лепкай. Як піша вядомы сучасны гісторык Юзэф Владыслаў Кабыляньскі, княжацкая ложа, у якую вялі драўляныя прыступкі, як бы падзяляла касцел на два ярусы. У арачных нішах першага яруса вокны лучковай формы, на другім – авальныя. Паміж ярусамі – фрыз з фігуркамі анёлаў. Вернікі збіраліся каля трох алтароў: вялікага (галоўнага), св. Тройцы, бакавых – Благавешчання Прасвятой Панны Марыі і св. Станіслава - мучаніка. Меліся 14 галосныя арганы.

Касцёл у свой час быў някепска аснашчаны. Інвентарны запіс 1788 г. гаворыць, што ў ім было святарскіх адзенняў, або арнатаў белых – 8, чырвоных – 7, зялёных – 3, фіялетавых – 3, чорных – 6, пакрывал – 7, альбы і абрусаў вялікая колькасць, харугві. Багатым быў касцёльны скарбец, у якім захоўваліся богаслужэбныя прадметы з чыстага срэбра – манстрацыя, 2 пацыфікалы, круцыфікс, вялікі крыж, 4 чашы, сасуд для святога Сакраманта, вялікая лямпа – трыбуляр, кадзіла, 26 падсвечнікаў, 5 гвязд, крапіла і інш. Таксама іконы і карціны рэлігійнага зместу, партрэты гаспадароў Воўчына пэндзля Францішка Смуглевіча і Шымана Чэховіча. На сценах віселі гербы Чартарыскіх.

У 1866г. касцел быў закрыты, а ў 1876 г. перароблены на царкву праваслаўную і пераасвяшчаны. Тады ж пабудавалі цагляную сцяну, што акружала царкву святой Тройцы. Касцельную маемасць, дакументы перавезлі ў суседнюю парафію – у Высокае-Літоўскае.

У 1918 годзе святыня вернута каталіцкай суполцы. Аднак многае з касцельнай маемасці пэўна засталося ў высокім касцеле (таксама св. Тройцы). У пасляваенныя гады, асабліва 60-я XIX ст., ен быў зруйнаваны і разрабаваны. Гэта быў час, калі ламалі цэрквы, касцелы, капліцы. Для гэтага выкарыстоўвалі

недальнабачную паслухмяную масу – навучэнцаў Высокаўскага сельскагаспадарчага вучылішча. Можна меркаваць, што частка касцельнай маемасці, не выключаючы і воўчынскай, была схавана вернікамі, частка разрабавана, а рэштка выкінута на сметнік. Цяпер высокаўскі касцел вернуты каталіцкай суполцы і амаль адноўлены.

Вернемся ў Воўчын. Як піша Вінцэнты Арцішэўскі ў 1939г. унутранасць касцела была ўжо не тая, што раней: «Сягоння акрамя голых сцен няма ні ікон, ні лавак, ні балдахіна, ні арганаў, застаўся толькі галоўны алтар, сціплая і ўбогая скарбніца. Не засталося слядоў ад папярэдніх званоў. Засталіся толькі па абодвух баках галоўнага алтара шчыты гербавыя з «Пагоняй» Чартарыскіх, даўніх уладароў Воўчына».

«На касцельным двары стаіць надмагільны помнік з жалезным крыжам і надпісам на польскай мове: «Юзэфу і Агнешцы Лабаноўскім – бацькам памершы у 1805 годзе.» (Хто яны – невядома – Г.М.) Два другія помнікі – гэта надмагіллі: Кіпрыяну Іванавічу Паўловічу, святару, памершаму ў 1886г., і жонцы святара Марыі Фролаўне Паўловіч – Багушэвіч, памерлай у 1889г.».

Трэба яшчэ ўспомніць пра мала вывучаны кляштар базыльянаў.

Напярэдадні другой сусветнай вайны пачаўся збор ахвяраванняў на рамонт касцела св. Тройцы, але вайна абарвала гэта добрапрыстойнае пачынанне.

Пасля вайны д’ябальская сіла прывяла да таго, што мясцовыя жыхары, салдаты з бліжняй заставы, старшыня мясцовага калгаса абясчэсцілі, абрабавалі касцел, выкарыстоўвалі то пад склад, то пад склад хімічных угнаенняў, ядахімікатаў. У 1970 г. абрушыўся дах, заходзілі ў беспрытульны касцел выпадковыя людзі, знаходзілі там месца вясковыя выпівохі. А ен працягваў разбурацца. Як яны маглі здзяйсняць гэта святатацтва?

Тое, што адбылося з касцелам св. Тройцы, - незалежна ад веравызнанняў, наўрад ці хто мяне пераканае ў супрацьлеглым. Гэта садзейнічае разуменню ўсяго трагізму разбурэнняў гістарычных помнікаў, што адбываліся не толькі на Камянеччыне.

Што датычыцца віноўнікаў вандалізму, то мала вымавіць, што гэта яны зрабілі. Так яны зрабілі, а таму павінны несці адказнасць перад законам, гісторыяй і Богам. Ну, а мы не пры чым? Мы не разбуралі, але былі сведкамі і не супрацьдзейнічалі багахульству, вандалізму. Значыць, і на нас есць доля віны. Няхай рассудзіць Бог.

## 10. Кароль: PRO et KONTRA

Як ужо ўпаміналася, толькі што нарадзіўшамуся дзіцяці вандроўны астролаг прадказаў кар’еру караля. Мама Канстанцыя прыняла блізка да сэрца прадказанне і, калі прыйшоў час, прыкладала ўсе намаганні, каб даць, па сваім разуменні, прыстойнае будучаму каралю выхаванне і адукацыю.

Маленькі Стась на поўныя грудзі дыхаў воўчынскім паветрам, гуляў у прыпалацавым парку, веў бесклапотнае жыццё ў родным Воўчыне. Тут ен ахопліваў розумам азы навук разам з братамі, сястрамі, сябрам дзяцінства Антоніем Тызенгаўзам у школе мамы Канстанцыі.

Усе праходзіць. Закончылася дзяцінства. Бывай, Воўчын. На парозе юнацтва Станіслаў Аўгуст пакінуў родны дом, каб прадоўжыць адукацыю. З гэтай мэтай едзе ў Францыю, пасля – ў Англію. У выніку здольны юнак атрымлівае добрую адукацыю. Што ж тычыцца выхавання, якое ен атрымаў, то некаторыя апаненты ставяць яго пад сумненне. Такога, як трэба, выхавання пад крылом мамы Канстанцыі, на жаль, Станіслаў Аўгуст не атрымаў. Яму ставілі ў віну, што не змог прыдбаць у спадчыну ад бацькоў нязломнасць у рашэннях, ваяўнічасць і мужнасць на палях бітвы, жалезную волю.

Жывучы ў Францыі,Станіслаў Аўгуст наведаў знакамітую варажбітку. Тая наваражыла яму польскую карону.У гэта ен сам паверыў. Аднак прадказанне не схіліла яго да сур'езнага ладу жыцця. Прыгожы і элегантны,ен карыстаўся поспехам у жанчын, не адмаўляючы ім ва ўзаемнасці. Але прадказаны тытул караля Рэчы Паспалітай абавязваў заняцца палітычнай дзейнасцю, у якой ен арыентаваўся на Чартарыскіх.

Яшчэ пры жыцці Аўгуста III, у 1752г.у 20-гадовым узросце Станіслаў Панятоўскі быў выбраны ў сейм ад Брэсцкага павета, дзе звярнуў увагу паслоў (дэпутатаў – Г.М.) сваім красамоўствам. У 1755 гадзе ён – стольнік Вялікага княства Літоўскага. Затым Станіслаў Аўгуст ступіў на дыпламатычную сцежку: спачатку ён – сакратар пасольства Рэчы Паспалітай у Пецярбургу ( з 1755 па 1756 г.г.), а ў перыяд з 1757 па 1758 г.г. – надзвычайны амбасадар (пасол – Г.М.) у Расіі. Менавіта ў гэты час Станіслаў блізка сышоўся з Кацярынай 11 і стаў адным з яе фаварытаў. Яна, маючы незвычайныя здольнасці да кахання, з лёгкасцю прываблівала каханкаў, і з такою лёгкасцю кідала іх. Венцаносная асоба, яна кіравалася ў сваіх паводзінах польскай прымаўкай: "Цо вольно ваяводзе, то не тобе, смродзе". Колькасць фаварытаў дасягала (згодна з "афіцыйным рэестрам") – 13 каханкаў, на самай справе, іх было намнога больш. Дзіўная мянтальнасць людзей: што не дазволена звычайнай жанчыне, тое дазволена царыцы. Ёй не толькі дазваляецца, але і даруецца здзейсненае, больш таго – узвышаецца, становячыся нормай.

Кацярына II, жанчына і імператрыца, была натурай складанай. Калі ўважліва прыглядзецца да яе дзеянняў, учынкаў, то выразна бачныя незвычайныя рысы. Двудушнасць: перапісвалася з Дзідро, Русо. І ў той жа час у прыватных гутарках кепска адзывалася аб Захадзе. Адмяніла пакаранне смерцю: хоць вешаць не перасталі. Лічыла, што лепш гаварыць аб рэформах і новых законах, чым праводзіць і прымаць іх. Маўляў, покі законы ўвойдуць у дзеянне і дойдуць да межаў дзяржавы, то законатворцы перамруць.

Эгаізм: калі яе брат напісаў, што жадае прыехаць у Расію, яна адказала: «Не надо, здесь немцев и так хватает».

Хітрасць: пакінула завяшчанне і мемуары аб сыне. Павел даведаўся, што ен не родны сын. Яна хітрыла.

Імператрыца, скончыўшы чарговы раман, хутка забывала аб папярэднім фаварыце. З'яўляўся новы. А яны? Кахалі яе? Мажліва, і кахалі, але не як жанчыну, а як імператрыцу. Хто цяпер ведае? Але вось цікавы штрых. З'яўляюцца ў царскі палац былыя фаварыты Грыгорый Арлоў, Грыгорый

Пацемкін і чуюць плач матушкі. Даведаўшыся, што памер адзін з новых фаварытаў (Ланской), разам з ею, па-бабску, наўзрыд, аплаквалі свайго саперніка.

Што думаюць аб Кацярыне і тры славянскіх народы? Расіяне – добрая матушка, царыца, узмацніўшая дзяржаву. Палякі з горыччу ўспамінаюць перадзел сваей дзяржавы, які звязваюць з яе імем. Украінцы свае адносіны да яе выразілі ў песні: «Катерино, вражжа мати, щож тиі наробила: степ широкій, степ привольный тай занапастила». А слоў з песні не выкінеш.

На элекцыйным полі на Волі, паблізу Варшавы (цяпер адзін з раенаў яе- Г.М.(7 верасня) некаторыя называюць 6 і 8 верасня) 1764 г. Станіслаў Аўгуст Панятоўскі выбраны каралем Рэчы Паспалітай Польскай. Чытачы павінны ведаць, што ў Польшчы каралеў выбіралі, а ў Расіі царскі трон перадаваўся ў спадчыну.

Лічыцца, што выбранню караля садзейнічала Кацярына ІІ. І гэта сапраўды так. Яна добра ведала яго характар і была ўпэўнена, што праз такога караля зможа легка ўздзейнічаць на палітычнае жыцце Польшчы. Ею кіраваў цвярозы палітычны разлік.

Панятоўскі, мабыць, па-ранейшаму быў нераўнадушны да яе. Менавіта гэтым можна растлумачыць той факт, што каранацыя прызначана ў тым жа 1764 г. у дзень Кацярыны-25 лістапада (па каталіцкім грыгарыянскім календары). Каранаваўся ен у Варшаве, у касцеле св. Яна, у вельмі ўрачыстых абставінах. Карону на галаву Станіслава Аўгуста ўсклаў і ўручыў яму каралеўскія сімвалы ўлады – скіпетр і залатую дзяржаву – прымас Польшчы Уладыслаў Любеньскі.

Каранацыя Станіслава Аўгуста закончылася вялікім прыемам у каралеўскім замку з удзелам міністраў, сенатараў, паслоў (дэпутатаў). Варшава была ахоплена святочнымі выступленнямі, гульнямі, феерверкамі. Народ, як заўжды ў такіх выпадках, весяліўся. Але ўжо падчас урачыстасцяў у некаторых з’явілася трывога за будучае краіны.

Праўленне Панятоўскага на працягу 31 года было не з легкіх: тут і рэформы, і канфедэрацыі (барская, таргевіцкая), тры падзелы Польшчы, паўстанне Касцюшкі і, у рэшце рэшт, фінал – адрачэнне ад прастола. Станіслаў Аўгуст, атрымаўшы загад з Пецярбургу, пераехаць з Варшавы ў Гродна, пакорна выканаў яго і 9 лістапада 1795 г. пакінуў сталіцу. Тут, у Гродне, па іроніі лесу, 25 лістапада 1795 г., у гадаўшчыну каранацыі і ў дзень Кацярыны ён падпісаў акт аб адрачэнні ад прастола. Праз два гады яму настойліва прапануюць пераехаць у Пецярбург. Там яго ўтрымліваюць як хоць і быўшага, але караля. Станіслаў Аўгуст і ў Пецярбургу жыве на шырокую ногу. Даходы не пакрывалі расходаў. За ім цягнуўся шлейф даўгоў. Ён страціў крэдыт даверу ў такой ступені, што банкіры і ліхвяры патрабавалі, каб на заемных распісках замест Rex (кароль) быў Ryx (камердынер Станіслава Аўгуста), подпіс якога даваў гарантыю звароту грошай.

У сваім жыцці Станіславу Аўгусту прыйшлося перанесці страшную трагедыю. Яго брат Міхал Ежы Панятоўскі, прымас Рэчы Паспалітай, баючыся, каб з ім не паўтарыліся здарэнні французскай рэвалюцыі, выслаў уласнаручны ліст прускаму каралю Фрыдрыху ІІ, у якім выдаў ваенныя тайны польскай арміі. Ліст перахапілі. Міхалу Ежэму прад’явілі абвінавачанне ў дзяржаўнай здрадзе і арыштавалі. Станіслаў Аўгуст, каб выратаваць брата ад ганебнай смерці, пайшоў

на крайні крок. Ён прынёс у турму атруту і Міхал Ежы, у яго прысутнасці, прыняўшы яе, адразу памёр.

Незвычайна дзіўнымі і загадкавымі з'яўляюцца супадзенні дат і месцаў, звязаныя з імем Панятоўскага. Яго хрысцяць у Воўчынскім Святатроіцкім касцёле, і ў той жа касцёл праз 140 гадоў прывозяць з Ленінграда (Пецярбургу) труну з яго астанкамі. Ён карануецца 25 лістапада, але праз 31 год адракаецца ад каралеўскага тытулу. У варшаўскім касцёле св. Яна на яго галаву ўскладаецца каралеўская карона і ўручаюцца сімвалы каралеўскай улады. І ў тым жа касцёле,. а не на Вавеле (!), пахаваны рэшткі Станіслава Аўгуста, якія засталіся ад воўчынскага пахавання, і, спадзяюся, назаўсёды.

Астатні кароль Рэчы Паспалітай Польскай памёр у Пецярбургу ад апаплексічнага ўдару ва ўзросце 66 гадоў 12 лютага 1798г. (207 гадоў таму). Пахаванне было ўрачыстым. Труну Станіслава Аўгуста Панятоўскага ўстанавілі ў касцёле св. Кацярыны (О, лёс !).

Праз многа гадоў яго прах перавязуць у родны Воўчын. Родны, то ён родны, але гэта не Кракаў і не Варшава. Аб гэтым, аб добрых баках праўлення пакойнага сёння пойдзе апавед у далейшым.

Хутка праляцелі каранацыйныя ўрачыстасці. Малады кароль уступіў ва ўладанне спадчынай Пястаў і Ягелонаў. Першыя гады праўлення Станіслава Аўгуста прайшлі ў міры і спакоі, нягледзячы на тое, што большая частка магнатаў і народа лічыла яго каралеўства навязаным звонку. Спачатку яму не выражалі антыпатыі, наадварот, радаваліся таму, што гаспадарыць Пяст, што з ім, не ў прыклад іншым, каралям замежнага паходжання, можна было размаўляць на роднай мове. Але гэта было спачатку.

Калі ж ён разам з новапрызначаным канцлерам Анджэем Замойскім падрыхтаваў праект рэформ і пачаў здзяйсняць іх, наступіла процістаянне паміж каралём, яго аднадумцамі з аднаго боку, магнатамі, шляхтай, баяўшыхся рэфармавання грамадскага строю. А разам з гэтым утраты свабоды, вольнасці.І простым народам з другой. Магнатам і шляхце было што губляць. Уласна кажучы, не кароль кіраваў краінай, а яны. А што, калі кароль пачне кіраваць, то дзе будзе іх месца?

Што ж тычыцца народа, то дарэмна яму прыпісваць вартасці, якіх ен не мае. Гэта палітыкам выгадна спасылацца на народ. Маўляў, голас народа - існіна выключная: “Глас народа – глас Божы”. Тут яўная падмена паняццяў. “Глас Божы - глас народа”, а не наадварот. На жаль, людзі, упаўшы ў гардыню, не чуюць гласа Божыя. Часта народ разглядаецца як адзінае цэлае. А ен розны, з рознымі меркаваннямі. Да таго ж народ складаецца з людзей адукаваных і неадукаваных. Калі першыя ў сваіх учынках кіруюцца розумам, то другія- голымі інстынктамі, якія паступаюць з цемных закуткаў душы. З гісторыі мы ведаем, як часта той жа народ выступае ў ролі ochtasa- натоўпу, а дзеянні і ўчынкі натоўпа заўжды падпарадкаваны цемным інстынктам. Прыклад з сучаснага жыцця: у адным горадзе суседняй дзяржавы выбралі мэрам горада чалавека з крымінагенным мінулым. Нават выбіраўся ў прэзідэнты чалавек тройчы судзімы і меў шмат прыхільнікаў. Ці гэта не ўчынак ochtasa?

Праціўнікі Станіслава Аўгуста, выкарыстоўваючы цемныя бакі душы людзей, схільных да прымхаў, якія павінны выклікаць катаклізмы, распальвалі нянавісць да караля.

Варожа адносілася да яго і саксонская партыя, якая намагалася ўзвесці на трон свайго кандыдата.

Насцярожана і холадна паглядвалі на грамадзянскія рэформы ў Польшчы старыя расійскія палітыкі. Яны катэгарычна не жадалі губляць свайго ўплыву ў Польшчы. Вельмі адмоўна адносіліся да Чартарыскіх, у асяроддзі якіх заўжды меліся цвердыя і энергічныя палітыкі. Былі і кандыдаты на каралеўскі трон (Аўгуст, Адам). Знаходзячыся ў сваяцкіх адносінах з Панятоўскімі, яны аказвалі на Станіслава Аўгуста свой уплыў. Таму і былі нежаданымі персонамі ў Пецярбургу.

І Расію і Прусію задавальнялі папярэднія парадкі ў Польшчы, сістэма анархіі і "liberum veto". Вось у такіх абставінах кароль пачаў рэформы.

Гэтага не дачакаўся бацька, які сам выношваў планы рэфармавання грамадскага жыцця краіны, а сын многае ўзяў з гэтых планаў. Станіслаў (бацька) памер у 1762г. Што добрага зрабіў Станіслаў Аўгуст і што сталася набыткам гісторыі падчас доўгага праўлення?

Ен актывізаваў адукацыю, дзейнасць навукоўцаў, творчасць мастакоў, літаратараў. Заснаваў у Варшаве кадэцкі корпус, з якога выйшаў шэраг вядомых дзяржаўных дзеячаў:славутыя генералы Касцюшка, Ясіноўскі, Сакальніцкі і многа другіх. Пленна працаваў корпус інжынераў Вялікага княства Літоўскага. Кароль энергічна дапамагаў працы Камісіі Народнай Адукацыі. Адкрыў пастаянна дзеючы тэатр. Вярнуў да жыцця маненты двор, які быў закрыты ў часы Яна Сабескага. Акружыў сябе людзьмі навукі і вялікіх здольнасцяў. Так прыдворны мастак Бачч'ярэлі таленавіта ўпрыгожыў распісамі не толькі каралеўскі замак, але стварыў цэлую галерэю партрэтаў Панятоўскага. Архітэктар і «кабінетны мастак» караля, Зыгмунт Фогль, па яго даручэнні раз'язджаючы па ўсёй Польшчы, зрабіў велізарную колькасць відаў акварэльных архітэктурных аб'ектаў краіны. Вялікай папулярнасцю карысталіся каралеўскія архітэктары (якія працавалі і ў Воўчыне) - Даніэль Яўх, Матэуш Поппельман і іх аднадумцы. Пэўна, яны і з'яўляліся роданачальнікамі новага накірунку ў архітэктуры- «стылю Станіслава». Вельмі папулярнымі былі «вучоныя чацвяргі», на якіх збіраліся значныя групы нацыянальнай інтэлігенцыі.

Яшчэ не будучы каралём, Станіслаў Аўгуст прыступіў да збору бібліятэкі, калекцый твораў мастацтва, нумізматыкі. Яго прыдворная бібліятэка налічвала 20 тысяч кніг і рукапісаў. Карыстаючыся каралеўскай бібліятэкай, вядомы гісторык, арцыбіскуп Адам Нарушэвіч напісаў выдатны твор - «Гісторыя польскага народу».

Пратэжыруючы літаратарам, літаратуры, мастацтву, Панятоўскі стварыў вакол сябе арэол мецэната. Грамадскасць пахвальна адзывалася аб ім і назвала перыяд яго панавання «залатымі часамі ўваскрашэння навук».

Неўзабаве пасля каранацыі, 7 мая 1765г., Станіслаў Аўгуст заснаваў ордэн св. Станіслава. Яго дэвіз: "Узнагароджваючы - заахвочвае". Меў адну ступень. Пазней увайшоў у капітулу расійскіх ордэнаў. Налічваў некалькі ступеняў. Гэта

быў адзін з вельмі высокіх ордэнаў. Аб гэтым упамінаю таму, што ім узнагароджана некалькі жыхароў Камянеччыны: удзельнік вызваленча руска-турэцкай вайны на Балканах Вітальд Бухавецкі з Грышчыц; а. Іаан Анціпаровіч з Такароў (3-яй ступ.); удзельнік першай сусветнай вайны Аліпій Нясведаў з Амелянца (3-яй ступ. і ордэнам св.Ганны 4-ай ступ.); удзельнік руска-японскай вайны Аляксандр Загароўскі з Зубачоў (3-яй і 2-ой ступ., св.Ганны 3-яй і 2-ой ступ., св.Уладзіміра 4-ай ступ.: вышэйшым ордэнам Румыніі “Карона Румыніі”з мячамі). Аказваецца, і такія людзі жылі ў нас. А хто аб іх ведае?

Панятоўскі ўдзяляў увагу не толькі навуцы, літаратуры, мастацтву. Ён наводзіў парадак у гаспадарчай дзейнасці гмін, упалых мястэчах і гарадоў, клапаціўся аб развіцці прамысловасці і гандлю, у тым ліку ўнутранага.

А што ён зрабіў для Воўчына, Высокага-Літоўскага, Камянца-Літоўскага? Аб канкрэтных справах у Воўчыне з пісьмовых крыніц нам нічога не вядома. У Высокім-Літоўскім кароль быў праездам.

У верасні 1775г. Станіслаў Аўгуст рашыў, едучы з Беластока, наведаць роднае гняздо- Воўчын. Па дарозе заехаў у Камянец-Літоўскі, дзе сустрэўся з войтам, бурмістрам, раднымі, старастай, прадстаўнікамі мяшчан і яўрэйскага кагала. Яны паскардзіліся на тое, што гандаль у заняпадзе, людзі задаўлены падаткамі. Ад гэтага горад збяднеў. Вярнуўшыся ў Варшаву, кароль пакінуў без увагі просьбу камянчан. Жадаючы заахвоціць гандлем як мага больш купцоў, у тым жа годзе выдаў прывілей, якім вызваліў ад падаткаў маставога, грэбельнага і гандлёвага, а таксама вызваліў ад мытнага збору заезджых гандляроў. Незадоўга да смерці Станіслаў Аўгуст узяўся за пяро і напісаў мемуары, якія ў 1898 г. выдала ў Пецярбургу Расійская Акадэмія Навук.

Пасля смерці Панятоўскага (1805 г.) значная частка яго ўласнай бібліятэкі і нумізматычнай калекцыі была куплена Т. Чацкім для Крэмянецкага ліцэя. Пасля закрыцця апошняга знайшлася ў Кіеўскім універсітэце, а ўжо потым – у бібліятэцы Акадэміі Навук Расіі.

Робячы пералік добрых пачынанняў і здзяйсненняў Станіслава Аўгуста, прыбярог у заключэнне астатнюю (і галоўную) яго справу – Канстытуцыю 3-га Мая.

У 1788 – 1792 г. у Рэчы Паспалітай была створана патрыятычная партыя, якая выпрацавала праграму палітычных і сацыяльных рэформ умацавання дзяржавы. Чатырохгадовы сейм ухваліў праект рэформ (умацаванне арміі, змяненне дзяржаўнага строю і інш). 3 мая 1791 г. абвешчана Канстытуцыя Рэчы Паспалітай – першая Канстытуцыя ў Еўропе!

Зачараванасць першымі гадамі панавання маладога караля хутка змянілася варожасцю да яго з-за двухсэнсоўнага становішча, у якім аказаўся Станіслаў Аўгуст. На самой справе, ён стаў марыянеткай у руках Прусіі і Расіі, а гэта не мог не бачыць яго электарат.

Пачалося з малога, кароль не ўтойваў сваёй непавагі да народных абрадаў, звычаяў, называў усё прыгожае, што перадалі папярэднія пакаленні, грубым сарматызмам. Варожасць перарасла ў абурэнне, і гэта прывяло да Барскай канфедэрацыі, з якой на працягу чатырох гадоў вялі ваенныя дзеянні ад Станіслава Аўгуста іншаземныя войскі. Кароль аказаўся не на вышыні свайго

становішча. Замест таго, каб аб’яднаць вакол сябе патрыятычныя сілы, ён імкнуўся інтрыгамі і подкупамі схіліць на свай бок правадыроў і афіцэраў канфедэрацыі. Канфедэраты былі разбіты. Але гэта не паправіла становішча Панятоўскага на троне і не спрыяла развіццю краіны. Здарэнні падштурхвалі да падзелу Польшчы ў 1772 г., затым адбыліся яшчэ два, якія прывялі да поўнай страты суверэнітэту Рэчы Паспалітай. Яна знікла як дзяржава на карце Еўропы.

А тым часам краіну раздзіралі ваенныя дзеянні, паўстанні. Кароль, які прысягнуў Першай Канстытуцыі, парушыў прысягу, не праявіў у складанай сітуацыі мужнасці, не наведаў ні аднаго вайсковага падраздзялення Рэчы Паспалітай. Пасля хуткацечнай і няўдалай кампаніі 1792г. прыняў бок тых сіл, якія стаялі на антыканстытуцыйных, антырэфармісцкіх пазіцыях, прыняў бок Таргавіцкай Канфедэрацыі, якую ўзначаліў Шчэсны Патоцкі.

У 1794 г. разгараецца паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. Паўстанцы спачатку мелі некаторы поспех. Аднак і Касцюшка не меў дастаткова цвердай волі і жалезнай рукі, каб прыняць адзіна правільнае рашэнне, а мудрыя парады Калантая адхіляў.Станіслаў Аўгуст у трывозе і разгубленасці. Ен не ведае, што рабіць, як павесці сябе ў складанай сітуацыі.

Паступова войскі Прусіі і Расіі бяруць ініцыятыву ў свае рукі. Кола сціскаецца. У апошнім баю пад Мацеевіцамі паўстанцы церпяць паражэнне, а Касцюшка трапляе ў палон. Наступае развязка. Прускі кароль вывозіць з Кракава ў Берлін каралеўскую скарбніцу і каралеўскія сімвалы ўлады. З гэтага моманту пачынаецца няўмольны адлік часу – таго часу, калі апошні кароль Польшчы адрокся ад свайго тытулу. Ну а далей? Далей мы ўжо ведаем.

## 11. ШЛЯХ АСТАНКАЎ КАРАЛЯ Ў ВОЎЧЫН

Ранкам 12 лютага 1798 г. апошняга польскага караля не стала. Ен памер ад апаплексічнага ўдару.

Пахаванне было каралеўскім.Памершага забальзаміравалі, а сэрца і ўнутраныя органы змясцілі ў асобныя урны. Станіслава Аўгуста апранулі ў мундзір Польскай кароннай гвардыі, прымацавалі ордэн Белага Арла, накрылі чырвоным плашчом, абшытым гарнастаямі.

На працягу 10-ці дзен для ўсіх жадаючых развітацца быў адкрыты доступ да цела памерлага, 22 лютага труну выставілі ў Троннай зале. Павел I асабіста ўскладаў на яго галаву залатую карону, тую самую,якой ен быў пазбаўлены па загаду Кацярыны II.

26 лютага імператар абвясціў чатырохдзенны траур, 5сакавіка труна з целам пакойнага была перанесена з Мармуровага палаца ў касцел св. Кацярыны. Траурную працэсію, складзеную з 18 тысяч вайсковаслужбоўцаў, узначальваў Павел I з сынамі Аляксандрам і Канстанцінам. 8 сакавіка абабітую белым шоўкам са срэбнай вышыўкай драўляную труну змясцілі ў другую, пазалочаную, і паставілі ў крыпце касцела.Траурных прамоваў не было. Павел I не дазволіў.

Яшчэ адзін кароль – Станіслаў Ляшчынскі двойчы адмовіўся ад кароны. Памер ен у французскім горадзе Нансі ў 1766г. Яго труна знаходзілася ў мясцовым касцеле Бон-Сур. Карона і скіпетр прапалі, а яго прах быў выкінуты

бунтарамі. Але чыясь добрая рука сабрала каралеўскія астанкі і труна зноў была пастаўлена ў касцеле.

Генерал Сакальніцкі, які ў той час быў у Францыі, выкупіў яе і прывез у Польшчу. Але пахаваць былога караля ні ў Варшаве, ні ў Кракаве, ні ў Пулавах не ўдалося. У1828г. яго пляменнік Петр передае труну Таварыству Прыяцеляў Навук у Варшаве. Тут выбухнула паўстанне 1830 г., а пасля яго ўсмірэння Мікалай і распарадзіўся перадаць заборы Таварыства ў Імператарскую Публічную Бібліятэку. У 1857г. бібліятэкар Антон Іваноўскі выпадкова знайшоў саркафаг. Дырэктар бібліятэкі Мадэст Корф звярнуўся да Аляксандра II з просьбай дазволіць пахаванне ў Вільні, але той загадаў пахаваць Станіслава Ляшчынскага побач са Станіславам Панятоўскім.

Да першай сусветнай вайны каралеўскую крыпту наведвалі тройчы: у 1857, 1861 і 1905 гадах. Адзначалі, што становішча пахавання няважнае. Адам Хмель, адзін з тых, хто быў на месцы пахавання, гаварыў, што астанкі Станіслава Аўгуста захоўваюцца ў трайной труне і з-за вільгаці труна знаходзіцца ў “вельмі кепскім стане, а труп амаль ператварыўся ў прах.”

У 1926г. польскі амбасадар у Маскве Станіслаў Кентшыньскі ў сакрэтным пасланні міністру замежных спраў Польшчы Аўгусту Залескаму звярнуў увагу на занядбаны стан труны і просіць выдзяліць грошы на кансервацыю. Адначасова ен праводзіць папярэднія перамовы з камісарам замежных спраў СССР Чычэрыным аб перадачы Польшчы астанкаў Станіслава Панятоўскага. Але перамовы не маюць працягу. Кіраўнік Польшчы Юзэф Пілсудскі да пытання перапахавання Станіслава Аўгуста займаў адмоўную пазіцыю.

У1927г. Магілеўскі арцыбіскуп мітрапаліт Э.Роп збірае тайны сход, які ставіў сабе мэтай перанясенне астанкаў апошняга караля Рэчы Паспалітай на радзіму.

Нечакана вырашаць лес саркафага Станіслава Панятоўскага ўзялася Краіна Саветаў.У канцы 30-х гадоў XX ст. у Ленінградзе вяліся работы па перабудове горада. Касцел св.Кацярыны павінны былі разабраць. Польскае консульства паведаміла аб гэтым Міністэрству замежных спраў Польшчы на пачатку 1938 г.

На ўзроўні кіраўніцтва Польшчы абмяркоўвалася вяртанне на радзіму астанкаў караля. У разлік браліся пасля Кракава і Варшавы Познань, Вільня, Львоў. У рэшце рэшт спыніліся на Гродне, Воўчыне і Рыках, дзе пахаваны бацька караля. Выбралі канчаткова Воўчын.

Тады ж было вырашана правесці пахаванне ціха, без усякай помпы, а труну пакуль замураваць у адну з вуглавых каплічак Воўчынскага касцела.

Польскае пасольства ў Маскве паведаміла ў Варшаву, што савецкія ўлады не будуць чыніць ніякіх перашкод, і што “пасылка” гатова да адпраўкі ў Польшчу.

Міністэрства ўнутраных спраў было абавязана гарантаваць бяспеку перавозу праху Станіслава Панятоўскага ў Воўчын, не прыцягваючы ўвагі грамадскасці, прасачыўшы, каб труна бяспечна захавалася да пачатку рэстаўрацыі касцела.

Усялякія размовы пра тое, што перасылка труны апошняга караля была нечаканасцю для польскіх улад – суцэльная хлусня. Зналі і польскія ўлады і савецкія. Спроба захаваць гэта ў тайне не ўдалася, хаця і вельмі стараліся.

Перапахаванне апошняга польскага караля мела сваю асаблівасць: спачатку польскія ўлады не жадалі гэтага рабіць з-за нацягнутых адносін з Савецкім Саюзам, савецкія ж мелі на гэты конт свой погляд.

Па іроніі лесу, праз многа гадоў шляхі нашчадка знатнага старажытнага роду, апошняга караля і сына грузінскага шаўца Джугашвілі, перакрыжаваліся. Сосо Джугашвілі – Сталін, які ўзначальваў магутную дзяржаву, тайна ад усіх песціў мару авалодаць усім светам, у першую чаргу Еўропай, з азіяцкай хітрасцю хаваючы свае думкі, імкнучыся прытупіць пільнасць ахвяры, Сталін, ужо рыхтуючы чарговы падзел Польшчы (пакт Рыбентроп – Малатаў – Г.М.), у ліпені 1938 г. перадаў астанкі Станіслава Аўгуста ўраду Польшчы.

Перад гэтым, 6 ліпеня, у касцеле св. Кацярыны адбылася эксгумацыя астанкаў караля ў прысутнасці консула Польшчы ў Ленінградзе і прадстаўнікоў савецкіх улад. Падчас ускрыцця труны, упэўніліся ў аўтэнтычнасці каралеўскага праху, які быў значна пашкоджаны. У крыпце знойдзены дзве урны з сэрцам і ўнутранымі органамі пакойнага.

Падчас перавозкі да польскай граніцы труну суправаджаў польскі консул у Маскве. 9 ліпеня на станцыю Стоўбцы прыбыў звычайны таварны вагон з апячатанай скрыняй. Савецкія чыгуначнікі перадалі польскім накладную з адрасам: “Польшча” і тлумачэннем: “Астанкі”.

Нізавыя ўлады не ведалі як пастурацць, і звярнуліся ў ваяводскі Навагрудак. Адтуль распарадзіліся: вагон апламбіраваць і адправіць 10 ліпеня ў Брэст, паставіўшы на запасныя шляхі.

А ў Воўчынскім касцеле тым часам рыхтаваліся да прыему труны, бо ксендз Антоні Чышэўскі атрымаў 10 ліпеня па гэтай справе ліст. Падрыхтавалі адну з ніш, што называлася “каралеўскай” (у другіх знаходзіліся саркафагі Чартарыскіх). У “каралеўскай” нішы зрабілі рамонт: да дубовых дзвярэй устанавілі рашотку. Аб гэтых работах ведалі начальнік ваяводскага аддзелу будаўніцтва Папеўскі і ксендз Чышэвіч.

У ноч з 14 на 15 ліпеня 1938г. да касцела пад’ехалі дзве машыны – адна грузавая кіраўніцтва пошты ў Брэсце, другая легкавая з людзьмі з “двойкі”.

Іншы погляд па гэтай справе меў мясцовы жыхар Высокага-Літоўскага Шлема Кантаровіч, цяпер нябожчык. Ен сцвярджаў, што бачыў, як ад станцыі Высока-Літоўск машыны ехалі ў Воўчын. Мажліва, той вагон з Брэста перагналі на ст. Высока-Літоўск, а адтуль машынай павезлі ў Воўчын.

У Воўчыне 600-кілаграмовы саркафаг намагаліся перанесці праз брамку, але ен не праходзіў – быў вельмі шырокі. Паспрабавалі пераправіць праз мур.

З вялікімі намаганнямі зрабілі гэта. Масіўны саркафаг апусціць у крыпту не ўдалося з-за вузкага праходу. Паставілі на падлозе перад нішай. Дзверы ў нішу закрылі, рашотку апячаталі. З мясцовых пры гэтым прысутнічалі войт Воўчынскай гміны Уладыслаў Мэльхер і ксендз Антоні Чышэвіч. Склалі пратакол прыняцця труны Станіславага Аўгуста Панятоўскага ў Воўчынскі касцел св.Тройцы. Ксендз, спахапіўшыся, хацеў адслужыць заўпакойную службу. Людзі з “двойкі” катэгарычна адмовілі: “Дзяржаўная тайна”.

А тайны даўно ўжо не было. Аб вяртанні апошняга караля першай напісала газета “Azennik Brzeski” (“Брэсцкая газета”), затым віленскае “Slowo” (“Слова”).

Потым у друку аб гэтым многа пісалася, але праз год грымнула другая сусветная вайна і на нейкі час аб каралю як бы забыліся, каб пасля вайны зноў і зноў успамінаць з новай зацікаўленасцю.

## 12. ДАСЛЕДАВАННЕ ПАХАВАННЯ

Цікавасць да пахавання апошняга польскага караля захоўвалася ў большай ці меншай ступені ўвесь пасляваенны час з розных пунктаў гледжання.

Цікавасць у сталінска-брэжнеўскія часы была баязлівай і насцярожанай, але чым бліжэй да развалу імперыі, тым больш праяўлялася смеласці.

Спробы мясцовых людзей дазнацца, што ж там есць, былі павялічана ўтылітарнымі: напэўна можна будзе чым-небудзь пакарыстацца. Гэта ж распальвалася мясцовай “інтэлігенцыяй”. Так завуч Воўчынскай школы, даведаўшыся, што хтось бачыў у касцеле, у месцы пахавання, мундзір з бліскучымі гузікамі, сказала свайму настаўніку: “А вы іх зрэжце.”

На што(?) і з’ехала ў Расію. Пэўна, і гузікі забрала з сабою. Імя і прозвішча завуча–Валянціна Кавалёва (жонка афіцэра–пагранічніка Хлыста). Другая прадстаўніца “інтэлігенцыі”, настаўніца гісторыі, на прапанову даследчыка. А Мілінкевіча распавесці вучням Воўчынскай школы аб каралю, холадна сказала: “Так это ж польская история!” Вось такі “гісторык”.

Пасля прыходу ў 1939 г. у мястэчка Чырвонай Арміі новая атэістычная ўлада распарадзілася выкінуць з касцёла іконы і лаўкі. Агледзелі каралеўскую нішу, але апячатаную труну не кранулі.

У лютым 1940 г. савецкія ўлады пачалі высяляць у Сібір мясцовых католікаў, польскіх асаднікаў, солтысаў, леснікоў. Высялялі не толькі воўчынцаў. Высялялі паўсюдна. Памятаю, што і ў нашай весцы, дзе я нарадзіўся (Дзмітравічы), выступіў на сходах асобы ўпаўнаважаны Кажура і сказаў: “Мы вас, панское охвостье, всё вытеребим”. На 24 чэрвеня 1941 г. назначылі ў Воўчыне да вывазкі астатняга “чуждого элемента”.

Але 22 чэрвеня 1941 г. у мястэчка ўвайшлі фашысты. Яны абследавалі касцел, паглядзелі на труну і назначылі падатак – 22 маркі 98 пфенінгаў.

Воўчын і навакольныя сёлы ўвайшлі ў склад дыстрыкта Украіна. У той час Камянец адышоў да Усходняе Прусіі, – утварыліся крайс Бельск, бецырк Беласток.

У красавіку 1945 г. амаль усе каталікі былі дэпартаваны ў Польшчу, а ў 1946г. – астатнія. Ксяндзу Чышэвічу прапанавалі “забрать своего короля”, але правінцыяльны, сціплы ксендз не рашыўся выканаць вельмі важную і адказную місію. 27 красавіка Антоні Чышэвіч у прысутнасці сведак разам са старшынёй Воўчынскага сельсавета склалі акт перадачы ключоў сельсавету: “…один от костёла, другой от крипты, где стоит гроб короля. Костел в присутствии данных граждан опечатан сергучовой печатью”. Акт падпісалі Антоні Чышэвіч, старшыня Воўчынскага сельсавета С.Г. Сачкоў, сведкі – І.Куц, П.І.Стэльмахаў.

У той жа дзень ксендз на чатырох вазах пераехаў на другі бераг Буга. Ён забраў з сабою метрычныя кнігі, літургічны посуд, касцельныя харугві, арнаты. Чышэвіч далека не ад’ехаў ад свайго Воўчына. Стаў служыць у сяле Гнойна.

Да пары да часу пахаваннем цікавіліся людзі дапытлівыя і аматары пажывіцца. Праявілі інтарэс і савецкія ўлады.

У пачатку 80-х гадоў ХХ ст. прыязджалі прадстаўнікі ўлады Камянца і Брэста, пакруціліся, паглядзелі, пагаварылі ў сельсавеце са старшынёй калгаса і ад’ехалі. Відавочны савецкі стыль – гаварылі не з людзьмі вёскі, якія маглі распавесці аб пахаванні, а звярнуліся да старшыні (начальства, хоць і сельскага маштабу). А тыя старшыні не мясцовыя, чужыя людзі, што яны маглі ведаць – “временщики”.

Прыблізна ў тыя ж гады прыязджалі літоўцы. Невядома, цікавіліся яны пахаваннем ці не, але хадзілі па вёсцы і шукалі карону, але нічога не знайшлі.

Тая карона, якую ўсклаў на галаву пакойнага караля рускі цар (срэбная з пазалотай), аказалася ў Аружэйнай палаце ў Крамлі. Карона, якую знайшлі ў Воўчыне, хутчэй за ўсё была бронзавай з пазалотай.

Па словах А. Д. Юрчыка, каронай завалодаў мясцовы каваль і на падпітку любіў з ёю танчыць. Ён памёр у канцы 40-х гадоў ХХ ст., а ягоны сын здаў карону і абломак шпагі старызніку на металалом.

З людзей, наведаўшых Воўчын індывідуальна, вядома пра двух–пра А.Мілінкевіча з Гродна, заехаўшага з сям’ею ў Воўчын у 1979г. пасля вяртання з Польшчы ў Гродна, і Мікалая Іванова, пабываўшага там жа ў 1983г. з прыватным візітам. Гэтая асоба цікавая тым, што яго прозвішча не сустракаецца на старонках друку, а таксама і тым (тэма для даследчыкаў), што пражываючы сення ў Вроцлаве, гэты доктар навук нарадзіўся ў Воўчыне з далека не воўчынскім прозвішчам – Іваноў.

З болей сур’езным намерам 18 кастрычніка 1987г. з Гродна ў Воўчын выехала група вучоных у складзе Аляксандра Мілінкевіча – фізіка, дацэнта Гродзенскага універсітэта; яго сына-вучня адной з гродзенскіх школ Аляксандра Мілінкевіча; гісторыка, прафесара таго ж універсітэта Міхася Ткачова; мастака-рэстаўратара музея гісторыі, рэлігіі і атэізму Уладзіміра Кіслага ў Гродне. Прыехаўшы ў Воўчын, адразу накіраваліся ў касцел.

Ім удалося сабраць у крыпце вялікі кавалак старой тканіны, срэбрам і золатам вышытай, вялікі кавалак аксаміта з польскім, вышытым срэбрам, арлом, знойдзеным малодшым Мілінкевічам, потым знайшлі два кавалкі тачонага дрэва абцас, кавальскія цвікі, фрагменты срэбных галуноў, абломкі шпагі, фрагменты эпалета, шпору. Карону не знайшлі. Касцей не было. Але потым знайшлі і косці. Папярэднія даследаванні паказалі, што яны не належаць чалавеку. Як гаворыць прафесар Андрэй Майсяенак, звярнуліся спачатку да выкладчыка Гродзенскага медінстытута З.Пашэнкі. Нефармальная экспертыза паказала, што сярод сабраных касцей чалавечых не было.

Усе знаходкі ляжалі ў майстэрні Уладзіміра Кіслага да вясны 1987 г. Імі сталі цікавіцца партыйныя работнікі, навукоўцы. Пазваніў намеснік Міністра культуры БССР. У. Гілеп і папрасіў усе знойдзенае прывезці ў Мінск. Да гэтага часу часткі знаходак Уладзімір Кіслы ўжо закансерваваў. Пасля стала вядома, што польскі бок звярнуўся да беларускіх улад за дазволам вывучэння стану каралеўскага саркафагу з мэтай вярнуць яго затым у Польшчу.

Знаходкі з Гродна перавезлі ў Мінск і перадалі Дзяржаўнаму музею БССР. Там аглядзелі ўсе дасканальна і прыйшлі да высновы, што яны могуць мець адносіны да пахавання караля.

У руках мінскіх кансерватараў кавальскі цвік з XVIII стагоддзя атрымаў свой першапачатковы бляск. У срэбнага арла выпаў з грудзей каралеўскі “Целэк”. Абцас вычысцілі, тканіну выраўнялі. Усе знаходкі палажылі ў шэсць шкатулак, абабітых зяленым сукном, пакрытых плексігласам.

Бронзавая шырокая стужка калісьці была блакітнай стужкай ордэна Белага Арла, астатняе- фрагменты цемляка і частка вынішчанай клямры.

Першы сакратар ЦК КПБ Яфрэм Сакалоў накіраваў ліст у Міністэрства культуры, у якім прапанаваў аказаць дапамогу польскаму ўраду ў вывучэнні стану пахавання апошняга караля і перадачы яму знойдзеных матэрыялаў.

12 снежня 1988 г. з Польшчы прыехала афіцыйная камісія. Узначальваў яе дырэктар Каралеўскага Замка ў Варшаве, гісторык, прафесар Аляксандар Гейштар. У складзе дэлегацыі былі: антраполаг, прафесар Дзержыкрай Рагальскі; гісторык мастацтвазнаўства Марэк Квяткоўскі; рэстаўратар, доктар Тадэвуш Поляк; гісторык, прафесар Анджэй Загорскі; юрыст, магістр, дырэктар Міністэрства культуры і мастацтва Яцэк Рулевіч; археолаг, доктар Збігнеў Піяноўскі; журналіст і публіцыст Аляксандра Згожэльска; фатографы Адам Буяк і Эдвард Граховіч; консул Генрых Каліноўскі з Генеральнага Консульства ПНР у Мінску. Іх суправаджалі намеснік міністра культуры Уладзімір Гілеп, намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Уладзімір Гетманчук, начальнік кіравання справамі культуры Брэсцкага аблвыканкама Віталь Клімчук; старшыня Камянецкага райвыканкама Уладзімір Фісейка.

Раніцай яны былі ў Воўчыне. Падышлі да дзвярэй касцела, паспрабавалі адчыніць, але яны прыадчыніліся толькі крыху. Цераз шчыліну першым праціснуўся Марэк Квяткоўскі, за ім – Збігнеў Піяноўскі. Праз завалы ўпаўшага даху яны прабраліся да нішы. Падышлі да праіржавелай рашоткі, за ею ўбачылі маленькае разбуранае памяшканне і нічым не прыкрыты праем. У нішы трохі смецця, зямля, перамешаная са снегам, рэшткі нейкіх балек, на якія зверху капае вада, таму што на двары адліга. Аб сцяну нішы абаперты карычневыя дошкі з жалезнымі ручкамі. Гэта фрагменты простай труны, якая служыла ахoвай для труны асноўнай. Ад яе не засталося нават следу.

Збігнеў Піяноўскі саскочыў у праем крыпты. Калі ў 1938 г. прывезлі ў касцел труну, то туды, у крыпту, апусцілі асноўную труну і дзве цынкавыя банкі, у якіх былі сэрца і ўнутраныя органы караля. Ен у поліэтыленавую торбу набірае трохі грунту са смеццем. Потым Піяноўскі знойдзе ў ім некалькі кавалачкаў струхлелай тканіны( гэта да таго, што знайшлі А. Мілінкевіч, М.Ткачоў і Уладзімір Кіслы) і нейкія костачкі, якія прафесар Дзержыкрай- Рагальскі прызнае костачкамі жывельнага паходжання. Адам Буяк і Эдвард Граховіч фатаграфуюць усе памяшканне. Трохі зямлі са струхлеўшым дрэвам набірае ў торбу і Аляксандра Згожэльска. І гэта ўсе. Уражанне ад убачанага ў членаў дэлегацыі было жахлівым.

Што ж гэта за зямля такая, у якой не захавалася нават сэрца караля! Але гэта не зямля вінавата, а людзі.

У той жа дзень дэлегацыя праз Брэст накіравалася ў Мінск.

# 13. VOX POPULI

Цікавасць да захавання апошняга польскага караля не згасала. Яна то заціхала, то ўспыхвала з новай сілай.

Драматычны лес труны караля-выгнанніка, затопленай паводкай у Пецярбургу ў касцеле св. Кацярыны, а пазней пахаванай у цішы і тайне Воўчынскага касцела па распараджэнні Славоя Складкоўскага. Пасля вайны ўзніклі пытанні: “Што там засталося?”. “Ці варта ўзнаўляць спрэчкі аб Станіславе Аўгусце Панятоўскім?”

Адказ далі самі палякі. Напэўна, самым магутным і ўнушальным быў голас Прымаса Польшчы, кардынала Стэфана Вашыньскага. Ен пісаў: “Жадаю запэўніць ініцыятараў: я, а таксама касцельныя ўлады зробяць усе мажлівае, каб гэты велікадушны народны акт быў здзейснены ў духу поўнага паважання для памершага караля і ў духу грамадскага міру”.

“Трыбуна люду” ў 1988г. распаўсюдзіла анкету сярод усіх палякаў у газетах, часопісах, на радые, тэлебачанні, у якой выяснялася: ці варта везці астанкі апошняга польскага караля ў Польшчу? Калі так, то дзе пахаваць: у катэдры св. Яна, дзе ляжаць астанкі першага прэзідэнта Польшчы? А можа быць, у Лазенках,згодна запавета караля ?

У дыскусіі прынялі ўдзел прадстаўнікі вучоных, палітыкаў, кіраўнікоў дзяржавы. Паслухаем некаторых з іх.

“НЯХАЙ ВЕРНЕЦЦА ЯК МАГА ХУТЧЭЙ У СВАЕ КАХАНЫЯ ЛАЗЕНКІ”, - гаворыць у інтэрв’ю для “Кур’ера” прафесар Аляксандр Краўчук.

“УШАНУЙМА ВОЛЮ МАНАРХА”, – настойвае на Лазенках дацэнт Марэк Квяткоўскі, спасылаючыся на пісьмовы запавет Станіслава Аўгуста.

“ВАВЭЛЬ,ЗРАЗУМЕЛА, як САНКТУАРЫЮМ – МЕСЦА ЎПАКАЕННЯ КАРАЛЯ”, – сцвярджае Аляксандр Бахеньскі, аўтар “Разважанняў аб польскай палітыцы”.

“ХАЦЯ Б СІМВАЛІЧНАЯ ТРУНА НАЛЕЖЫЦЬ МАНАРХУ”, – гаворыць прафесар Стома і дабаўляе:”Я за ВАРШАЎСКАЙ КАТЭДРАЙ”.

“… А МОЖА КАПЛІЦА Ў ЗАМКУ?”, – пытаецца доктар Станіслаў Дзенцялоўскі і ставіць шматкроп’е.

“ЯГО ПРАХУ ПАТРЭБНЫ СВЯТЫ ПАКОЙ”, – заяўляе другі гісторык, выдатны знаўца эпохі прафесар Ян Башкевіч, не хаваючы свае прыналежнасці да праціўнікаў вяртання караля з Воўчына.

“З ВОЎЧЫНА ў КАТЭДРУ?”, – піша Станіслаў Ледухоўскі ў “Тыгодніку Польскім”, апэлюючы на каралеўскім пахаванні для апошняга караля і дадае, што такое пахаванне цяпер патрэбна з прычыны ўзмацнення псіхалагічных, маральных і этычных норм. Ледухоўскі выказваецца пры гэтым за Варшаўскую катэдру або Каралеўскі замак.

“ШТО з АСТАТНІМ КАРАЛЕМ ПОЛЬШЧЫ?” – НАВАТ ЯПОНЦЫ ХОЧУЦЬ ВЕДАЦЬ!” – заўважае ў сваім выказванні рэдактар такійскай газеты “Асахі Сіхтбун” Юйі Оаку.

Гэта толькі некаторыя выказванні загалоўкаў на радые, у тэлепраграмах. За мяжой, уключаючы “Голас Амерыкі”, “вольную Еўропу” значна больш.

А цяпер зусім сур’езна. Спрэчкі аб каралю Станіславу Аўгусту, што працягваюцца два стагоддзі, павінны быць закончаны. Падышоў час, каб на пытанне, што рабіць з апошнім польскім каралем, у рэшце рэшт, трэба вырашыць па-мужчынску.

## 14. ПРАХ КАРАЛЯ ЎПАКОІЎСЯ Ў ВАРШАВЕ

Пасля наведвання 12 снежня 1988 года Воўчына, на наступны дзень у Дзяржаўным музеі БССР адбылася цырымонія перадачы астанкаў Станіслава Аўгуста польскай дэлегацыі.

Доктар гістарычных навук П.Лысенка і кандыдат тых жа навук П.Лойка з інстытута гісторыі акадэміі Навук БССР даследавалі знаходкі і ўпэўнілі, што яны могуць паходзіць з каралеўскага саркафага.

13 снежня 1988 года дырэктар Дзяржаўнага музея БССР І.Загрышчаў і дырэктар Варшаўскага Каралеўскага Замка прафесар А. Гейштар падпісалі Акт перадачы польскаму боку астанкаў караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

Акт абвяшчае,што выконваецца гэта па просьбе Польскай Народнай Рэчы Паспалітай і са згоды ўлады Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

Ранкам 14 снежня 1988 года польская дэлегацыя выязджае ў Варшаву. Астанкі караля перавозяць у “Мэрсэдэсе”. Шлях праз Гродна,горад, з якога выехаў кароль з Польшчы назаўсёды. Цяпер Станіслаў Аўгуст ( праз 190 гадоў ) вяртаецца ў сваю краіну. 17 гадзін гродзенскага часу. Для гэтай незвычайнай кавалькады адкрываецца яшчэ афіцыйна закрыты дарожны пераход. За варотамі Кузьніца Беластоцкая. Да “Мэрсэдэса” падыходзіць афіцэр у зялёным мундзіры. Гэта капітан Рэмігіуш Каспшык. Ен салютуе: “Вітамы ў Польшчы.”

У Каралеўскі замак, які пакінуў кароль 196 гадоў таму, уносяцца апоўначы яго астанкі.

6 студзеня 1989 года камісія дакладвае Міністру культуры і мастацтва Аляксандру Краўчуку аб выкананай працы ў Воўчыне, Брэсце, Мінску, Гродна. Па пагадненню з беларускім бокам, прымаецца рашэнне аб прадаўжэнні археалагічных даследаванняў.

16 студзня 1989 года дэлегацыю прыняў Прымас Польшчы, кардынал Юзаф Глемп.Яго праінфармавалі аб працягу даследванняў, аб працы дэлегацыі ў Беларусі. Прымаса асабліва ўзрадавала паведамленне аб праектуемай рэстаўрацыі касцёла ў Воўчыне. Ён сказаў: “Час закончыць гэтыя сумныя вандроўкі няшчаснага караля.Трэба паважаць яго памяць. Ён быў памазанікам Божым. Калі не знойдзем нічога болей у крыпце – урачыста пахаваем яго шаты. Ён павінен мець пахаванне годнае караля. Можа вярнуцца ў месца свайго памазання і каранацыі – у катэдру св. Яна ў Варшаве.”

20 мая 1989 года яшчэ раз пабывалі ў Вочыне гарадзенцы А. Мілінкевіч і У. Кіслы. На гэты раз яны распытвалі старажылаў вёскі.

А праз тыдзень, 27 мая таго ж года, у Воўчын з Польшчы прыехала група ў складзе загадчыка аддзела археалогіі Дзяржаўнага музея гісторыі мастацтваў у Кракаве на Вавелі магістра Збігнева Піяноўскага (кіраўнік), супрацоўніка гэтага ж аддзела доктара Януша Фірлета Е. Галіноўскай- Пішняк, архітэктара-рэстаўратара з Варшавы і журналісткі А. Згожэльскай.

З беларускага боку ўдзел у даследаванні прынялі архітэктары А. Краўцэвіч і Ф. Селязнеў, геадэзіст М. Дзядзюля, фатограф В. Абачынец, гісторык архітэктуры С. Адамовіч. Трое рабочых спраўна ачысцілі храм ад смецця.

Выявілі частку гадзіннікавай вежы. На падлозе засталіся ляжаць скульптуры евангелістаў Матфея, Лукі, Марка. Іаан покі што застаўся наверсе.

Гісторык архітэктуры С.Адамовіч назбірала дастаткова матэрыялу, каб прыступіць да рэстаўрацыі.

Польскія археолагі перасеялі і перабралі колькасць смецця з падлогі, нішы і каралеўскай крыпты. Знайшлі шматлікія кавалкі тканіны з каралеўскімі арламі, фрагменты шпагі, эпалеты, фрагменты шпоры, абутковую падкоўку, многа цвікоў, гузікі і часткі парадннай труны з 1798г.

Усе знойдзенае палажылі ў новую труну ўзору 1798г. А дзе ж косці, чэрап?

Доктар Мечыслаў Парафенюк, спецыяліст судовай медыцыны, з дапамогай мікраскопа і хімічных рэчываў выявіў толькі дробныя часткі пажылога чалавека на тканіне, у пяску і смецці. Шкілет і чэрап падвергліся разбурэнню яшчэ ў Пецярбургу-Ленінградзе.

Прафесар А. Гейштар 12 чэрвеня 1989г. асабіста з воўчынскай крыпты зямлю з прахам Станіслава Аўгуста насыпаў у медную урну з каралеўскай манаграмай Sar (Stahislaus Augustus Rex).

І на гэтым камісія сваю працу закончыла. Прыйшла пара пахаваць тое, што змаглі знайсці.

14 лютага 1995г. адбылася ўрачыстая цырымонія пахавання апошняга польскага караля.

Урну з прахам Станіслава Аўгуста Панятоўскага выставілі ў Рыцарскай зале Каралеўскага замка.

Ганаровую варту неслі афіцэры авіяцыі, наземных войск, флота, супрацоўнікі музея, прадстаўнікі Таварыства аматараў гісторыі, Саюза польскіх рамеснікаў, сяброў камісіі, якая ў 1988 і ў 1989 г. везла прах караля.

Урну з прахам пераносіла пахвальная працэсія. Наперадзе неслі крыж, за ім крочыла замкавая варта, следам – афіцэры са сцягамі, жаўнеры ганаровай варты, біскуп Мар’ян Дусь з духавенствам і афіцэры, якія неслі урну. Далей ішлі прадстаўнікі міністэрстваў Польшчы, Беларусі, кіраўнікі Варшаўскага ўрада, сейма, сената, а таксама сябры навуковых і мастацкіх аб'яднанняў.

Працэсія рухалася паміж шарэнгамі жаўнераў пры святле факелаў і свечак, пад мелодыю званоў. Калі урну ўнеслі ў святыню, хор заспяваў “De profundis” Кжыштова Глюка.

Пачынаецца заўпакойная літургія з удзелам Прэзідэнта Польшчы Леха Валенсы і Прымаса Польшчы Юзафа Глемпа.

Пасля заканчэння літургіі працэсія накіравалася ў падзямелле, каб паставіць урну ў каралеўскай крыпце, але ўжо ў Варшаве.

Прэзідэнт і Прымас падпісваюць гістарычны дакумент, у якім сведчаць: “У каралеўскай крыпце архікафедральнай базылікі св. Яна Хрысціцеля змяшчаем урну з яго прахам на вечны пакой у прысутнасці Міністра культуры і мастацтва, сябраў камісіі, якая мела дачыненне да трэцяга пахавання ў прысутнасці духавенства і ўсіх грамадзян, у каралеўскім замку сабраных і на заўпакойнай

літургіі ў архікатэдральнай базыліцы прысутных з вышыні нашых пасад уласнаю рукою сведчым.”

Падпісана: Лех Валенса Прэзідэнт Рэчы Паспалітай Польскай, і кардынал Юзаф Глемп Прымас Польшчы.

Разам з урнай і дакументам у саркафаг змяшчаюцца астанкі апошняга польскага караля Станіслава Антонія Аўгуста, знойдзеныя ў 1987 годзе гарадзенцамі і ў 1989 годзе – групай польскіх навукоўцаў. На гэтым закончылася драматычная, а можа, трагічная гісторыя вандровак пасля смерці апошняга польскага караля Станіслава Антонія Аўгуста Панятоўскага, з Божай ласкаю караля Польскага, Вялікага князя Літоўскага, Рускага, Прускага, Мазавецкага, Жамойцкага, Кіеўскага, Валынскага, Падольскага, Падляскага, Інфлянцкага, Смаленскага, Сіверскага і Чарнігаўскага.

Гэты тытул няхай яскрава і праўдзіва растлумачыць усім нашу і вашу гісторыю.

Вечная памяць, вечны пакой

АПОШНЯМУ ПОЛЬСКАМУ КАРАЛЮ!

## 15. ПАМЫЛКІ І СКАЖЭННІ

Тэма апошняга караля прыцягнула ўвагу гісторыкаў, даследчыкаў, публіцыстаў і краязнаўцаў у мінулым, прываблівае сення і, несумненна, стане запатрабаванай і ў будучым.

На жаль, многія даследчыкі дапускаюць памылкі і скажэнні, не клапоцячыся аб дакладнасці фактаў у сваіх публікацыях аб Станіславе Панятоўскім, Воўчыне, тым самым уводзяць ў зман чытачоў.

Вось па гэтаму вырашыў павесці размову аб памылках і скажэннях, вылучыўшы свае назіранні ў асобную частку.

Пачнем з хрышчэння будачага Караля. Алесь Краўцэвіч (“Апошні прытулак апошняга караля Рэчы Паспалітай”, ст. 88. “Спадчына № 6, 1994) піша: “Новы ўладальнік у 1729 г. фундаваў мураваны касцел св. Тройцы замест драўлянага з 1639 г. відавочна, у гэтым касцеле і быў ахрышчаны будучы кароль, які нарадзіўся ў 1733 г. Алесь Соніч: (“…і Вялікае княства ў прыдачу.”, стр.38, “Беларуская мінуўшчына” № 6, 1997) гаворыць: “Падскарбій ў 1729 г. пабудаваў у Воўчыне мураваны касцел св. Тройцы. Не выключана, што менавіта ў гэтым храме і быў ахрышчаны будучы манарх Рэчы Паспалітай.”

Аўтары памыляюцца ў дацціроўцы пабудовы касцела св. Тройцы. Ен пабудаваны не ў 1729г. (у гэтым годзе толькі пачата будаўніцтва). У асноўным закончана ў 1733г., а канчаткова завершана ў 1743г. і тады ж асвячаны ў імя св. Тройцы, Наведзення Найсвяцейшай Марыі Панны (Благавешчання Прасвятой Багародзіцы) і св. Станіслава, біскупа. Сцвярджэнне Алеся Краўцэвіча, што Станіслаў Аўгуст нарадзіўся ў 1733г. недарэчнае. Ен нарадзіўся 17 студзеня 1732 года. Меркаванне Соніча Алеся, што будучы кароль хрышчаны ў новым касцеле, застаецца толькі яго меркаваннем. Будучы кароль хрышчаны 17 студзеня 1732 г. дома, 16 лютага 1732 г. – у старым драўляным касцеле.

Той жа Алесь Соніч ("... І Вялікае княства ў прыдачу", стар. 38, " Беларуская мінуўшчына № 6, 1997) глыбокадумна заяўляе: "Такім чынам нарадзіўся і, вельмі верагодна, хрысціўся Станіслаў Аўгуст Панятоўскі на нашай зямлі."

Вось гэта "верагодна" ўносіць толькі няяснасць. Нараджэнне і хрышчэнне караля ў Воўчыне пацвярджаецца дакументальна і не выклікае сумнення.

Той, хто здзейсніў запіс у метрычную кнігу, у спешцы пераблытаў дадзеныя пры хрышчэнні імены і замест Станіслаў Аўгуст запісаў Станіслаў Антоні. Ен жа, вырашыўшы прыдобрыцца, назваў бацьку Станіслава Панятоўскага графам. Той графам ніколі не быў.

У альбоме аб храмах Камянецкага раена, перададзеным у Камянецкі райвыканкам благачынным а. Уладзімірам, сказана, што Воўчынскі касцел пабудаваў Станіслаў Аўгуст. На самой справе, гэта зрабіў бацька караля.

Святлана Адамовіч («Навіны Камянеччыны» 29.07.1993г.) брэсцкага арцыбіскупа (архіепіскапа) Уладыслава Суткоўскага няправільна называе архідыяканам, а воўчынскага ксяндза Антонія Чышэвіча – Антонам Чыжэвічам. Неканкрэктнае выказванне С.Адамовіча: «Ксёндз, прыхапіўшы касцёльныя дакументы, падаўся за мяжу».

Ен іх не прыхапіў (у сэнсе ўкраў?) а, як сумленны чалавек выканаў свой абавязак і збярог касцёльныя метрыкі, у тым ліку і метрыкі караля. І яны захаваліся да нашых дзён.

А.Соніч: «Цяжка сказаць, што бацькі хлопчыка былі палякамі.»

Чаму цяжка? У іх жылах цякла кроў польская і руская, і насамрэч былі палякамі.

А. Соніч: «З 15 ст. род Панятоўскіх меў адгалінаванне на Мсціслаўшчыне».

А што скажа спадар Соніч наконт таго, што прозвішча Панятоўскіх пайшло ад назвы вёскі Панятова на Любліншчыне, якая была ў іх уладанні?

А.Соніч: «Зыходзячы з прыведзеных фактаў, можна ўсё ж такі выказаць меркаванне, што наш Станіслаў Аўгуст Панятоўскі быў палякам, так бы мовіць, па грамадзянству». Калі гаварыць шырэй – па духу,па мове, па адукацыі, у пэўнай ступені – па выхаванні. Па паходжанні ж ен, відавочна, быў, як і яго не менш знакаміты сучаснік Тадэвуш Касцюшка, усе ж такі ліцвінам.» («Беларуская мінуўшчына» №6,1997г.).

Нашто гэты вэрхал! Шатландцы не кажуць, што Лермантаў «наш», абісінцы не крычаць, што Пушкін – гэта «наш». Пакіньма Панятоўскага і Касцюшку палякам.

А. Соніч («...і Вялікае княства ў прыдачу», «Беларуская мінуўшчына» №6,1997г.): «Жыцце свае ен скончыў 12 снежня 1798г.». А трохі ніжэй: « Памер Станіслаў Аўгуст 12 студзеня 1798г.».

І там жа: «9 ліпеня 1936г. на памежнай станцыі Стаўбцы збянтэжаныя польскія чыгуначнікі прынялі ад сваіх усходніх суседзяў дзіўны груз. Што рабіць з ім далей ніхто не ведаў».

Станіслаў Аўгуст Панятоўскі памер 12 лютага 1798г.

«Дзіўны груз» польскія чыгуначнікі атрымалі 9 ліпеня 1938г.

А наконт таго, што не ведалі, што рабіць з грузам: можа, не ведалі чыгуначнікі, а вярхоўныя ўлады (і савецкія, і польскія) добра ведалі.

У газеце «Зара» Л. Несцярчук, вядомы на Камянеччыне сумніўнымі брашурамі («Высокае» і «Археалагічныя, архітэктурныя каштоўнасці Камянецкага раена»), выказаўся, а Н. Гарагляд у «Навінах Камянеччыны» пераказала яго думку аб тым, што: «Панятоўскі каранаваўся ў Воўчыне.»

Ен каранаваўся і памазваўся ў Варшаве, у архікатэдральным касцеле св. Яна.

Нехта В.Міронаў, які працаваў у Воўчынскай школе выкладчыкам гісторыі, рабіў спробы пісаць аб Воўчыне, Высокім, але не занадта ўдала. Потым з'ехаў у Брэст. Дык вось ён, В.Міронаў, у адным са сваіх артыкулаў піша: "…Станіслаў Панятоўскі, князь." "…біскуп Война зацвердзіў (кансэкраваў) новы цагляны Воўчынскі касцёл".

Князем быў Юзаф Панятоўскі, маршал Францыі. Яго нашчадкі і цяпер жывуць у Францыі, а адзін з іх нават сенатар.

Біскуп Война не зацвердзіў, а асвяціў касцёл – кансэкраваў. Вышэйназваны артыкул быў змешчаны ў "Навінах Камянеччыны" 6.X.1990 г.

А.Краўцэвіч памыляецца, калі піша, што Воўчын упершыню ўпамінаецца ў XVI ст.("Спадчына"№6, 1994).

Воўчын упамінаецца ў 1468 г.

Вельмі няграматна складзены акт аб перадачы ключоў ад касцела і крыпты, аўтар якога старшыня Воўчынскага сельсавета С.Г.Сачкоў. Ён у невялічкім акце зрабіў 12 памылак, але не забыў сваю пасаду напісаць з вялікай літары. Наколькі ён быў "пісьменны", настолькі ён і яго пераемнікі былі "гаспадарамі". Гэта бачна па сучасным стане касцёла.

В.Міронаў (у "Навінах Камянеччыны", 6.X.1990) піша: "…кармазінавым дамаскам."

Не дамаскам, а адамашкам (узорчаты шоўк). Бываюць толькі дамаскія шаблі.

В.Міронаў у той жа газеце "Зара" піша, што 17 ліпеня 1937 г. прывезлі труну апошняга караля ноччу. (Газета "Зара".).

Труну караля прывезлі ў Воўчын у ноч з 15 на 16 ліпеня 1938 г.

Не абышла сваёй увагай воўчынскія падзеі і Валянціна Казловіч (16–22.11.2000г.). Гэта тая самая Казловіч, якая ў артыкуле "Царская ахота" абвініла апошняга расійскага цара Мікалая 11, што з-за яго памер генерал Троцкі, які быў упраўляючым "Белавежскай пушчы" ў пачатку XIX ст. Аказалася, што расійскі цар тут ні пры чым, а сярод упраўляючых пушчай Троцкага ўвогуле не было. Але затое выбух адбыўся, і начальства запрыкмеціла.

Вось і да Воўчына дабраліся.

Яна піша: "…росквіт мястэчка пачаўся ў 1720 годзе, калі ім валодалі Казімір і яго жонка Ізабэла, калі яны пабудавалі шыкоўную рэзідэнцыю".

Росквіт пачаўся пры Станіславе Панятоўскім – бацьку, а рэзідэнцыю пабудаваў Міхал Чартарыскі.

Далей Казловіч піша: «Знаўцы архітэктуры сцвярджаюць, што будаваў касцел італьянец.»

Не трэба быць архітэктарам, каб ведаць, хто кіраваў работамі пабудовы касцела. Спачатку – Вінцэнты Рахэці, потым – Якуб Фантана.

В. Казловіч: «Касцел у 1866г. быў пераасвячаны ў праваслаўную царкву». Гэта адбылося ў 1876г. Казловіч: «Сваю велічнасць храм страціў у гады другой

сусветнай вайны, калі быў моцна пашкоджаны. Аднак на архіўных здымках 70-х гадоў XXст. касцел быў яшчэ велічны, з купалам».

У гады другой сусветнай вайны касцел не быў пашкоджаны. Ен быў знішчаны пасля вайны. Спробы зваліць віну на вайну былі, напрыклад, і адносна Высокаўскага касцела (таксама св. Тройцы). Вайна ў гэтых выпадках ні пры чым. Віна ў нас саміх. Аб гэтым скажу ў эпілогу. На якіх такіх фотаздымках Казловіч убачыла велічнасць касцела? Дах быў знішчаны часткова ў пачатку 70-х г. XX ст., а ў 1976г. абрынуўся поўнасцю. На фотаздымку А.Мілінкевіча 1979 г. бачым, што даху ўжо няма.

В. Казловіч: « З моманту ўсеагульнага ператварэння атэістаў у веруючых лес касцела не перамяніўся ў лепшы бок...»

Дзе гэта Казловіч бачыла ператварэнне атэістаў у веруючых? Ніхто іх не заганяе да веравання. Веруючы чалавек адрозніваецца ад атэіста тым, што першы дзейсна з’яўляцца веруючым і звонку, і ў душы, а атэіст з'яўляецца веруючым (як бы) звонку, а ў душы застаецца атэістам.

В. Казловіч: «Воўчын не адзінае месца ў Камянецкім раене, дзе быў касцел з пахаваннямі... У весцы Новая Расна... у касцеле, пабудовы 18 ст., былі пахаванні роду Грабоўскіх».

Раснянскі “касцел” не быў касцелам, пабудаваным у 1744 г. Ежым Матушэвічам. Ен быў кальвінскім зборам. Воўчынскі касцел і раснянскі збор не да параўнання. У зборы былі пахаванні не толькі Грабоўскіх. Раснянскі збор таксама нішчэе, нягледзячы на тое, што Каардынацыйны Савет па захаванні культурнай і гістарычнай спадчыны ўзначальвае У.Бядуля. Гэты збор якраз стаіць на тэрыторыі гаспадаркі, дзе ен старшыня.

Многія лічаць, што ордэн Станіслава ўведзены ў гонар Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Гэта не так. 7.05.1765 г. Станіслаў Панятоўскі ўвеў ордэн св. Станіслава. Названы ен у гонар кракаўскага біскупа, які жыў у XI ст. і адлучыў польскага караля Баляслава II ад касцела. У 1079 г. Баляслаў II падчас богаслужэння закалоў біскупа. У 1253 г. біскуп Станіслаў быў кананізаваны і прызнаны заступнікам Польшчы.

Ордэн меў адну ступень. На авальны медальён быў наложаны чырвоны крыж з белымі арламі паміж праменняў і фігурай святога ў цэнтры. Стужка чырвоная з белымі краямі. Зорка ордэна васьміканечнай формы. У цэнтры яе размешчаны лацінскія літары S ( Станіслаў ), A (Аўгуст), R (кароль). Навокал іх надпіс на латыні – Praeminando incitat ( “узнагароджваючы – заахвочвае” ).Гэта дэвіз ордэна. Зорка з серабра.

Кавалер ордэна ўносіў 25 чырвонцаў на ўтрыманне дзіцячай лякарні Ісуса ў Варшаве, а таксама кожны год уносіў 4 дукаты на гэтыя ж мэты.

Ордэн Станіслава ўвайшоў пасля 1795г. у капітулу расійскіх ордэнаў.

Менш за ўсіх зрабіў памылак А. Мілінкевіч.(Воўчынская гісторыя).

Назваў намесніка Брэсцкага аблвыканкама Уладзіміра Гетманчука Гетмашчуком. Не падправіў сведку тых часоў А.Д. Юрчыка ў тым, што труну Станіслава Аўгуста прывезлі ў Воўчын не ў чэрвені 1938г., а ў ліпені.

Вялікі прыхільнік рэстаўрацыі касцела прафесар кафедры фізікі Брэсцкага політэхнічнага універсітэта Анатоль Гладышчук у сваім артыкуле ў “Вечернем Бресте” 2004г. “Кароль з Воўчына” таксама не ўтрымаўся ад памылак.

Імя воўчынскага ксяндза не Чыжэвіч, а Чышэвіч.

“Касцел пабудаваў Міхал Чартарыскі”. Не, касцёл пабудавалі Станіслаў Панятоўскі (бацька) і Міхал Чартарыскі. Аб тым, што будучага караля хрысцілі ў старым касцеле, я пісаў яшчэ ў 1998 годзе.

Воўчын упершыню ўпамінаецца не ў 1528г. а ў 1468 годзе.

Князь Юзаф Панятоўскі, маршал Францыі, быў пляменнікам Станіслава Аўгуста. Нарадзіўся ў Вене ў 1863г. Яму скульптарам Торвальдсенам быў зроблены помнік па хадайніцтву А. Чартарыскага, С.Макраноўскага, А.Ліноўскага і інш.(з дазволу Аляксандра І). Помнік спачатку хацелі паставіць у Варшаве,але затым схавалі ў крэпасці Модлін. Мікалай І у 1840 г. падараваў яго намесніку Польшчы графу І. Паскевічу. Той паставіў помнік у Гомелі. Меркавалі, што гэта падарунак у гонар апошняга польскага караля. А на самой справе – гэта помнік Юзафу Панятоўскаму.

## 16. ЭПІЛОГ

Цікава, што не гісторыкі, не літаратары і паэты прынялі блізка да сэрца падзеі вакол астанкаў апошняга караля і разбурэнне рэдкага ў гістарычным і архітэктурным плане касцела ў Воўчыне, у якім стаяла труна Станіслава Аўгуста. За гэта ўзяліся фізікі Гарадзенскага універсітэта Аляксандр Мілінкевіч з сынам і сябрамі, зрабілі даследаванні пахавання караля ў Воўчыне. Свае паслугі па рэстаўрацыі касцела прапанавалі выкладчыкі Брэсцкага політэхнічнага універсітэта: прафесар кафедры фізікі Анатоль Гладышчук, дацэнт Сяргей Басаў, ураджэнец Воўчына, прафесар кафедры архітэктурнага праектавання Аляксандр Кудзіненка, прафесар кафедры будаўнічых канструкцый Уладзімір Уласенка.

А што наша інтэлігенцыя Камянеччыны? Нічога. І справа не толькі ў тым, што многа гаворыцца і пішацца аб Воўчынскім касцеле. Не толькі ў ім справа, хаця ен вылучаецца асабняком. Справа ў тым, што колькі ж разбурана сядзібаў, цэркваў, касцелаў, сінагог, памятных гістарычных месцаў, могільнікаў, вуліц. Узяць хаця б Камянец. Разбураны земская лякарня, “Дом людовы” па распараджэнню былога загадчыка аддзела асветы В. Дымара.

У разбурэнні ўсей гэтай гістарычнай спадчыны вінаватыя ўсе мы – і ўладу трымаючыя, і звычайныя людзі. Першыя ў тым, што не распарадзіліся сваей уладай, другія, што пакорна маўчалі.

Калі ксендз Чышэвіч з 1938 па 1945 г. захоўваў астанкі апошняга караля і касцел, то цэлы шэраг старшыняў Воўчынскага сельсавета, пачынаючы з С. Сачкова, які атрымаў ключы ад касцела і ад крыпты, як і яго пераемнікі, абыякава глядзелі, як расцягваюць пахаванне, як разбураецца выключны па сваей гістарычнай і архітэктурнай годнасці будынак касцела.

Хтосьці распарадзіўся зрабіць у касцеле склад хімугнаенняў, ядахімікатаў. А гэта ж злачынства. Адказнасць за злачынства павінна быць няўхільнай. А пакаянне не прынесена. А людзі сяла маюць чыстае сумленне ? Хтосьці з іх

забіраў бляху з даха, дошкі, цэглу з агароджы, хтосьці бачыў, як цягнуць. Маўчаць, хаця б адзін пакаяўся.

Некаторыя стогнуць – забралі, маўляў, рэшткі караля і адвезлі ў Варшаву, а нам нічога не пакінулі. Апошні кароль нарадзіўся і хрысціўся на нашай зямлі, яго пахаванне таксама было на нашай зямлі, што ж пакідаць,калі крыпта раскрадзена, касцел разбураны? Вось і ў 2000г. В. Казловіч піша ў "Брэсцкім кур'еры", што хлопчыкі зрабілі падкоп пад сцяною, а мясцовыя аматары выпіць, седзячы на ўпаўшай скульптуры евангеліста, распіваюць спіртное.

Аляксандр Мілінкевіч у сваей кнізе " Воўчынская гісторыя" аптымістычна – ўпэўнена заўважае: "Безумоўна, Воўчынскі касцел св. Тройцы ў лепшыя часы будзе адноўлены – гэта ўнікальны помнік позняга барока.

Як прылівы ў моры нясуць воды да берага, так і адлівы гоняць яе ад берага. Падобнае адбываецца з касцелам. Не раз уздымалі тэму рэстаўрацыі яго і хутка забывалі. Размоў, абяцанак многа, а справы няма, як у расійскай прымаўцы: "А воз и ныне там".

Цікава, што яшчэ ў канцы XIX ст. польская грамадскасць звярнулася да Расійскага ўраду з просьбай абнавіць палацава-паркавы комплекс у Воўчыне. Але ім не пайшлі насустрач.

У мінулыя часы адмаўлялі ў рэстаўрацыі, у наш час кормяць абяцанкамі.

У1988 г., калі польская дэлегацыя забірала рэшткі Станіслава Аўгуста, яна сустрэлася з намеснікам прэм'ер-міністра БССР Нінай Мазай. Яе праінфармавалі аб планах на будучае. Яна сказала, што беларускі бок падтрымлівае поўнае аднаўленне, якое прапанаваў дырэктар Польскага прадпрыемства рэстаўрацыі помнікаў Тадэвуш Поляк.

Згодна планаў, гэтым павінен заняцца фонд польскай культуры.Тэхнічную дакументацыю трэба было падрыхтаваць да канца 1989г. С.Адамовіч з беларускага боку таксама штосьці збірала. Вясной 1990г. павінны былі пачацца рэстаўрацыйна-будаўнічыя работы. Крыпта, згодна плана, павінна стаць музейнай часткай храма. На касцеле трэба ўстанавіць мемарыяльную дошку, прысвечаную Станіславу Аўгусту. Ніна Мазай тады сказала, што беларускі бок акажа дапамогу ў рэстаўрацыі.

Нічога не зроблена па гэтых планах. Абяцанкі так і не знайшлі свайго ўвасаблення, таму што Ніна Мазай, як цынічна цяпер гавораць, "на заслуженном отдыхе".

Падобна воўчынскай справе, не здзейсніліся ў поўнай меры планы адносна палацава-паркавых комплексаў у Грамячы і Высокім, адносна ўстаноўкі памятных знакаў у Камянцы, Капылоўскай сядзібы, Малаельненскай капліцы і інш.

Але апошнім часам інтарэс да Воўчына не згасае, а, наадварот, узмацняецца. Сталі пісаць у штодзенным друку. Так з'явіліся публікацыі аб Воўчыне ў "Камсамольскай праўдзе" ("Прах последнего короля Речи Посполитой ищут в Беларуси"), у "Навінах Камянеччыны" ("Воўчынскі касцел сення. А заўтра?" – Г.Новік), "Брэсцкім кур'еры" ("Кароль з Воўчына" – А.Гладышчук), ("Забыты Воўчын"- В.Казловіч) і інш.

Вялікую ўвагу аддаў Воўчыну ў сваей кнізе "Старинные усадьбы Берестейщины" (Минск, 2004) наш зямляк А. Т. Федарук.

На пачатку 2004 года позіркі некаторых людзей ізноў накіраваліся на Воўчын. У апошнюю суботу лютага сабралася прадстаўнічая канферэнцыя, прысвечаная ўзнаўленню касцела, яго рэканструкцыі. У канферэнцыі прынялі ўдзел спецыялісты па рэканструкцыі і будаўніцтву з Брэсцкага політэхнічнага універсітэта, ад Міністэрства культуры Беларусі-Ігар Чарняўскі, ад абласнога ўпраўлення культуры – Рыгор Бысюк, дырэктар «Белінфармрэканструкцыі» (Мінск) – Уладзімір Старасцін, саветнік па справах культуры Генконсульства Рэспублікі Польшчы ў Брэсце Аліна Чарняўская, ксендз, біскуп Уладзімеж Велікаселец (Брэст), пробашч воўчынскага прыходу ксендз Ян Васілеўскі, намеснік старшыні Камянецкага райвыканкама Мікалай Войцык і іншыя. Мэта канферэнцыі – абмеркаванне пытанняў, звязаных з мерапрыемствамі па рэстаўрацыі архітэктурнай і гістарычнай каштоўнасці XVIII ст. – Свята – Троіцкага касцела, і перш за ўсе – праблемы фінансавання. Размова ішла сур’езная, аднак усе ўпіраліся ў пытанне: дзе ўзяць грошы?

Уладзімір Старасцін, кіраўнік праекта рэканструкцыі з 1999г., сказаў, што для завяршэння праектных работ трэба яшчэ 35-40 мільенаў рублеў.

Для выканання ўсіх прац патрэбна больш за 2 мільярды рублеў. А дзе іх узяць? Узнікла ідэя стварыць для рэканструкцыі і ўзнаўлення гэтага гістарычнага помніка Фонд. Усе прысутныя падтрымалі гэту ідэю. Была створана ініцыятыўная група, якую ўзначаліла супрацоўніца Генконсульства РП у Брэсце Святлана Рамановіч, ей даручана падрыхтоўка дакументаў для рэгістрацыі Фонду. Гэта ўжо хоць маленькі, але крок наперад. Ці адбудуцца наступныя – пакажа час.

Пасля пахавання ў Воўчыне Станіслава Аўгуста сталі з'яўляцца вакол яго імені легенды. Спачатку нясмела, а затым усе смялей і смялей. Некаторыя з іх ператварыліся ў міфы. Людзі, якія сення выступаюць у ролі сведкаў, чым далей ад 1988-89гг., здольныя фантазіраваць неабмежавана. Іншы раз яны апавядаюць нават такое, чаго ўвогуле не было. Пагэтаму да іх аповедаў трэба падыходзіць асцярожна.

З моманту пахавання апошняга караля ў Воўчыне і з моманту даследвання сталі з'яўляцца розныя версіі аб Станіславе Аўгусце. Першая версія. Яго косці і чэрап струхлелі яшчэ ў Пецярбургу. У Воўчын прывезлі толькі шаты. Другая версія. Яго рэшткі ў 1945г. выкінулі памежнікі. Версія трэцяя. Яго прах выкінуў нейкі праціўнік караля. Версія чацвертая. Перад тым, як пачалі вывозіць палякаў у Сібір і Казахстан, хтосьці з прыхільнікаў караля перазахаваў яго непадалек ад касцела. А таго чалавека вывезлі ў Казахстан. Гэтую версію распрацоўвалі журналісты з польскай газеты «Вечур Выбжэжа» з Гданьска. Яны прыязджалі ў Камянец, я размаўляў з імі. Яны хацелі звярнуцца ў КГБ, каб даведацца каго з Воўчына вывезлі ў Казахстан. Версія пятая. Прыхільнікі Панятоўскага яго прах перазахавалі побач з маці.

З снежня 2004г. на старонках «Камсамольскай праўды» свае версіі вылажыла супрацоўніца інстытута гісторыі і археалогіі Польскай акадэміі навук Святлана Рамановіч. Версія першая. Дзіўная. Жыхар Воўчына І. Дораш успамінае: «Вясной, калі я заканчваў у 1949г. восьмы клас Воўчынскай школы, мне ўпершыню давялося папасці ў касцел. Дзверы ў каралеўскую крыпту былі тады адчынены. Труна стаяла ў той час не ў падвале, а на падлозе. Я ўбачыў некалькі касцей і

чэрап. Уражанне было такое, што косці былі брудныя, а чэрап у гліне. “Гэта ж астаткі муміфіцыраваных тканін!” – упэўнена тлумачыць антраполаг па адукацыі Святлана Рамановіч. Версія другая. Вандальная. Жыхары Воўчына ўспамінаюць, што каралеўскае захаванне было цалкам даступнае. Той жа І.Дораш гаворыць: “Якось у кветні 1945 г. бацька ранкам паслаў мяне за лазой. Іду я каля касцела, бачу: дзверы адкрыты. Зайшоў, гляджу, чалавекі тры-чатыры нашых сялянскіх круцяцца ў склепе. Было яшчэ цемнавата, пагэтаму ўсе, што было ў труне, выносілі паглядзець у касцельную залу. Вынеслі плашч, багаты такі, з арламі, потым крыж залаты, да якога валасы прыклеіліся, яшчэ штосьці. Дакладна памятаю адно: да моманту, калі ў касцеле дах абрынуўся, там ужо нічога цэннага не было. Нават вялікай цынкавай труны. Труна ў 70-х гадах XX ст. валялася за будынкам (плебанія) калгаснага ўпраўлення. Версія трэцяя. Загадкавая. Успамінае кардынал Свентэк: “Прыкладна ў 1954 чы 1955 г. прыйшоў ананімны ліст, у якім аўтар паведамляў, што ен тайна сабраў астанкі апошняга польскага караля і перазахаваў іх, а месца гатовы паказаць. Аднак тады гэта было настолькі неверагодным, што мы выходзіць на кантакт не сталі. А сам ліст дзесьці загубіўся.”

У размовах мясцовыя жыхары таксама да гэтай версіі схіляюцца. І нават называюць чалавека – Антон Пратасюк, які ў 30-х гадах XX ст. працаваў вартаўніком у польскай гміне і ўказваюць арыенцір “500 м. на поўнач ад касцела”. Усе сходзяцца ў адным: Воўчынскія могілкі - тое самае месца мажлівага апошняга пахавання Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Важна проста ведаць, што прах апошняга караля Рэчы Паспалітай Польскай упакоіўся па-хрысціянску. Версіі версіямі, але кароль пахаваны ў Варшаве.

Вось і скончыўся аповед аб апошнім польскім каралю.Сумная гэта гісторыя, але і павучальная (не толькі павучальная для палякаў – для ўсіх). Колькі пакутаваў кароль пры жыцці, столькі яго душа – пасля смерці. Нават прах пакутаваў. Усе ж такі прах яго супакоіўся ў Варшаве, у месцы яго каранавання. Польшча яму даравала.

Быў час, калі Расія падзяліла Польшчу, а яе кароль адрокся ад прастола. Наступіў час, калі апошні расійскі імператар таксама адрокся ад прастола пад ціскам д’ябалскіх сіл. Гэтыя д’ябалскія сілы са свайго ж народа забілі апошняга рускага імператара Мікалая II. Прыйшоў іншы час, і яму даравалі, але ці ўсе? Ен кананізаваны. 30 ліпеня 2005 г.я прысутнічаў пры хрышчэнні ў Свята - Мікалаеўскай царкве ў Воўчыне свайго праўнука. Пасля таінства Святога хрышчэння назвалі яго Лаўрам. Цяпер ен называецца Лаўр Алегавіч Захарэвіч. І я не хаваю гонару ад усведамлення таго, што ў ім цячэ маленькі струменьчык крыві роду Лявіцкіх – майго роду.

Не забыўся паглядзець на калісьці знакаміты касцел, які цяпер палохае ўсіх сваімі руінамі. Нічога не змянілася. Ці штосьці змянілася?

А дух апошняга караля вітае над воўчынскімі палеткамі, лугамі і лясамі, прыносіць новыя версіі, якія становяцца легендамі.

Напісана ў Камянцы, які
заснаваў Валынскі князь
Уладзімір-Іаан Васількавіч,
і Благачэсцівы, лета Божага 1276.
Першы варыянт напісаны ў 1998 г.
Другі варыянт перароблены і дапоўнены
ў чэрвені-ліпені 2005 г.

Георгій Мусевіч

KAMUNIKAT.org

# 17. ІЛЮСТРАЦЫІ



План в. Воўчын і палацава-паркавага комплексу кн. Чартарыскага.



Касцел св. Троіцы ў в. Воўчын.
Фота Т.Каменябродскага.



Касцел св. Троіцы ў в. Воўчын. Від на галоўны алтар, 1939 г.
Фота Хенэберга.



Касцел св. Кацярыны ў Пецярбургу, дзе быў установлены гроб Станіслава Аўгуста Панятоўскага у 1798 г.



Касцел св. Троіцы ў Воўчыне, куды быў перавезены гроб з целам Станіслава Аўгуста Панятоўскага.



Касцел св. Яна ў Варшаве, дзе каранаваўся Станіслаў Аўгуст Панятоўскі у 1764 г. і дзе пахаваны рэшткі караля ў 1995 г.



Палацавая аранжэрэя ў Радзыне Падляскім.
Фота З. Дадос.



Уяздная брама палаца кн. Чартарыскага ў в. Воўчын, 1898 г.
Малюнак – І. Рышкевіча.



Кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі з тэатральнай маскай.
Мастак – Ян Хрысціцель Лампі.



Станіслаў Аўгуст у апошнія гады жыцця.
Мастак – Марчэла Бачарэлі.



Кацярына II на кані ў мундзіры гвардзіі.



Кацярына II.



Станіслаў Аўгуст Панятоўскі ў мундзіры корпусу кадэтаў.

Мастак – П.Крафт-старэйшы, 1757-68 г.



Каралеўскі герб “ЦЕЛЭК”



Воўчынскі касцёл св. Троіцы, 1979 г.
Фота А.Мілінкевіча.



Protokół

Dnia 14. [illegible] 38 r. o godz. [illegible] [illegible]

[illegible]

Na powyższym protokół zakończono i podpisano.

[illegible]

Пратакол прыняцця труны Станіслава Аўгуста ў касцёл св. Троіцы ў Воўчыне ў 1938 г.



Каралеўская труна. Воўчын, 1938 г.



Канстанцыя з Чартарыйскіх Панятоўская, Кракаўская каштэлянша, маці караля (п. 1759).



Станіслаў Панятоўскі, кракаўскі каштэлян, бацька караля (1676 – 1762).



Княжна Соф'я Фрыдэрыка Аўгуста Анхальт-Зэрбст, будучая імператрыца Кацярына ІІ (прыжыццёвы партрэт).



Стольнік Станіслаў Панятоўскі будучы кароль.



Станіслаў Аўгуст у капялюшы з пер'ямі.
Мастак – Марчэла Бачарэлі.



Партрэт Станіслава Аўгуста Панятоўскага.
Мастак – Ян Хрысціцель Лампі.



Партрэт Станіслава Аўгуста ў халаце.
Мастак – Ян Хрысціцель Лампі.

KAMUNIKAT.org



Акт.

1945 года 27 апреля мы нижеподписав-шиеся [illegible]

[illegible] 27 апреля с/г. [illegible]

[illegible]

Акт перадачы ключоў ад воўчынскага касцёла і ад нішы Станіслава Аўгуста ксяндзом А.Чышэвічам уладам сельсавета ў 1945 г.



PRYMAS POLSKI

Warszawa, 3.V.1979.

N. 1080/79/P.

Wielmożny Pan
Jerzy S. SITO
ul.Czeska 16
03-902 Warszawa

W związku z Jego listem z dnia 2 maja br. w sprawie sprowadzenia prochów Króla Stanisława Augusta Poniatowskiego do Polski, pragnę przekazać swoje stanowisko.

Wiedziałem od dawna, że kościół w Wołczynie, gdzie spoczywają doczesne szczątki ostatniego Króla polskiego chyli się ku upadkowi. Chociaż kościół ma charakter zabytkowy nie troszczono się o jego zachowanie. Powstała nawet inicjatywa w Polsce, by podjąć starania o remont kościoła na koszt społeczeństwa polskiego.

Toteż inicjatywa Pana zgłoszona na posiedzeniu Prezydium Zarządu Głównego Związku Literatów Polskich dn. 6.IV.br. odpowiada wyczuwanym postulatom społeczeństwa polskiego. Szczególnie Warszawa, która tak wiele zawdzięcza Królowi Stanisławowi żywo interesuje się losami doczesnych szczątków nieszczęsnego Króla.

Projekt, aby miejscem ostatniego spoczynku Króla była krypta Katedry Świętego Jana w Warszawie odpowiada wielokrotnie wypowiadanej już opinii społeczeństwa stołecznego. Sam podzielam to stanowisko i nieraz już wypowiadałem się, że chętnie przyjmę zwłoki Króla Stanisława do podziemi Katedry. Jakkolwiek w tej chwili nie mam możności porozumieć się z Prześwietną Kapitułą Archikatedralną to jednak wiem z prywatnych rozmów, że członkowie tej Kapituły podzielają to zdanie.
Oczywiście przeprowadzenie tego zamiaru, by zwłoki Króla nareszcie spoczęły w Stolicy wymaga zorganizowania opinii publicznej, zestawienia argumentów przemawiających za tym projektem i odpowiednich działań ze strony kompetentnych Władz państwowych i Urzędu Konserwatorskiego.

Pragnę zapewnić Inicjatorów, że zarówno ja, jak i Władze kościelne uczynią wszystko co leży w ich mocy, aby ten wielkoduszny akt narodowy był urzeczywistniony w duchu pełnego szacunku dla zmarłego Króla i w duchu społecznego pokoju.

O powyższej opinii raczy Pan poinformować zebranie plenarne Zarządu Głównego Związku Literatów Polskich.

Dodaję, że projekt pochowania zwłok Króla w Łazienkach nie jest na poziomie doniosłości sprawy.

Wyrazy należnego szacunku przesyła
+ Stefan Kard. Wyszyński
+ Stefan Kardynał Wyszyński

Ліст прымаса ксяндза кардынала Стэфана Вышыньскага да Ежы С.Сіта ў справе вяртання прахаў Станіслава Аўгуста ў Польшчу, май 1979 г.



Падпісанне А.Гейштарам і І.Загрышчавым акта перадачы рэшткаў пахавання караля, знойдзеных гродзенскімі даследчыкамі, Мінск, 13.12.1988 г.

А К Т

передачи представителям Польской Народной Республики остатков захоронения короля Станислава Августа Понятовского в д.Вольчин Брестской области Белорусской ССР

13 декабря 1988 г.
г.Минск

Настоящим документом зафиксирована передача Польской стороне остатков отдельных предметов (фрагменты различных тканей, деревянные ножки от гроба – 2 и фрагменты т.д.), обнаруженных при вскрытии места захоронения короля Станислава Августа ПОНЯТОВСКОГО в д.Вольчин Брестской области Белорусской ССР.

Указанные остатки обнаружены при археологическом исследовании, которое проводилось доктором исторических наук, профессором Гродненского университета ТКАЧЕВЫМ Михаилом Александровичем, кандидатом физико-математических наук Гродненского университета МЕЛЕШКОВИЧЕМ Александром Владимировичем, художником-реставратором Республиканского музея истории религии и атеизма КИСЕЛЕМ Владимиром Никодимовичем и школьником Малинковичем Александром Александровичем. Кроме предъявленных материалов никаких костных останков в захоронении обнаружено не было.

По заключению доктора исторических наук Института истории АН БССР ЛЫСЕНКО П.Ф. и кандидата исторических наук Института истории АН БССР ВОЙНО П.О., которые занимались вопросами датировки и атрибутики обнаруженных остатков захоронения, предъявленные Польской стороне материалы могут быть связаны с местом захоронения короля Станислава Августа ПОНЯТОВСКОГО.

Для более точного и полного заключения необходимы дополнительные исследования и полная экспертиза обнаруженных предметов.

Передача осуществлена по просьбе Польской Народной Республики и согласия руководства Белорусской ССР в присутствии членов Комиссии по делу праха короля Станислава Августа ПОНЯТОВСКОГО, созданной Министром Культуры и Искусства ПНР тов.Александром КРАВЧУКОМ, представителей Министерства Культуры БССР.

Директор
Государственного музея БССР
И.Н.Загрышев

Профессор, доктор наук-историк, директор Варшавского Королевского Замка
А.Гейштор

Акт перадачы польскаму боку рэшткаў пахавання Станіслава Аўгуста Панятоўскага.



Станіслаў Аўгуст Панятоўскі ў Гродне, 1795 г. Роздум.
Мастак – Манюшка.



Станіслаў Аўгуст Панятоўскі ў Пецярбургу, 1797 г. Цяжкія думкі.
Мастак – Манюшка.



Варшаўскі замак. Партрэт Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Крэсла. Мастак – М. Бачарэлі.



Скіпетр, дзяржава, карона польскага караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага.



Антоній Тызенгауз, адзін з выхаванкаў Воўчынскай школы, рэфарматар.



Магіла Віталіса Шуйскага у в. Чыжэўшчына (б.Крупчыцы) у Жабінкоўскім раёне.

www.MUNIKAT.org



Воўчын, касцёл св. Троіцы, 1930-ыя гады.
Фота В.Суцяніна.



Воўчын. Царква св. Мікалая, 1938 г.



Станіслаў Панятоўскі, бацька. Гравюра Сысанга.



Міхаіл Клеафас Агіньскі.



Вінцэнт Гаеўскі адзін з уладароў Воўчына, 1862 г.
Малюнак – Палькоўскага.